КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 43 (219) ◂ 26 лістапада ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



## ТРЫВОЖНЫЯ ЧАКАННІ

Стар. 4

**ЛІБЕРАЛЬНА-КАСМЕТЫЧНЫ ПАЧАТАК**

Беларускія праваабаронцы праводзяць грамадзянскую кампанію «Праваабаронцы за свабодныя выбары»

Стар. 6

**ГАЛАСАВАННЕ ЯК АРГАЗМ**

Праз сем гадоў праўлення кіроўнай кааліцыі — tripartito — Каталонія знаходзіцца на пераломе. Да ўлады вяртаюцца правыя

Стар. 27

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10043

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**АД АРЛЕКІНА ДА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ**

Нарыс Андрэя Расінскага пра папулярнае беларускае кіно

▸ **АД ПЕРШАЙ АСОБЫ**

# Стэфан Эрыксан: У БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ ДОБРАЯ БУДУЧЫНЯ

**Пра шведска-беларускія адносіны, месца і ролю Беларусі ў еўрапейскай супольнасці з амбасадарам Швецыі ў Беларусі Стэфанам Эрыксанам размаўляў галоўны рэдактар «НЧ» Аляксей Кароль. Гутарка вялася цалкам на беларускай мове, без перакладчыка.**



***— Спадар Эрыксан, Вы — першы амбасадар Швецыі ў Беларусі. Ужо праз гэта Вы ўвайшлі ў гісторыю дыпламатыі Швецыі і ў найноўшую гісторыю Беларусі. Ці ўплывае ўсведамленне гэтага факта на Вашу дзейнасць?***

— У пэўным сэнсе, уплывае. Тут, так бы мовіць, супалі дзве рэчы. З аднаго боку, гэта мая першая пасада ў якасці амбасадара, а з іншага — я першы амбасадар Швецыі, які стала жыве ў Беларусі. Канечне ж, у Беларусі і раней былі шведскія амбасадары, аднак яны жылі і працавалі пераважна ў Маскве. У такіх новых для мяне акалічнасцях сапраўды хацелася б не толькі адпавядаць усім чаканням і спадзяванням, ускладзеным на мяне іншымі, але і рэалізаваць свае ўнутраныя рэсурсы, безумоўна, на карысць справе.

***— Ідэя адкрыцця ў Беларусі амбасады замест консульства ўпершыню была сфармулявана ў 2000 годзе. Прынамсі, мне поруч з Сямёнам Домашам, Андрэем Саннікавым, Жаннай Літвіной, Вінцуком Вячоркам выпала быць у складзе запрошанай шведскім міністэрствам замежных спраў дэлегацыі, з якой гэта пытанне не абмяркоўвала тагачасны міністр замежных спраў.***

— Я добра памятаю гэты візіт беларускай дэлегацыі. Я тады працаваў у міністэрстве і меў дачыненне да яго арганізацыі.

***— Пытанне аб адкрыцці амбасады ў Беларусі абмяркоўвалася ў тым ліку і ў сувязі з ініцыятывай Швецыі аб стварэнні рэгіянальнага саюза прыбалтыйскіх краін, да якога планавалася далучыць і Беларусь. Што азначае для Швецыі Беларусь у кантэксце яе геапалітыкі? І яе рэгіянальнай палітыкі?***

— Рэгіянальная палітыка Швецыі вынікае з бачання Паўночнай Еўропы як асобнага рэгіёна ў межах Еўрапейскага Саюза. Гэта ідэя зарадзілася недзе на пачатку 1990-х гадоў. Да таго мы нават і не ведалі добра, што адбывалася там, на іншым баку Балтыйскага мора, за жалезнай заслонай. Патрэбны быў час, каб асэнсаваць усё, што здарылася, і якія з гэтага могуць вынікаць наступствы. На маю думку, сёння мы назіраем самы пачатак развіцця Балтыйскага рэгіёна. І, падобна, у яго ёсць добрыя перспектывы, бо практычна ва ўсіх краінах Паўночнай Еўропы ў наш няпросты час склалася нядрэнная эканамічная сітуацыя.

Думаю, што пэўнай крыніцай натхнення для гэтай ідэі таксама паслужыла гісторыя. Ясна, што гаворка ідзе тут не пра магчымасць аднаўлення Ганзейскага саюза. Аднак тыя традыцыі шчыльнага супрацоўніцтва краін Балтыйскага рэгіёна, што існавалі ў пэўныя гістарычныя перыяды, варта было б адрадзіць на сучаснай аснове. Таму цалкам зразумела, што для Швецыі гэты рэгіён сёння з'яўляецца адным з галоўных прыярытэтаў. І паўнапраўнай часткай гэтага рэгіёна Швецыя хацела б бачыць таксама Беларусь, хоць ваша краіна і не мае выхаду да Балтыйскага мора. Але гістарычна, геаграфічна, культурна Беларусь, безумоўна, з'яўляецца яго часткай. І што вельмі важна і ўнікальна, Беларусь, дзякуючы яе геаграфічнаму становішчу, з поўным правам можна таксама аднесці і да іншых рэгіёнаў: цэнтральнага і ўсходняга. Такім чынам, мяркую, што пэўныя крокі да таго, каб Беларусь стала часткай паўночнай рэгіянальнай супольнасці, за гэтыя 10 гадоў былі зроблены.

***— Ці можна канстатаваць, што саюз прыбалтыйскіх краін склаўся?***

— Так, такі саюз насамрэч існуе, ён мае назву Саюза краін Балтыйскага мора. Але гэта толькі адна са структур, дзе абмяркоўваецца супрацоўніцтва ў гэтым рэгіёне. Аднак, я мяркую, самае галоўнае — існуе ўсведамленне таго, што між намі ёсць шмат агульнага, што мы ўсе можам атрымліваць карысць ад такіх стасункаў. У параўнанні з тым, што было 20 гадоў таму і ёсць сёння — прарыў, дынаміка развіцця балтыйскага рэгіянальнага супрацоўніцтва выглядаюць унушальна. Наглядны таму прыклад — паромы, якія раней са Швецыі ішлі толькі на Фінляндыю, а зараз кожны дзень ідуць і на Талін, і на Рыгу. А гэта ж сувязь паміж людзьмі. Сфармаваліся таксама разгалінаваныя эканамічныя і культурныя сувязі, усталявалася супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі.

***— Наколькі Беларусь ужо прысутнічае ў гэтых сувязях?***

— Беларусь на сёння знаходзіцца ад Швецыі трошкі далей, чым краіны, якія маюць непасрэдны выхад да Балтыйскага мора. Аднак, як я ўжо падкрэсліваў вышэй, з многіх прычын ваша краіна выступае часткай гэтага рэгіёну. Беларусь ужо прысутнічае ў якасці назіральніка ў пэўных структурах Саюза краін Балтыйскага мора. Але гэта толькі адна з формаў супрацоўніцтва, бо шмат што адбываецца ўнутры Еўрапейскага Саюза. Тут можна весці гаворку і пра праграму «Усходняга партнёрства», і пра новую стратэгію ЕС па рэгіёне Балтыйскага мора.

***— Які зараз аб'ём эканамічных сувязяў Швецыі з Беларуссю?***

— Наш экспарт у Беларусь складае прыкладна 110 мільёнаў еўра ў год, імпарт вагаецца ў межах 50–80 мільёнаў еўра. Гэта не шмат, але ў параўнанні з сітуацыяй дзесяцігадовай даўніны прагрэс відавочны. У параўнанні з тавараабаротам з краінамі Балтыі Беларусь, канешне, адстае. Аднак патэнцыял для развіцця гандлёвых сувязяў у нас значны.

***— Зразумела, што амбасадар ёсць праваднік палітыкі сваёй дзяржавы ў краіне знаходжання. А які зваротны ўплыў Вашай інфармацыі, меркаванняў на выпрацоўку гэтай палітыкі?***

— Спадзяюся, што мае меркаванні адыграюць пэўную ролю. Як вы ведаеце, я ўжо далёка не першы год у Беларусі і маю даволі багаты досвед. Таму можна сказаць, што да мяне прыслухоўваюцца. Але ёсць такое паняцце ў дыпламатычнай практыцы, калі гавораць, што дыпламат можа стаць у нейкім сэнсе «мясцовым» і інфармацыя ад яго ўспрымаецца з пэўнай насцярогай. Таму стараюся заставацца па магчымасці аб'ектыўным і не даваць падстаў для такіх меркаванняў.

Працяг на стар. 5 ▸

▸ АКЦЫЯ

# РЭПЕТЫЦЫЯ

Вольга ХВОІН

*Дыялог выпадковых сведак вулічнай акцыі 24 лістапада 2010 года:*
*— Выйшлі, крычаць, а што яны там крычаць?*
*— Хіба кепска, што людзі выйшлі на вуліцу са сваімі думкамі?*
*— Што выйшлі — не кепска. Але што крычаць, чаго хочуць — не зразумела.*

**24 лістапада адбылася вулічная акцыя, якую многія ахрысцілі «рэпетыцыяй плошчы», то бок падзей, што мусяць развярнуцца ў сталіцы 19 снежня пасля закрыцця выбарчых участкаў.**




Акцыю анансавалі і як пратэст супраць удзелу Аляксандра Лукашэнкі ў чарговых прэзідэнцкіх выбарах, прымеркавалі яе да канстытуцыйнага рэферэндуму 1996 года, назвалі сустрэчай з кандыдатамі. Апошнюю нагоду ў сваіх тэлевыступах анансавалі кандыдаты Віталь Рымашэўскі і Мікола Статкевіч. У выніку на Кастрычніцкую плошчу Мінска прыйшлі прыблізна паўтары тысячы чалавек.

Рэпетыцыя плошчы ці паразы — пытанне з неадназначным адказам. З аднаго боку, на вуліцу выйшла больш людзей, чым можна было спрагназаваць, бо ўсё ж пратэстныя настроі ў грамадстве на нізкім узроўні. З іншага — пра акцыю апазіцыйных лідэраў было абвешчана па дзяржаўнаму тэлебачанню, аўдыторыя якога ў дзесяткі разоў большая за аўдыторыю нешматлікіх недзяржаўных СМІ. Атрымліваецца, ці то ідэі апазіцыі не цікавыя народу, ці апазіцыя не выклікае даверу, ці людзей задавальняе існуючы лад. Хаця апошнюю тэзу падчас гэтай акцыі разбурылі і яе удзельнікі, і выпадковыя мінакі. Бо незадаволеныя воклічы на адрас дзейнага кіраўніцтва дзяржавы і старшыні Цэнтрвыбаркаму чуліся праз крок.

Супрацоўнікі спецслужбаў прыйшлі на месца правядзення мітынгу задоўга да яго пачатку, але былі яны ў цывільным, збіралася людзям не перашкаджалі. Перад прысутнымі з кароткімі прамовамі выступілі кандыдаты ў прэзідэнты Беларусі Мікалай Статкевіч, Уладзімір Някляеў, Віталь Рымашэўскі, лідэр БХД Павел Севярынец. «Я прыйшоў сюды не для таго, каб агітаваць за сябе і казаць, які я моцны, які мужны і што буду стаяць да канца. Я прыйшоў сказаць, што я вас паважаю, што не мог сюды не прыйсці, ведаючы, што на гэтую плошчу прыйшлі людзі, якія аддалі за мяне свае подпісы, якія будуць за мяне галасаваць», — сказаў Уладзімір Някляеў.

Мікола Статкевіч пайшоў ва-банк і прапанаваў прыняць рэзалюцыю ды занесці яе Лідзіі Ярмошынай. Сутнасць рэзалюцыі ў тым, каб ЦВК уключыў у кожную ўчастковую камісію па прадстаўніку ад кожнага кандыдата ў прэзідэнты з правам подпісу выніковага пратаколу, каб было адменена датэрміновае галасаванне і дазволена толькі для тых, хто 19 снежня будзе па-за межамі Беларусі. Апроч таго было агучана патрабаванне лічыць бюлетэні публічна, прад'яўляючы кожны назіральнікам. Народ не вельмі арганізавана рушыў у бок плошчы Незалежнасці, дзе месціцца ЦВК. Па дарозе частка людзей разышлася па сваіх справах, у тым ліку і кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў.

Каля дому ўраду Статкевіч занёс рэзалюцыю да шыльды дзяржустановы і там яе пакінуў, а людзі пастаялі-памітынгавалі яшчэ колькі часу, і разышліся. З мірам.

▸ СМІ

# ЧАРГОВЫ МАНІТОРЫНГ

Генадзь КЕСНЕР

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» 23 лістапада прэзентавала другі бюлетэнь маніторынгу «Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў 2010 года ў беларускіх СМІ». Высінова, да якой прыйшла служба маніторынгу БАЖ, — практычна нічога ў параўнанні з мінулымі выбарамі ў сэнсе працы сродкаў масавай інфармацыі, асабліва дзяржаўных, не змянілася.**

Кіраўнік групы маніторынгу БАЖ Алесь Анціпенка прывёў яскравы прыклад: 19 лістапада на пачатку праграмы «Панарама» БТ першай навіной была не рэгістрацыя кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а правядзенне ў нашай краіне конкурсу дзіцячага Еўрабачання. «Тэме дзіцячага Еўрабачання на дзяржаўных тэлеканалах была прысвечана 1 гадзіна 12 хвілін эфірнага часу, а тэме прэзідэнцкіх выбараў — усяго 12 хвілін, гэта значыць, у тры разы менш», — адзначыў медыяэксперт.

«Дзяржаўныя СМІ працягвалі ігнараваць іншых патэнцыйных кандыдатаў на пасаду прэзідэнта, а мінімальная ўвага да іх была выклікана працэдурай рэгістрацыі ў заключны перыяд маніторынгу, — падкрэсліў Алесь Анціпенка. — Гэткім чынам, пазітыўнае пазіцыянаванне дзеючага прэзідэнта, ягонае выразна дамінантнае становішча ў дзяржаўных СМІ з'яўляецца часткай агульнай стратэгіі асвятлення выбарчага працэсу, а яе адваротны бок — маргіналізацыя ўсіх астатніх прэтэндэнтаў, асобы і прозвішчы якіх засталіся невядомымі для спажыўцоў дзяржаўных медыя».

У справаздачы адзначаецца, што, як і ў папярэдні перыяд, тыя ж медыя «праграмавалі» вынікі галасавання праз шматлікія спасылкі на вынікі сацыялагічных апытанняў, часам без указання канкрэтных інстытуцый, што гэтыя апытанні праводзілі, і асвятлялі выбарчы працэс, выразна ігнаруючы прынцыпы журналісцкай этыкі і міжнародна прызнаныя стандарты.

Таксама можна казаць і пра маргіналізацыю і дыскрэдытацыю апазіцыйных прэтэндэнтаў у дзяржаўных медыя. Алесь Анціпенка нагадаў пра разважанні тэлевядоўцы Юрыя Пракопава ў праграме БТ «У цэнтры ўвагі» ад 14 лістапада 2010 года: «Упершыню рэальныя шансы стаць кандыдатамі маюць адразу дзесяць чалавек. Хаця і паводле дадзеных сацыёлагаў, і на думку экспертаў, і нават па прыкідах саміх прэтэндэнтаў, у дзевяці з дзесяці кандыдатаў шансы заваяваць давер выбаршчыкаў практычна роўныя нулю. Рэйтынг усіх супернікаў Лукашэнкі не перавышае аднаго працэнта».

Увогуле ж, па словах Алеся Анціпенкі, у дзяржаўных электронных і друкаваных СМІ тэма прэзідэнцкіх выбараў заставалася маргінальнай, нягледзячы на тое, што некаторыя медыя павялічылі да яе сваю ўвагу.

▸ ВАНДРОЎКА

# ПАВЕРЫЦЬ У АПАЗІЦЫЮ

Вольга ХВОІН

**Падчас візіту ў Чэхію і Польшчу кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў дамовіўся пра дапамогу ў арганізацыі назірання за працэсам галасавання і паралельнага падліку галасоў.**

Палітык сустракаўся з прадстаўнікамі ўладаў, грамадзянскай супольнасці, журналістамі. «Амаль усе былі перакананыя, што ў гэтай кампаніі ёсць таямніца, праз якую Еўрасаюзу не варта ўмешвацца ў нашы справы. Гэта было складана пераламіць, але мы змаглі, — тлумачыць сутнасць перамоў Някляеў. — Чаму мы дамагаліся сустрэч менавіта з міністрамі? Бо былі візіты міністраў замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага і Германіі — Гіда Вестэрвеле ў Беларусь, а да гэтага візіт аднаго з іх у Расію, сустрэча з міністрам Лаўровым. Сустрэчы з Лукашэнкам былі праведзеныя такім чынам, нібыта там вырашалася такое, што засталося па-за публічнасцю. Што, можа быць, Захад, палічыўшы беларускую апазіцыю няздольнай вырашыць праблему ўладаў у Беларусі, вырашыў дэмакратызаваць краіну, а Лукашэнку зрабіць дэмакратам без удзелу дэмакратычных сілаў. Мы атрымалі катэгарычнае «не» — за нашымі спінамі ніякіх дамоўленасцяў не было».

Кандыдат у прэзідэнты запрасіў польскіх і чэшскіх парламентарыяў у якасці гасцей наведаць Беларусь у дзень выбараў, 19 снежня, каб на свае вочы паглядзець на тое, як будуць разгортвацца падзеі ў Мінску. Палітык перакананы, што Беларусь чакаюць мірныя акцыі пратэсту супраць вынікаў галасавання, але гаворыць, што не ён іх рыхтуе, а ўлады сваімі супрацьпраўнымі дзеяннямі.

Уздымалася падчас замежных сустрэчаў і тэма ўдзелу Беларусі ў працы парламенцкай асамблеі палітыкі Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» (Еўранест). Уладзімір Някляеў прапанаваў уключыць у Еўранест 10 дэпутатаў беларускага парламента з умовай, што будзе запрошаная аналагічная дэлегацыя прадстаўнікоў апазіцыі з правам выступу па любых пытаннях.

▸ ПАМЯЦЬ

# МІНСК РАЗВІТАЎСЯ З ІВАНАМ НІКІТЧАНКА

**На Паўночных могілках непадалёк ад беларускай сталіцы ў панядзелак пахавалі Івана Мікалаевіча Нікітчанку — прафесара, член-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кіраўніка Сацыяльна-экалагічнага грамадскага аб'яднання «Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў».**



На больш статутных — Усходніх (Маскоўскіх) — могілках месца для слыннага «чарнобыльца» не знайшлося…

Іван Мікалаевіч загінуў у аўтакатастрофе. Паводле афіцыйных звестак, аўтамабіль, якім кіраваў прафесар, сутыкнуўся з грузавіком «ЗІЛ» у 14.45 у мінулую пятніцу. Навукоўца даставілі ў шпіталь, дзе прафесар памёр у 2 гадзіны ночы на суботу, 20 лістапада. Сваякам пра трагедыю паведамілі амаль праз суткі.

У панядзелак, 22 лістапада, да дому нумар 38 па вуліцы Іванаўскай у Мінску пачалі прыходзіць і прыязджаць людзі з кветкамі, вянкамі. Першымі былі сябры Іваан Нікітчанкі па «Цэнтру падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў», а таксама прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук Юры Хадыка, журналісты. Ва ўсіх, хто прыходзіў развітацца з Іванам Мікалаевічам, чыталася ў вачах: «За што? Як гэта магло адбыцца?..»

Развітацца з Іванам Мікалаевічам прыйшлі яго сябры, калегі па Акадэміі навук (у тым ліку прыехаў былы прэзідэнт НАН Беларусі і экс-кіраўнік Савета Рэспублікі Нацсходу акадэмік Аляксандр Вайтовіч), палітыкі Вінцук Вячорка, Вячаслаў Сіўчык, Павел Севярынец, Сяргей Калякін, Валеры Ухналёў, сябры Руху «За свабоду» на чале з яго кіраўніком Аляксандрам Мілінкевічам, мастак Аляксей Марачкін, рэжысёр Валеры Мазынскі, іншыя вядомыя ў Беларусі асобы. Пасля кароткага развітання на ганку дома, дзе жыў Іван Нікітчанка, працэсія рушыла на Паўночныя могілкі.

Калектыў «Новага часу» выказвае шчырыя спачуванні родным, блізкім і сябрам Івана Мікалаевіча Нікітчанкі. Валадарства вам нябеснае, дарагі наш Чалавек…

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НАПЯРЭДАДНІ «ВЯЛІКАГА ПЕРАДЗЕЛУ»?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Пакуль ідзе прэзідэнцкая кампанія, не вельмі заўважанымі застаюцца іншыя, не менш цікавыя падзеі ў Беларусі. А між тым, здаецца, улада саспела да маштабнай прыватызацыі. Інакш навошта ёй было ацэньваць «Беларуськалій»?**

Увесь пакет акцый ААТ «Беларуськалій» ацэнены ў 30 мільярдаў долараў ЗША, паведаміў 24 лістапада журналістам старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгій Кузняцоў.

Паводле яго слоў, ацэнку ажыццявіла РУП «Інстытут нерухомасці і ацэнкі».

Кузняцоў заявіў, што пытанне з продажам акцый «Беларуськалія» «пакуль завісла». «Напэўна, кітайцы думаюць. Мы сказалі ім кошт і нашы ўмовы. Яны думаюць, ці прымальныя тэтыя ўмовы для іх», — сказаў кіраўнік дзяржкамітэта. Кузняцоў таксама паведаміў, што падчас візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай у кастрычніку «гэтае пытанне асабліва не абмяркоўвалася».

Нагадаем, у жніўні рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ВА «Беларуськалій» было пераўтворана ў ААТ, 100% акцый якога належаць дзяржаве. «Беларуськалій» быў уключаны ў план прыватызацыі на 2010 год. Як заявіў журналістам 4 жніўня першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, Беларусь не мае намеру спяшацца з продажам гэтага прадпрыемства. «Што да продажу пэўнага пакета акцый, то гэта магчыма», — дадаў ён.

Паводле слоў Сямашкі, ёсць шмат ахвотных на куплю «Беларуськалія». Але «цяпер не самы ўдалы момант для продажу», лічыць першы віцэ-прэм'ер. «Беларуськалій», патлумачыў ён, — гэта прадпрыемства, якое працуе паспяхова і за кошт сваёй дзейнасці і ўласнага прыбытку рэалізуе інвестыцыйныя праекты.

Тым не менш, эканамісты па-рознаму ацэньваюць кошт прадпрыемства. Так, прыкладам, 30 мільярдаў долараў за ААТ «Беларуськалій» — адэкватная цана, лічыць беларускі эканаміст Сяргей Чалы. «Гэта дастаткова кансерватыўная ацэнка», — заўважыў ён. «Беларуськалій», на думку эксперта, можа быць ацэнены прыкладна ў столькі ж, у колькі і вядучы сусветны вытворца мінеральных угнаенняў — канадская Potash Corp, за якую разгарнулася нежартоўная барацьба паміж пакупнікамі. «Кошт Potash Corp быў павышаны з 29 да 39 мільярдаў долараў. Зразумела, што цэннік крыху завышаны з-за таго, што да актываў праяўлена вялікая цікавасць. Але ў прынцыпе і «Беларуськалій» можна ацаніць прыкладна ў такую суму, з улікам таго, што на рынку разгараецца ажыятаж вакол актываў у гэтай галіне», — сказаў эксперт.

У сваю чаргу, аналітык Банка Масквы Юрый Волаў назваў цану «Беларуськалія» завышанай. Ён заўважыў, што па магутнасцях «Беларуськалій» у паўтара разы большы за расійскі «Уралкалій», а ўвесь пакет акцый расійскага вытворцы ўгнаенняў нядаўна быў ацэнены ў 10 мільярдаў долараў. Адпаведна, 100% акцый «Беларуськалія» павінны каштаваць 15 мільярдаў долараў», — мяркуе расійскі эксперт. Волаў таксама ўказаў на тое, што канадскі вытворца мінеральных угнаенняў Potash Corp перавышае «Беларуськалій» па аб'ёме вытворчасці хлоркалію і мае моцныя пазіцыі ў фосфарным і азотным бізнесе.

Зразумела, улада шмат патрацілася на выбары, і таму ёй трэба будуць грошы. Хаця б на тое, каб не «заваліць» фінансавую сістэму Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Але, што больш насцярожвае, дык гэта абяцанні Нацбанка. У Беларусі няма неабходнасці для правядзення дэвальвацыі. Пра гэта 23 лістапада на прэс-канферэнцыі паведаміў журналістам старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч.

Наш народ прызвычаіўся ўспрымаць заявы чыноўнікаў «з дакладнасцю да наадварот». Калі нам дэвальвацыя не пагражае, чаму Пракаповіч узняў гэтую тэму?

«Сёння сітуацыя зусім іншая і няма неабходнасці ісці на такія крокі. Няма абавязацельстваў перад МВФ, няма неабходнасці звяртацца да МВФ па падтрымку, у нас дастаткова сваіх рэсурсаў. Залатавалютныя рэзервы ўзрастаюць», — зазначыў старшыня праўлення Нацбанка. Апрача таго, працягнуў Пракаповіч, сёння зусім іншая сітуацыя склалася ў свеце. «Мы можам праводзіць запазычанні на замежных рынках. А год таму мы апынуліся ў вельмі цяжкай сітуацыі, таму што мы да таго часу карысталіся крэдытнымі рэсурсамі Расіі, і гэта было не выпадкова, — патлумачыў кіраўнік Нацбанка. — Калі Расія пераводзіла нас на высокія цэны на энергарэсурсы, яны абяцалі, што па неабходнасці будуць выдзяляцца крэдытныя рэсурсы. Але летась сітуацыя змянілася: нам было адмоўлена ў крэдытных рэсурсах. У той момант у нас не было магчымасці выхаду на знешні рынак, таму што ў нас не было практыкі размяшчэння еўрабондаў і нам патрэбны быў час».

Наш народ ужо прызвычаіўся да таго, каб успрымаць заявы чыноўнікаў «з дакладнасцю да наадварот». Калі нам дэвальвацыя не пагражае, чаму Пракаповіч увогуле ўзняў гэтую тэму? Чаму яму раптам спатрэбілася супакойваць беларускае грамадства? Ох, нездарма гэта, нездарма…

Ну а перадвыбарчая кампанія ідзе сваім ходам. Кандыдаты ў прэзідэнты пачалі агітацыю, выступы па тэлебачанні і радыё, ставяць пікеты ў цэнтрах гарадоў. Аднак пра бяспеку сваіх агітатараў паклапаціўся пакуль што толькі Уладзімір Някляеў.

23 лістапада ў Мінску прайшоў устаноўчы сход Рэспубліканскага даследча-адукацыйнага грамадскага аб'яднання «Гавары праўду!». Старшынёй праўлення новай грамадскай арганізацыі абраны лідэр грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў, яго намеснікам — Андрэй Дзмітрыеў. Як паведамляе афіцыйны інтэрнэт-сайт грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!», ва ўстаноўчым сходзе ўзялі ўдзел 77 дэлегатаў з усіх абласцей Беларусі і Мінска.

Як зазначыў Някляеў, на працягу тыдня дакументы на рэгістрацыю арганізацыі будуць перададзеныя ў Міністэрства юстыцыі. «Ужо з моманту падачы дакументаў нашым актывістам не змогуць выставіць прэтэнзіі наконт таго, што яны дзейнічаюць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Калі кагосьці затрымаюць супрацоўнікі міліцыі, што вельмі верагодна ў перыяд выбарчай кампаніі, ён можа заявіць: «Выбачайце, дакументы на рэгістрацыю арганізацыі знаходзяцца ў Міністэрстве юстыцыі. Арганізацыя лічыцца дзейнай не з моманту рэгістрацыі, а з моманту падачы дакументаў у Мінюст», — зазначыў Някляеў.

ФІГУРЫ ТЫДНЯ

## ПЁТР ПРАКАПОВІЧ



У краіне ходзяць чуткі пра магчымую дэвальвацыю рубля пасля прэзідэнцкіх выбараў. Цягам апошніх месяцаў быў істотна падвышаны заробак працаўнікам бюджэтнай сферы, выраслі пенсіі. Незалежныя эканамісты сцвярджаюць, што гэты рост выплат не абумоўлены эканамічным ростам і, адпаведна, пацягне за сабой абясцэньванне рубля. Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр супакоіў грамадскасць, што неабходнасці для правядзення дэвальвацыі няма. Ён падкрэсліў, што мінулая дэвальвацыя (у студзені 2009 года) была вымушаным крокам. А цяпер «сітуацыя зусім іншая».

Пётр Пракаповіч прагназуе курс долара ЗША на канец 2010 года «блізкім да трох тысяч беларускіх рублёў». Разам з тым кіраўнік Нацбанка мае аптымістычны прагноз наконт паступлення прамых замежных інвестыцый у Беларусь ад продажу дзяржуласнасці. У 2011 годзе яны прагназуюцца на ўзроўні 3 мільярдаў долараў. Паступленні ад прыватызацыі могуць быць рэалізаваныя з улікам продажу двух беларускіх банкаў — «Белінвестбанка» і «ПарытэтБанка».

## ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА

Першая ракетка свету Караліна Вазняцкі (Данія) і беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка з дзесятым нумарам у рэйтынгу WTA правялі ў Мінску дабрачынны матч, адной з мэтаў якога быў збор сродкаў для Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах. На трыбунах сярод гледачоў былі і дзеці, і дарослыя пацыенты з анкалагічнымі захворваннямі, а таксама інваліды. Прысутнічалі і ўрадавыя службоўцы на чале з кіраўніком Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, які глядзеў матч са сваім малодшым сынам Мікалаем.



Раздаўшы аўтографы прыхільнікам, Азаранка і Вазняцкі правялі майстар-клас па тэнісе. Але найбольш яскравым момантам стала гульня Лукашэнкі з тэнісісткамі, якія пераўтварылі спаборніцтва ў шоў. У матчы атрымала перамогу беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў дзяўчат падарункамі ў выглядзе памятных корцікаў, клюшак і медалёў.

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка плануе праводзіць дабрачынныя матчы па ўсёй Беларусі. «Хачу, каб такія матчы праводзіліся не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах, — цытуе тэнісістку БелаПАН. — Трэба, каб людзі ведалі аб праблемах дзяцей».

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ



На гэтым тыдні спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння выбітнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча.

У Мінску з гэтай нагоды адкрылася выстава «Рыцар зямлі беларускай». У экспазіцыі прадстаўлена каля 500 з 1 600 адзінак пісьмовых і выяўленчых матэрыялаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю Караткевіча, якія захоўваюцца ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сярод выстаўленых — рукапісы твораў 1950-х гадоў з малюнкамі аўтара, раманаў «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і «Чорны замак Альшанскі», аповесцяў і апавяданняў, эсэ і казак. Наведвальнікі выставы могуць пазнаёміцца з дакументамі Караткевіча часоў яго вучобы ў Кіеўскім дзяржаўным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі, пабачыць запісныя кніжкі пісьменніка, узоры перапіскі, рэдкія фотаздымкі, малюнкі пісьменніка на гістарычныя тэмы, ілюстрацыі Караткевіча да ўласных твораў, партрэтныя замалёўкі і сяброўскія шаржы на пісьменніка. Акрамя таго, на выставе дэманструюцца выдадзеныя творы Караткевіча на розных мовах свету і кнігі з прысвячэннямі класіку, — перадае БелаПАН.

Літаратуразнаўца Анатоль Верабей назваў Караткевіча «геніем і прарокам, нацыянальным пісьменнікам, глыбока дасведчаным у беларускай гісторыі і культуры, які паказаў адметнасці і непаўторнасці беларусаў, стварыў мастацкі летапіс Беларусі, а таксама вельмі шмат зрабіў для абуджэння нацыянальнай памяці суродзічаў».

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя выдання аповесці Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» на беларускай, англійскай, рускай і ўкраінскай мовах, выпушчанага Беларускім фондам культуры.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ТРЫВОЖНЫЯ ЧАКАННІ

Сяргей НІКАЛЮК

**За пралікі дзяржавы заўсёды расплачваецца грамадства, нават калі гэтыя пралікі звязаны з правядзеннем палітыкі «нечуванай сацыяльнай шчодрасці».**



У апошнія гады ў моду ўвайшло слова «кантэкст» (ад лацінскага «contextus» — «злучэнне»). У шырокім сэнсе пад кантэкстам разумеецца асяроддзе, у якім існуе аб'ект. Возьмем, да прыкладу, прэзідэнцкія выбары. Асноўны кантэкст 1994 года — *«власть буквально валялась в грязи»*. Да другіх прэзідэнцкіх выбараў у краіне было скончана будаўніцтва «вертыкалі ўлады» — галоўнай апоры «моцнай дзяржавы» ў беларускім варыянце. Трэція прыйшліся на пік расійскіх датацый. Кантэкст чацвёртых прэзідэнцкіх выбараў — безвыніковыя спробы ўлады выканаць сацыяльныя абавязанні ва ўмовах сусветнага крызісу.

## Парадак супраць хаосу

*«Россия слиняла в три дня»* — такая формула лютаўскай рэвалюцыі 1917 года, аўтарам якой з'яўляецца філасоф Васіль Розанаў. Праз 73 гады лютаўскі сцэнар паўтарыўся. На гэта хапіла трох подпісаў у Белавежскай пушчы. Камуністаў не выратаваў ні ядзерны шчыт, ні манаполія на СМІ. І што цікава, як у першым, так і ў другім выпадку распад імперый адбыўся без удзелу апазіцыі.

Дэмантаж савецкай дзяржавы пачаўся задоўга да перабудовы. Да сярэдзіны 80-х гадоў у краіне сфармаваліся магутныя групоўкі рэгіянальных і галіновых эліт. Яны і зрабілі асноўны ўнёсак «у найвялікшую катастрофу XX стагоддзя».

Але яшчэ ў сярэдзіне XVII стагоддзя аўтар «Левіяфана» англійскі філасоф Томас Гобс адзначаў, што нават самы горшы ўрад лепш, чым яго адсутнасць. Безуладдзе — сінонім хаосу. Якой бы архаічнай ні была савецкая сістэма, гэта была сістэма. Адмова ад яе прывяла да падзення вытворчасці на тэрыторыі ўсіх былых савецкіх рэспублік незалежна ад эканамічнай палітыкі, якая праводзіцца нацыянальнымі ўрадамі.

Беларускае грамадства здольнае знаходзіцца ў двух станах: у спячым і ва ўзбуджаным. Прынята лічыць, што ва ўзбуджаны стан грамадства пераходзіць пад уплывам эканамічных цяжкасцяў. Аднак цяжкасці ваенных гадоў непараўнальныя з цяжкасцямі Перабудовы. Чаму ж тады ў першую сусветную вайну народ павярнуў зброю супраць улады, а ў другую сусветную — не?

Палітычнае абуджэнне — гэта зваротная рэакцыя на распад улады. Для тлумачэння працытую Альберта Шпеера, міністра эканомікі Гітлера: «Прыкладна ў такі самы час (канец 20-х гадоў) мая матуля пабачыла шэсце атрадаў СА па вуліцах Гейдэльберга: дэманстрацыя парадку ў час хаосу, праява энергіі ў атмасферы агульнай безнадзейнасці скарылі і яе. Ва ўсякім разе, яна не праслухала ніводнай прамовы, не прачытала ніводнага артыкула, аднак адразу ўступіла ў партыю».

Дакладна такой жа была і рэакцыя шматлікіх беларусаў у 1994 годзе. Падчас электаральнай рэвалюцыі яны падтрымалі «моцную асобу» і тым самым вырашылі зыход першых прэзідэнцкіх выбараў.

## Пра густы не спрачаюцца

Насуперак прадказанням незалежных экспертаў, зварот да савецкіх метадаў кіравання дазволіў першаму прэзідэнту «запусціць заводы», і ў першы год першай пяцігодкі ВУП павялічыўся на 11%! Адзначым, што такі неверагодны рост быў нечаканым і для самой улады. Вось якую задачу ставіў Лукашэнка перад урадам у 1997 годзе: *«Основные задачи текущего года четко сформулированы в прогнозе социально-экономического развития страны. ВВП предусмотрено увеличить на 5%»*.

У адрозненне ад інвестыцыйнага росту, які заснаваны на вытворчасці новых тавараў і ўкараненні новых тэхналогій, постперабудовачны рост быў выключна аднаўленчым. Паўтарылася гісторыя 20-х гадоў, калі пасля хаосу грамадзянскай вайны на старым вытворчым абсталяванні высілкамі старых кадраў аднавіўся выпуск дарэвалюцыйнай прадукцыі.

У аднаўленчага росту тры асаблівасці: ён пачынаецца раптоўна, працякае бурна, аднак хутка заканчваецца. Да другіх прэзідэнцкіх выбараў рэзерв аднаўленчага росту ў Беларусі быў вычарпаны. У 2001 годзе ВУП павялічыўся на 5%, у той час як рэальныя грашовыя прыбыткі насельніцтва — на 28%! Такая дыспрапорцыя стала магчымай за кошт пераразмеркавання рэсурсаў, ажыццёўленага «моцнай дзяржавай» дзеля свайго самазахавання. Параўнаеце: індэкс інвестыцый у асноўны капітал у прамысловасці ў 2000 годзе склаў 111%, у 2001 — 101%. Адпаведна, індэкс уводу ў дзеянне агульнай плошчы жылых дамоў усяго толькі за год скараціўся з 121% да 85% і г. д.

Ці можна такое пераразмеркаванне рэсурсаў лічыць купляй галасоў электарату? Тут усё залежыць ад асабістага густу. Пра густы ж, як вядома, спрачацца не прынята.

## Усё, пра што дамаўляліся, — увасоблена ў жыццё

Выбары скончыліся, і ўжо на наступны год рэальныя грашовыя прыбыткі беларусаў падраслі толькі на сціплыя 4%. Што да пакрыцця насельніцтвам выдаткаў на аказанне паслуг ЖКГ, дык яно імкліва пайшло ўгару: 2001 г. — 22%, 2002 г. — 37% і 2003 г. — 46%. Такія сацыяльныя інавацыі «моцнай улады» трансфармаваліся ў палітычныя інавацыі насельніцтва, следствам апошніх стала падзенне рэйтынгу «адзінага палітыка» (АП). У сакавіку 2003 года, па дадзеных НІСЭПД, ён склаў 26,2%. Здавалася, нішто не замінае яму працягнуць зніжэнне ў рэжыме пікіравання.

Аднак надзеям адных і хваляванням іншых не наканавана было спраўдзіцца. На беларускім палітычным полі нечакана з'явіліся новыя гульцы ў асобе сусветных фінансавых спекулянтаў. Яны пераламілі трэнд, што намячаўся, нават не падазраючы пра існаванне дзяржавы Беларусь. Высілкамі спекулянтаў нафта са звычайнага тавару ператварылася ў тавар інвестыцыйны. Яе пачалі скупляць з мэтай перапродажу. Кошт нафты пайшоў угару, плынь нафтадолараў палілася ў Расію, што падштурхнула попыт на беларускія тавары. Адначасова павялічылася эфектыўнасць беларускага «нафтавага афшору».

Кантэкст трэціх прэзідэнцкіх выбараў для ўлады быў спрыяльны. Рэальныя грашовыя прыбыткі павялічыліся: у 2005–2006 гадах на 18%, а ў 2007–2008 — на 13%. Такая сацыяльная шчодрасць была дасягнута без пракалвання чарговай дзіркі на рамяні дзяржаўных інвестыцый. У кіраўніка дзяржавы, такім чынам, была падстава заявіць з трыбуны III Усебеларускага сходу: *«Всё, о чем мы договаривались на II Всебелорусском народном собрании, реализовано и воплощено в жизнь»*.

Практыка — крытэр праўды. *«Выработанный нами курс развития страны оказался правильным»*. Катастрафічныя прагнозы незалежных экспертаў у чарговы раз не спраўдзіліся.




## Выбары пройдуць, праблемы застануцца

Кантэкст чацвёртых прэзідэнцкіх выбараў фармуецца пад дыктоўку сусветнага эканамічнага крызісу. Яго негатыўны ўплыў вымушаны прызнаць распрацоўнікі нядаўна апублікаванай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ на 2011–2015 гады. У праграме вылучаны тры этапы развіцця беларускай эканомікі ў завяршальнай пяцігодцы: дакрызісны, крызісны паслякрызісны. Прывяду толькі адну цытату: «Сусветны фінансава-эканамічны крызіс аказаў адмоўны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, абумовіў запаволенне тэмпаў росту ВУП і заработнай платы ў 2009 годзе адносна 2008-га (тэмпы росту ВУП склалі 100,2 працэнта, рэальнай заработнай платы — 100,1 працэнта) і зніжэнне прамысловай вытворчасці (98 працэнтаў да ўзроўню 2008-га)».

Прызнаўшы ўплыў «глабальных тэндэнцый» на развіццё беларускай эканомікі, распрацоўнікі-аптымісты, тым не менш, мяркуюць, што знешні неспрыяльны кантэкст «беларуская эканамічная мадэль» будзе здольная нейтралізаваць за кошт «падвышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальных таваравытворцаў». Такі аптымізм варта вітаць, вось толькі не зразумела, чаму ж нацыянальным вытворцам не атрымалася адэкватна павялічыць канкурэнтаздольнасць у адказ на выклік яшчэ ў 2009 годзе.

Перспектывы надыходзячай пяцігодкі ўражваюць, але большасць беларусаў, беручы прыклад з АП, імкнуцца «ісці ад жыцця», а не ад макрапаказчыкаў. У верасні насельніцтва купіла долараў на 62,8 мільёна больш, чым прадало. У кастрычніку гэты непажаданы для нацыянальнай валюты паказчык павялічыўся ў пяць разоў, склаўшы 317,2 мільёна «зялёных». Мэтанакіраваныя высілкі ўлады па дасягненні «святой лічбы» (сярэдняй зарплаты ў 500 долараў) робяцца бессэнсоўнымі перад ростам у грамадстве трывожных чаканняў.

Сёння і шараговаму абывацелю зразумела, што выбары пройдуць, а праблемы застануцца. Вераснёўскае падваенне коштаў на грэчку далёка не апошняе. Для таго, каб гэта зразумець, зусім не абавязкова вывучаць паліталогію нават у яе азбукавым варыянце.

## Стабільнасць як функцыя рэйтынгу

У адрозненне ад французаў, здольных з любой нагоды ладзіць шматмільённыя дэманстрацыі, беларусы не схільныя браць удзел у масавых акцыях пратэсту. Чаму ж тады ва ўмовах сусветнага крызісу прэзідэнт Францыі ідзе на прыняцце непапулярных мер, у той час як яго беларускі калега не здольны адмовіцца ад сацыяльных абяцанняў, прынятых у дакрызісны перыяд? Існуе ж, урэшце, такое паняцце, як «форс-мажор». Самы час на яго спаслацца.

Каб растлумачыць парадокс, я вымушаны паклікаць на дапамогу адну з азбукавых паліталагічных ісцін. Улада ў дэмакратычных краінах абапіраецца на інстытуты, а ў Беларусі — на рэйтынг АП. Адсюль страх, што ён можа абваліцца. Адсюль выбарачны падыход да ранейшых абяцанняў. Пра падвышэнне сярэдняй зарплаты да 500 долараў беларусам нагадваюць кожны дзень, але штосьці нічога не чуваць пра імкненне *«к тому, чтобы через пять лет качество жизни наших граждан довести до уровня, сравнимого с западноевропейским»*. А як наконт абавязання павялічыць да канца пяцігодкі пакрыццё насельніцтвам выдаткаў на ЖКГ да 62%? Замест росту атрымалася падзенне. У «моцнай дзяржавы» папросту не хапіла адвагі адкрыць народу праўду наконт эканамічнага кантэксту, які моцна змяніўся.

АП любіць звяртацца за прыкладамі да пачатку 90-х, калі *«великая страна, вышедшая победительницей из самой страшной в истории войны, оказалась беззащитной перед политическими авантюристами»*. Такія прыклады дазваляюць яму пераносіць у сучасную міфалогію вобраз універсальнага культавага героя, які перамог хаос. Не выключана, што падобны герой у хуткім часе пачне карыстацца ў Беларусі падвышаным попытам. Вось толькі перамагчы новы хаос у старога героя шанцаў няшмат.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

# Стэфан Эрыксан: У БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ ДОБРАЯ БУДУЧЫНЯ

Працяг. Пачатак на стар. 1.



Але ж вядома, што палітыка любой дзяржавы выпрацоўваецца ў сталіцы. Адсюль я бачу толькі частку агульнага палітычнага ландшафту. А ўся панарама бачная са Стакгольма. А ёсць яшчэ Брусель, ёсць агульная знешняя палітыка Еўрасаюза, у межах якой каардынуе сваю палітыку Стакгольм. Але, безумоўна, меркаванні амбасадараў заўсёды прымаюцца ў ліку асноўных аргументаў для прыняцця рашэння.

***— Якраз адзін з перыядаў Вашай дзейнасці ў якасці амбасадара супаў са старшынствам Швецыі ў Еўрасаюзе. Прычым гэтыя паўгода выпалі на час рэалізацыі новай палітыкі ЕС у адносінах Беларусі, так званага дыялогу. Чым гэты перыяд быў адметны для Вас? Якія, на Ваш погляд, плюсы і мінусы дыялогу?***

— Паўгода старшынства ў Еўрасаюзе — не такі і вялікі тэрмін, каб пакінуць значны адбітак. І нават не ў тым яго галоўны сэнс. Бо падчас старшынства краіна, якая яго ажыццяўляе, павінна трохі забыцца на свае нацыянальныя прыярытэты і дзейнічаць зыходзячы з агульнаеўрапейскіх інтарэсаў.

У цэлым наша старшынства ў Еўрасаюзе было ацэнена станоўча. Мы працягнулі палітыку дыялогу з Беларуссю, які пачаўся да нас. Хачу падкрэсліць, што дыялог заўжды лепш, чым яго адсутнасць. Але каб ён меў вынікі, павінна быць паразуменне паміж усімі яго ўдзельнікамі. Мы ж, Еўрасаюз і Беларусь, часам усё ж размаўляем на розных мовах. Адсюль і розная ступень паспяховасці нашага дыялогу.

***— Якія варыянты магчымага працягу дыялога, яго наступстваў? Сумесны візіт у Беларусь міністраў замежных спраў Германіі і Польшчы, візіт еўракамісара Штэфана Фюле, а да таго прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ даволі неадназначна ўспрыняты як беларускай, так і часткай міжнароднай грамадскасці.***

— Я думаю, што падчас такіх візітаў найперш трэба ўважліва прыслухацца да таго, які, так бы мовіць, «мэсідж» нясуць яго ўдзельнікі. Мне падаецца, што той жа Штэфан Фюле як афіцыйны прадстаўнік ЕС дастаткова ясна і дакладна растлумачыў пазіцыю Еўропы, якая заўжды абапіралася і абапіраецца на дэмакратычныя каштоўнасці — правы чалавека, свабоду слова, свабодныя выбары. Канешне, мы прызнаем права СМІ каментаваць такія візіты пасвойму. Аднак мне здаецца, што інтэрпрэтацыя, якую мы часам сустракаем як у дзяржаўных, так і ў недзяржаўных выданнях, часта не зусім адпавядае рэчаіснасці. Таму не вельмі хацелася б трапляць у палон таго сэнсу, якога ў візітах не было.

Аднак нягледзячы на некаторыя складанасці і перашкоды, мы ўсё ж перакананыя, што дасягнуць узаемаразумення мы зможам толькі сродкамі адкрытага дыялогу. І, безумоўна, роля такога дыялогу напярэдадні выбараў павялічваецца.

***— Дык што ж будзе пакладзена ў аснову ацэнкі гэтых выбараў — крытэрыі «рэалпалітыкі» ці каштоўнасці?***

— Дыялог — гэта абсалютна не тое ж самае, што «рэалпалітыка». І Еўрасаюз ніколі не адмаўляўся ад сваіх каштоўнасцяў, у тым ліку і ў знешняй палітыцы. У кастрычніку былі прынятыя высновы ЕС адносна Беларусі, якія выразна гэта ілюструюць. Тут нічога не мянялася і не змяніцца.

Канкрэтныя ж крытэрыі, па якіх мы можам ацэньваць вынікі выбараў, гэта, перш за ўсё, назіранні і высновы Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ). Назіральнікі з гэтай арганізацыі ўжо прыехалі ў Беларусь.

Што датычыцца першага этапу кампаніі — збору подпісаў за вылучэнне кандыдатаў і іх рэгістрацыі, — дык ён прайшоў, на маю думку, больш свабодна, чым у папярэднія разы. Аднак, нават улічваючы заўважную лібералізацыю на дадзеным этапе, мы цудоўна разумеем, што самае галоўнае наперадзе. Гэта і роўны доступ кандыдатаў да сродкаў масавай інфармацыі, і магчымасць беспярэшкоднага правядзення сходаў і сустрэч, і арганізацыя самога працэсу галасавання, у тым ліку датэрміновага. На жаль, як мы ведаем, ЦВК адхіліла тыя прапановы, якія мелі на мэце зрабіць працэс падліку галасоў больш празрыстым. Такім чынам, поўная ацэнка ходу і вынікаў выбарчай кампаніі–2010 магчымая толькі пасля яе завяршэння. І яна, безумоўна, стане прадвызначальнай для далейшага дыялогу з Беларуссю.

***— Швецыя — адносна невялікая краіна, але маштаб яе праграм супрацоўніцтва, падтрымкі грамадскіх ініцыятыў у розных краінах, у тым ліку ў Беларусі, уражвае. Чым гэта тлумачыцца?***

— У гэтай сферы ў Швецыі ёсць даўняя і ўстойлівыя традыцыі ажыццяўлення праграм супрацоўніцтва. Не толькі адносна Беларусі, але і іншых краін. З чаго гэта вырасла? Мне падаецца, што ў нашым грамадстве ёсць усведамленне, нават вера ў тое, што мы знайшлі нейкі правільны шлях, вынайшлі мадэль дастаткова гарманічнага і справядлівага ўладкавання нашага грамадства, дзякуючы чаму яно дасягнула даволі высокага ўзроўню дабрабыту. Штогод каля аднаго адсотка нашага ВУП накіроўваецца на падтрымку розных праграм у іншых краінах. І калі рухнула Берлінская сцяна, наогул абвалілася жалезная заслона, натуральна, узнік інтарэс да нашых новых суседзяў, узнікла жаданне падзяліцца з імі нашым досведам, дапамагчы нейкім чынам. Былі распачатыя самыя розныя праграмы з удзелам краін Балтыі, з Расіяй, Украінай і таксама з Беларуссю. Адтуль усё і ідзе. Разлік? Калі і ёсць, дык толькі ў зацікаўленасці, каб нашы суседзі жылі таксама ў дабрабыце, у дэмакратыі. Ад гэтага і нам будзе лепей.

***— Шведская амбасада пад Вашым кіраўніцтвам арганізуе вялікую колькасць рознага кшталту культурных праграм у Беларусі. У чым іх канцэптуальны сэнс? Свайго роду кампенсацыя звужаных магчымасцей найпраставага палітычнага супрацоўніцтва? Ці культура як самакаштоўнасць — асвета, узаемапаразуменне, духоўнае самаабагачэнне, сродак знаёмства са сваёй краінай?***

— Усё, што вы пералічылі, у пэўным сэнсе і ў пэўных суаднprofessionalосінах прысутнічае. Культурныя праекты — гэта значная частка нашых праграм. Прыемна, што наша актыўнасць у гэтай сферы заўважаная.

***— Якія з культурніцкіх праграм, рэалізаваных амбасадай у Беларусі, Вы б адзначылі асабліва?***

— У мяне шмат улюбёных праектаў. З апошніх назаву выставу твораў з лямцу ў Музеі сучаснага мастацтва. Я ведаў, што гэта шведская традыцыя сугучна беларускай. Але такой велізарнай цікавасці да выставы нават і не чакаў.

Мне вельмі да спадобы ўсе нашы літаратурныя кантакты, якім мы імкнёмся спрыяць. У перапіку вынікаў — выданне некалькіх кніг у перакладзе са шведскай на беларускую. Як жа прыемна было бачыць на прэзентацыі адной з кніг на філфаку БДУ запоўненую студэнтамі вялікую залу! Былі і яшчэ, на наш погляд, удалыя праекты. Звычайна мы не ставім за мэту праводзіць нейкія грандыёзныя культурныя імпрэзы.

***— У сэнсе маштабных аднаразовых — так. Але ў вашых праектах ёсць іншая адметнасць — іх бесперапыннасць, адзін праект завяршаецца — пачынаецца новы. Акрамя таго, яны ахопліваюць не толькі Мінск, але і шэраг абласных цэнтраў. Ствараецца эфект іх пастаяннай прысутнасці ў беларускай культурніцкай прасторы. Гэта заўважана не толькі мной. Якія новыя праекты ў планах амбасады?***

— Наша канцэпцыя палягае не толькі ў тым, каб прывезці нейкі адзін праект, прадставіць адзін калектыў, аднаго творцу, паказаць — вось гэта наша — і з'ехаць. Гэта, можа, таксама не дрэнна. Але калі прыязджаюць нашы дзеячы і робяць нешта сумесна з беларускімі творцамі, гэта дае іншы плён. Фарміруюцца сталыя творчыя і чалавечыя сувязі. Да гэтага і імкнёмся. З новых планаў у працяг нашых папярэдніх праектаў на наступны год — падрыхтаваная літаратурна-музычная праграма, у якой прагучаць вершы нашых шведскіх паэтаў у беларускім перакладзе на музыку і ў выкананні Зміцера Вайцюшкевіча з аркестрам «Усход-Захад».

***— Які ёсць магчымасці пашырыць беларускія культурна-асветніцкія праграмы ў Швецыі? Праз дыпламатыю, праз грамадскія арганізацыі?***

— Развіваць эканамічныя сувязі і супрацоўніцтва, безумоўна, вельмі важна. Але поруч абавязкова трэба развіваць і культурніцкія сувязі. Беларусь у сваім культурным багажы мае шмат чаго прапанаваць Швецыі. Для нас, для Еўропы Беларусь найперш за ўсё цікавая сваёй адметнасцю, сваёй культурай. Але культура патрабуе падтрымкі як унутры краіны, так і ў яе пашырэнні за межамі Беларусі, сярод міжнароднай супольнасці.

***— У чым Ваша матывацыя на вывучэнне беларускай мовы ў краіне, дзе для выканання прафесійных абавязкаў хапіла б і рускай мовы, якой Вы валодаеце дасканала?***

— Як вы самі разумееце, ніхто ж мяне не прымушаў яе вывучаць. Перш за ўсё, мне самому было цікава. Але я разумеў і праблемы моўнай сітуацыі ў Беларусі, праблемы з ужываннем беларускай мовы. Таму і паставіў перад сабой задачу вывучыць яе. Рэакцыя, як вы ведаеце, была станоўчая. Аказалася, што акрамя задавальнення свайго ўласнага інтарэсу, я сваім прыкладам хоць у чымсьці пазітыўна паўплываў на стаўленне да беларускай мовы, на падвышэнне яе аўтарытэту. Гэта, безумоўна, мяне натхняе.

***— У беларускай гістарычнай памяці захавалася мноства легенд, а на тэрыторыі Беларусі — мясцін, што нясуць на сабе адбітак старадаўніх, часамі складаных і драматычных дачыненняў нашых народаў. Ці не ўтрымліваецца тут знак і падказка для больш інтэнсіўнага супрацоўніцтва — сумесных навуковых даследаванняў, напісання папулярных прац, здымкаў сумесных фільмаў, арганізацыі адпаведных турыстычных маршрутаў?***

— Тут ёсць адна асаблівасць. У Беларусі інтарэс да гісторыі ў пэўных колах вельмі вялікі. Ён вынікае з таго, што беларускі народ толькі нядаўна аднавіў сваю дзяржаўнасць, сваю незалежнасць. У Швецыі гэты інтарэс не такі відавочны, ён больш стабільны. Зразумела, што ў нас не было такіх перыядаў, калі гісторыя была пад забаронай. Таму мы з ёй даволі добра знаёмыя і традыцыйна больш глядзім наперад, наша цікавасць па большасці засяроджаны на сучаснасці, на тэндэнцыях яе развіцця ў будучыню. Адно, безумоўна, не павінна выключаць другое. І ў гэтай галіне шмат зроблена, у тым ліку вашым суайчыннікам Андрэем Катлярчуком, які напісаў грунтоўную даследчую працу, абараніў дысертацыю па шведска-беларускіх стасунках у XVII стагоддзі. Думаю, што магчымасці для развіцця супрацоўніцтва па гістарычнай тэматыцы ёсць. Да мяне звяртаецца шмат людзей з адпаведнымі канкрэтнымі прапановамі. Гэта ўсё вельмі цікава. Патрэбен толькі час і адпаведныя высілкі, крок за крокам.

***— Ваша камунікабельнасць, шырыня кантактаў з беларусамі ўжо таксама сталіся амаль легендай. Якой Вам уяўляецца Беларусь і яе людзі?***

— Беларусь, як краіна і як людзі — прывабныя. Ужо шосты год ідзе, як я тут жыву. Калі б мне не падабалася, я б тут, відаць, не застаўся. Беларусь мае сваю ўнікальную гісторыю, і ў яе ёсць будучыня, упэўнены — добрая будучыня. Людзі ў пэўнай ступені ёсць вынік гісторыі. У сваёй няпростай, драматычнай гісторыі Беларусь засталася, выстаяла. Атрымаліся добрыя і таленавітыя людзі, нават не зважаючы на ўсе тыя пакуты, што выпалі на іх долю на гэтым скрыжаванні гістарычных шляхоў. Часам у мяне пытаюцца, ці моцна адрозніваюцца беларусы ад шведаў, ад еўрапейцаў. Я не лічу, што моцна. Беларусы для мяне — еўрапейцы, зразумела, як і кожны народ, са сваімі асаблівасцямі.

КАМЕНТАР

# ЗАКРАНУЦЬ КОЖНАГА

**Сваім меркаваннем пра ход прэзідэнцкай кампаніі з журналістам «НЧ» Вольгай Хвоін дзеліцца віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі, кіраўнік праваабарончага цэнтру «Вясна», адзін з лідэраў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».**

***— Ёсць меркаванне, што і апазіцыя ў гэтых выбарах не надта чыстая на руку, і калі б ЦВК быў больш прынцыповым, то колькасць зарэгістраваных кандыдатаў была б меншая.***

— Працэдура праверкі подпісаў была закрытая, і мы не выключаем магчымасці палітычных маніпуляцый з боку выбрчых камісій і тых, хто за імі стаіць. Гэта супярэчыць выбарчаму кодэксу, бо ў ім нічога не гаворыцца пра абмежаванні для ўдзелу назіральнікаў у час праверкі подпісаў. Ідуць розныя сігналы ад сябраў камісій, Ярмошына сама казала, што былі копіі падпісных лістоў. Можна меркаваць, што колькасць кандыдатаў, калі б усё было празрыста, была б меншай, чым ёсць.

***— Якія ключавыя моманты празрыстасці правядзення выбараў у нашых умовах?***

— Першы ключавы момант мы ўжо прапусцілі — рознабаковы склад выбарчых камісіяў, калі прысутнічаюць прадстаўнікі розных партыяў, рухаў. У складзе камісій вытрымана патрабаванне пра наяўнасць 30 працэнтаў прадстаўнікоў розных грамадскіх аб'яднанняў. Іншая справа, што гэта саюзы ветэранаў, жанчын, «Белая Русь», БРСМ. У той жа час палітычныя партыі адхінутыя ад гэтага працэсу. Я не магу сказаць, дзе яшчэ такое ёсць. Калі б камісіі былі сфармаваныя з удзелам прадстаўнікоў палітычных сілаў, давер да іх працы павялічыўся б. Атрымліваецца, што міна пад прызнанне выбараў ужо падкладзеная, бо створаныя падкантрольныя камісіі.

Другое — папярэдняе галасаванне, якое не забяспечвае захаванне бюлетэняў. Людзей штурхаюць да датэрміновага галасавання, і працэнт атрымліваецца высокі. А ўпэўненасці, што ўначы гэтыя скрынкі ніхто не адкрывае, няма. У празрыстых скрынях аднаразовы механізм закрыцця, звычайныя ж можна закрываць-адкрываць колькі заўгодна. На ноч у памяшканні са скрынкамі застаецца міліцыянт, дзеянні якога таксама непадкантрольныя.

Трэці момант — абмежаваныя паўнамоцтвы назіральнікаў падчас падліку галасоў. Гэта працэдура не прапісаная заканадаўча. А ў нашых умовах кожная камісія можа рабіць усё на свой манер. Можна сказаць і пра бюлетэні — яны не маюць выключных ідэнтыфікацыйных знакаў, іх можна друкаваць ледзь не дома.

***— Якія прагнозы наконт выбарчай кампаніі?***

— Можна сказаць, што ўлады зрабілі пэўныя папраўкі на правядзенне ўсёй кампаніі. Але ёй займаецца не ЦВК, не выбарчыя камісіі, а выканаўчая ўлада. Ёсць карэкціроўкі ў бок змякчэння бачных частак — збору подпісаў, агітацыі. Але самае галоўнае — падлік, фармаванне камісій — засталося нязменным, і гэта стварае стопрацэнтныя ўмовы для фальсіфікацыі.

***— Чыноўнікі Еўрасаюза гавораць, што на прызнанне выбараў паўплывае «набліжанасць да дэмакратычных стандартаў». Калі выбарчы працэс будзе праходзіць гэтак і далей, выбары будуць прызнаныя?***

— Я сумняваюся ў гэтым. Прычыны я назваў вышэй, яшчэ паглядзім на падлік галасоў. Іншая справа што і непрызнанне бывае таксама рознае. Яно можа быць больш катэгарычнае, а можа і больш лагоднае, з заўвагамі пра «працэс і прагрэс». Любое незалежнае назіранне мусіць мацаваць давер да ўладаў, тады ўлады могуць больш смела паводзіць сябе ў эканамічных, палітычных рэформах. Калі выбары не прызнаюць, то Захад можа працягваць млявую палітыку ўзаемадзеяння. Давер да беларускіх уладаў — гэта і мера даверу ў эканамічным супрацоўніцтве. Таму гэтыя выбары ўплываюць на жыццё кожнага з нас, а не толькі на людзей ва ўладзе.

КАМПАНІЯ

# ЛІБЕРАЛЬНА-КАСМЕТЫЧНЫ ПАЧАТАК

**ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ**

Вольга ХВОІН

**Беларускія праваабаронцы праводзяць грамадзянскую кампанію «Праваабаронцы за свабодныя выбары». Апошнія пятнаццаць гадоў міжнародная супольнасць не прызнавала вынікі выбараў у Беларусі. Сёлета Захад праяўляе вялікую ўвагу да прэзідэнцкіх выбараў, і звязана гэта найперш з перспектывамі геапалітычнага супрацоўніцтва. Высновы назіральных місій могуць паўплываць на лёс дзяржавы цягам бліжэйшых гадоў.**




У межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» да назірання прыступілі каля 100 назіральнікаў літаральна ва ўсіх рэгіёнах краіны. Многія з іх бралі ўдзел у міжнародным назіранні ў іншых краінах Еўропы і былога СССР. У Мінску працуе аналітычны аддзел, які аналізуе справаздачы назіральнікаў і рыхтуе штотыднёвыя і этапныя справаздачы. З імі можна азнаёміцца на сайце www.spring96.org.

Мэта кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» — праз правядзенне назірання за выбарамі даць ацэнку выбарчага працэсу, даносіць інфармацыю да беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці.

Ужо завяршыліся два важныя этапы выбарчай кампаніі: збор подпісаў і рэгістрацыя кандыдатаў у прэзідэнты.

Збор подпісаў за вылучэнне ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй Выбарчага кодэкса адбываўся ў спрошчаных умовах. Праваабаронцы, падсумаваўшы вынікі гэтага этапу выбарчай кампаніі, сцвярджаюць, што ёсць падставы гаварыць пра пэўную лібералізацыю палітычнага працэсу. «З аднаго боку, умовы працы кандыдатаў сапраўды былі спрошчаныя ў параўнанні з кампаніяй 2006 года. Што тычыцца адміністрацыйнага рэсурсу, то паляпшэння ў гэтай сферы няма. Найбольш неабароненыя групы насельніцтва, як, напрыклад, выхавальніцы дзіцячых садкоў, якія і так працуюць за невялікі заробак, вымушаныя былі збіраць подпісы за кандыдата Лукашэнку, стаяць у пікетах. Такіх фактаў мы фіксавалі шмат. Яшчэ я хацеў бы адзначыць тое, што ЦВК сваёй пастановай фактычна легалізавала збор подпісаў не сябрамі ініцыятыўных груп», — лічыць юрыст праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч.

Праваабаронцы наракаюць і на тое, што праца ўчастковых выбарчых камісій амаль не асвятляецца ў шырокім доступе, а ініцыятыўныя групы ўсіх прэтэндэнтаў працавалі ў няроўных умовах у параўнанні з ініцыятыўнай групай дзеючага прэзідэнта. Ім быў практычна забаронены доступ на тэрыторыю дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў, на тэрыторыю студэнцкіх і працоўных інтэрнатаў.

З 17 прэтэндэнтаў, якія зарэгістравалі ініцыятыўныя групы, 11 заявілі пра здачу як мінімум 100 000 подпісаў у сваю падтрымку; 6 прэтэндэнтаў вырашылі добраахвотна спыніць свой удзел у выбарах. Пасяджэнне Цэнтрвыбаркама па рэгістрацыі кандыдатаў, якое адбылося 18 лістапада, праходзіла адкрыта, у прысутнасці назіральнікаў і журналістаў.

«У цэлым, рэгістрацыя кандыдатаў адбывалася без значных абмежаванняў права кандыдатаў быць абранымі. У той жа самы час закрытасць працэдуры праверкі сапраўднасці подпісаў, а таксама дакументаў, пададзеных для рэгістрацыі кандыдатаў, не выключае маніпуляцый з боку выбарчых камісій і дае падставы для стаўлення да вынікаў рэгістрацыі як да палітычна, а не юрыдычна матываваных», — канстатуюць праваабаронцы.

КРЭАТЫЎ

# ПЕРШЫ НАМЁТ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Кругласутачны намёт у падтрымку Някляева ўсталяваны ля ўваходу ў чыгуначны вакзал Мінска. На слупе побач змяшчаецца ўказальнік са стрэлкай — «Плошча».**




Урачыстае адкрыццё агітацыйнага пікета адбылося 23 лістапада. Каманда з кандыдатам у прэзідэнты прыйшла на месца святочнай працэсіяй — з бел-чырвона-белымі балонікамі і сцягамі «За Някляева!» і «Гавары праўду!».

«Гэта самае зручнае і самае спрыяльнае месца для таго, каб паставіць круглясутачны намёт, — адзначыў актывіст кампаніі «Гавары праўду!» Міхаіл Башура. — Вось гэты імправізаваны слуп паказвае накірунні ў Мінск з усіх абласных гарадоў. І сапраўды, у Мінск скіроўваюцца зараз усе сцяжынкі. На Мінск арыентуюцца рэгіёны. Таму менавіта сёння каля гэтага намёта і пачынаецца наступны этап — этап агітацыі Уладзіміра Някляева».

«Указальнік «Плошча» на слупе паказвае, што ў сённяшняй Беларусі недастаткова проста прагаласаваць. А трэба бараніць свой голас», — патлумачыў каардынатар кампаніі Алег Мяцеліца. Агітацыйны намёт, да таго ж круглясутачны, ставіцца ў Беларусі ўпершыню. Гэткі ж самы пікет круглыя суткі някляеўцы ладзілі падчас збору подпісаў каля ГУМа на праспекце Незалежнасці.

Ля намёта выстаўлена і празрыстая скрыня. Уладзімір Някляеў паведаміў, што з заклікам дапамагчы з такімі скрынямі звярнуліся да прадпрымальнікаў. «Ужо сёння іх зроблена дастатковая колькасць для таго, каб прынамсі 300 участкаў, якія мы будзем старацца назіраць найбольш шчыльна, забяспечыць гэтымі скрынямі. Але пакуль што нашы прапановы прыняць іх і ўсталяваць не знаходзяць належнага водгуку», — сказаў кандыдат.

Мабілізацыйная кампанія ўключае два пасланні да выбаршчыкаў. Па-першае, не хадзіць на датэрміновыя выбары, каб мінімізаваць фальсіфікацыі. А прагаласаваць за таго ці іншага кандыдата ў дзень выбараў — 19 снежня. І па-другое, у выпадку фальсіфікацый, каб адстаяць галасы, 19 снежня а 20-й гадзіне прыйсці на Кастрычніцкую плошчу.

«Я абяцаю, што з нашага боку будзе зроблена ўсё, каб не было ніякага сілавога варыянту, — сказаў падчас гутаркі з людзьмі Някляеў. — Мы не будзем лезці на АМОН, мы не будзем іх правакаваць. Могуць быць правакацыі. Таму што вельмі шмат сіл зацікаўлена ў тым, каб плошчы не адбылося. Дайце веры, што мы прадумваем кожны крок, каб было без насілля».

Тым, хто кажа пра немагчымасць перамагчы, ён прыгадаў, калі «былі і горшыя сітуацыі». Быў Савецкі Саюз, і здавалася, што ён ніколі не зрушыцца. Ці Чэхія 20-гадовай даўнасці. У Празе тады быў акупацыйны рэжым, вакол стаялі танкі. І сам Гавэл задаваўся пытаннем, як перамагчы. Праз тыдзень ён з паплечнікамі прыйшоў да ўлады. «Спачатку выйшла сто чалавек, пасля тая сіла, якая змяла і гэтыя танкі, і ўсю гэтую махіну», — зазначыў Някляеў.

На заканчэнне ён прыгадаў знакамітую фразу Гавэла: «Ніколі не ведаеш, калі і дзе ўпадзе тая сняжынка, якая выкліча лавіну». «Дык вось, мне здаецца, што тая сняжынка, якая выкліча лавіну, якая змяце гэты рэжым, упадзе якраз 19 снежня. На плошчы. І я ў гэта веру», — заявіў Някляеў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 1 СТУДЗЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 17.00, 18.00, 23.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.10** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**09.40** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Меладрама «Калі ты мяне чуеш».
**14.05** «Здароўе».
**14.30** «Млын моды-2010».
**15.20, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Праграма «Праверка чутак».
**16.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**16.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.25** Зямельнае пытанне.
**18.45** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**18.50** «КЕНО».
**19.00** Выбары-2010. Выступы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША).
**23.30** Драма «Дастукацца да нябёсаў».
**01.05** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**01.15** Дзень спорту.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шматсерыйны фільм «Катоўскі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Гаражы».
**22.20** Асяроддзе пасялення.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** Спецдаследаванне.
**00.45** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінщчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял. Закл. серыя.
**15.30, 22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаловаць».
**23.55** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**00.50** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00, 22.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35, 15.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Меладрама «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 2-я серыя.
**10.45** Спорт-кадр.
**11.10** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.00** Медычныя таямніцы.
**12.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.30** «Расшыфраваць дрэс-код». Дакументальна- пазнавальны цыкл (Францыя).
**13.55** Пазакласная гадзіна.
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.10** Меладрама «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 3-я серыя.
**17.15** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**18.50** Беларуская часіна.
**19.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Сампдорыя-Эйндховен. Прамая трансляцыя.
**22.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лех-Ювентус. Прамая трансляцыя.
**00.00** Рэальны свет.
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** Прэм'ера. «Дыябет. Прысуд адмяняецца». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.20** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.20** Тэлесерыял «Дворык».
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік». «Паляванне на сведку».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Замах на Данаю». Дак. фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Кодэкс гонару».
**15.15** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**20.45** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**22.40** «Капітал. RU».
**00.05** Серыял «Ускосныя доказы».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**09.45, 19.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**10.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127.
**11.00, 15.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**12.45, 16.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127.
**13.45** Настольны тэніс. Міжнародны кубак у Германіі (Брауншвейг). 1/4 фіналу.
**15.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**17.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**18.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі. HS 127. Прамая трансляцыя.
**19.55** Настольны тэніс. Міжнародны кубак у Германіі (Брауншвейг). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**22.00** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**22.30** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**22.35** Абранае па серадах.
**22.40** Конны спорт. Мастэрс (Брусэль, Бельгія).
**23.40** Навіны коннага спорту.
**23.45** Гольф. Еўратур. Чэмпіянат свету (Дубаі, ААЭ).
**00.15** Гольф-клуб.
**00.20** Яхт-клуб.
**00.30** «Спартовы курорт». Часопіс.
**00.45** Настольны тэніс. Міжнародны кубак у Германіі (Брауншвейг). Фінал.
**01.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Выбары-2010.
**07.40** Праект «Будучыня».
**08.05** Сальда (эканамічная праграма).
**08.25** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.55** ПраСвет.
**09.20** Рэпартэр.
**09.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.00** Беларусы ў Польшчы.
**10.15** Вагон.
**10.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Род Алелькавічаў-Слуцкіх».
**10.30** «Сонечная дзіда», серыял.
**11.00** Перад выбарам.
**11.45** «Доктар Марцін», серыял.
**12.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 13 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Выбары-2010.
**17.20** «Мой родны горад», серыял.
**17.45** «Доктар Марцін», серыял.
**18.30** «Два – тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах.
**20.10** Вагон.
**20.20** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**20.55** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Выбары-2010.
**21.40** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**22.10** Эксперт.
**22.35** «Эдыт і Марсэль», маст. фільм, 1983 г., Францыя.
**01.10** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**01.15** Аб'ектыў.

## 2 СТУДЗЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**09.40** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Камедыйная меладрама «Жаночая інтуіцыя» (Расія).
**14.30** «Млын моды-2010».
**15.20, 18.10** Навіны рэгіёна.
**15.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**16.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**16.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.25, 01.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.30** Сфера інтэрэсаў.
**18.50** «КЕНО».
**19.00** Выбары-2010. Выступы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША).
**23.30** Трагікамедыя «Анкор, яшчэ анкор!» (Расія).
**01.25** Дзень спорту.

### АНТ

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Катоўскі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Банды».
**22.20** «Тур дэ Франс».
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** «Паляванне на прывідаў».
**00.40** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінщчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаловаць».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.55** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**00.50** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.10** Меладрама «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 3-я серыя.
**10.20** Музычная камедыя-казка «Туфлі з залатымі спражкамі» (СССР). 1-я серыя.
**11.40** Жансавет.
**12.20** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.20** «Дача здароўя».
**13.55** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.00** Меладрама «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.10** Тэлебарометр.
**18.15** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**19.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Амур (Хабараўск).
**21.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. БАТЭ-»Дынама» (Кіеў). Прамая трансляцыя.
**00.10** Час футболу.
**00.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. ПСЖ-Севілля.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** Прэм'ера. «Міс ТБ СССР і шэсць усёмагутных мужчын». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.20** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік». «Паляванне на сведку».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.20** «Праспявана ў СССР».
**12.10** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**15.15** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Ліцейны».
**20.50** Вострасюжэтны фільм «Муха».
**22.50** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Шарль дэ Голь. Вяртанне сумнага француза». Дакументальны фільм.

### EUROSPORT

**09.30, 02.25** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**10.00, 16.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**11.30, 17.30, 20.10, 01.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127.
**12.30** Настольны тэніс. Міжнародны кубак у Германіі (Брауншвейг). Фінал.
**13.25** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**13.30** Снукер. Мастэрс (Кітай). Фінал.
**17.00** Футбол. Выбары краін-гаспадынь Чэмпіянату свету 2018-2022 гг. Прамая трансляцыя.
**18.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір World Max. Фінал 16.
**00.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Выбары-2010.
**07.40** На колах.
**08.05** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**08.40** Госць «Белсата».
**08.55** Эксперт.
**09.15** «Два – тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**10.20** Вагон.
**10.25** Навігатар.
**10.45** Сальда (эканамічная праграма).
**11.00** «Мой родны горад», серыял.
**11.25** Доктар Марцін», серыял: 13 серыя.
**12.15** «Эдыт і Марсэль», маст. фільм, 2007/1983 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Выбары-2010.
**17.20** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.50** «Украдзены цуд», маст. фільм, ЗША.
**19.15** Асабісты капітал.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** Басанож па свеце: «Людажэры».
**20.35** Хто ёсць кім?: Зінаіда Бандарэнка.
**20.55** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Выбары-2010.
**21.40** Рэпартэр.
**22.10** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 9 серыя.
**22.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**23.15** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**23.20** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

**Выпуск №13 (51)**
**(лістапад)**

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


**«НАВІНЫ»: асноўныя літаратурныя падзеі месяца** ........ с. 2
**«РОЗДУМЫ»: запісы Уладзіміра Дайнекі** ........ с. 3
**«ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»: роздум пра Аляксандра ТВАРДОЎСКАГА** ........ с. 4
**«ПАЭЗІЯ»: вершы Міхася БАШУРЫ** ........ с. 5
**«ПРОЗА»: быліца ад Міколы ІЛЬЮЧЫКА** ........ с. 6
**«ПАЭЗІЯ»: вершаваныя роздумы Алеся МАСАРЭНКІ** ........ с. 7
**«ПРОЗА»: «Старонкі памяці» Анатоля КУДРАЎЦА** ........ с. 8–9
**«ПЕРАКЛАД»: Рэй БРЭДБЕРЫ** ........ с. 10
**«ГУМАР»: апавяданне Язэпа ПАЛУБЯТКІ «Токар са сталіцы»** ........ с. 11
**«НАРЫС»: падарожныя гісторыі Раісы КРЫВАЛЬЦЭВІЧ** ........ с. 12
**«ПРОФІЛЬ»: Яўген ЛЕЦКА па Яўгена ГУЧКА** ........ с. 13
**«ШКАЛЯРЫЙ»: аповеды ад Уладзіміра АРЛОВА** ........ с. 14–15
**«ЭСЭ»: Аксана СПРЫНЧАН — пра вандроўкі па шведскім Готландзе** ........ с. 16


**СВЕТАГЛЯД**

# АГНІ І БУРЫ

## ІДЭАЛЫ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ВА ЎМОВАХ ПОСТМАДЭРНАСЦІ



**Аляксей РАГУЛЯ**

**Завяршальны этап у развіцці гістарычнага тыпу культуры — эпоха крызісу, калі спадзяванні на хуткі прыход светлай будучыні па тых ці іншых прычынах не спраўджваюцца, а ідэалы адсоўваюцца ў невыразную далечыню ці наогул забываюцца.**

У грамадскай свядомасці час існуе як спыненая сучаснасць — без руху з мінуўшчыны ў будучыню. У такой сітуацыі ідэалы абясцэньваюцца і нават высмейваюцца. Ствараецца глеба для абясцэньвання першаасновы чалавечага інстынкту — клопату пра дасканаласць чалавечага роду, пра лёс другога і трэцяга пакаленняў, а нігілізм і ірацыяналізм зацікаўленымі слаямі нахрапіста навязваюцца ў якасці светапогляднай нормы. Так было ў эпоху крызісу антычнай цывілізацыі (элінізму), у эпоху абсалютызму, калі духоўныя рэнесансныя каштоўнасці культуры саслоўна-феадальнага тыпу гарэлі ў агнях інквізіцыі разам з іх носьбітамі.

Сутнасць сучаснага крызісу гандлёва-бюракратычнага грамадства ў беларускай культуры зафіксавана ў такіх універсаліях-фрэймах, як агні і буры, вогненная вёска, ваўчыная яма, лічбы на сэрцы. Для таго, каб стварыць семантыку такіх бязлітасна праўдзівых і сэнсаваёмкіх сімвалаў, патрэбна вялікая мужнасць духу, прага ісціны і здольнасць розуму да бескампрамісных ацэнак сутнасці. А яшчэ патрэбна чысціня сумлення, каб «прайсці праз вернасць» самому сабе, ідэалам свайго народа. Пра жыватворную сілу ідэалу пасля Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Язэпа Драздовіча, Васіля Быкава выдатна сказаў Анатоль Вярцінскі ад імя вайной абпаленага ў дзяцінстве пакалення:

*Высокае неба ідэала!*
*Мая душа чалавечая спала,*
*вякамі спала,*
*пакуль не ўбачыў цябе ўгары,*
*пакуль нада мной ты не заззяла,*
*высокае неба ідэала!*
*Калі адкрыў я цябе аднойчы,*
*убачыў цябе з тваёй вышыні, —*
*сталі іншымі мае ночы,*
*сталі іншымі мае дні.*
*Ты новым сэнсам іх асвятляла,*
*Высокае неба ідэала!*

Характэрнай асаблівасцю народнай культуры з'яўляецца непадзельнае адзінства ідэалаў эстэтычнага і этычнага (маральнага), змест якіх адлюстроўваюць універсаліі народнай канцэпталогіі: хараство і людскасць. Дамінуючая каштоўнасная ўстаноўка беларускага нацыянальнага менталітэту не дапускае супрацьстаяння паміж гэтымі паняццямі. Адзінства названых катэгорыяў вызначыла крытэрыі якаснай ацэнкі жыцця, характар нацыянальнай эўдаманіі, гнасеалагічнай і сацыяльнай утопіі. Беларускі ідэал не выносіцца за межы чалавечага свету і не бярэцца з свету трансцэндэнтнага, а вырастае з рэальнага быцця, нібы збажына на апрацаванай і засеянай раллі. Беларуская дактрына раіць не шукаць «шчасця, долі на чужым шырокім полі» (Янка Купала). «Чыстае» працоўнае ўзаемадзеянне з крэатыўнай сілай прыроды трактуецца як адзіна вартае чалавека жыццё. На гэтым матыве трымаюцца сэнсы беларускай народнай утопіі, якая з'яўляецца абавязковым кампанентам у тэкстах беларускіх казачнікаў Рэдкага, Старога дзеда Савіцкага і іншых. «На ўзлессі дом, ад казак недалёка» (Аркадзь Куляшоў), «лава жыцейка» (Якуб Колас) і шчаслівае маленства як доказ здзейсненасці, годнасці і працягненасці нашага чалавечага быцця ў свеце — гэта вызначальныя сімвалы беларускай аксіялогіі, беларускага ідэалу, беларускай казкі жыцця. У нацыянальнай культуры гэты ідэал застаўся непарушным і ў XX стагоддзі, калі «век ядзерны пачаў сваё рыканне» (Пімен Панчанка). На гэтым ідэале трымаецца беларуская футуралогія, выказаная, праўда, больш моваю мастацтва, чым філасофіі. Незавершанасць рэфлексіўнага філасофскага выказвання ў беларускай культуры даволі паспяхова кампенсуецца інтэлектуальным узроўнем мэдытацыі ў вобразнай форме літаратуры і выяўленчага мастацтва. У філасофскай паэме Аркадзя Куляшова «Цунамі» (1968) у эпілогу паказана чалавечае быццё, адроджанае пасля ядзернай катастрофы. Яго нязменнымі атрыбутамі застаюцца дом, жыта і дзіця, якое мае радасць бавіць час у гульні на лузе не з капронавымі, а з сапраўднымі матылькамі:

*Над сонечным мацерыком разліта*
*Духмянасць ніў спякотным*
*летнім днём.*
*Ён і яна ў цяньку сядзяць, дзе жыта*
*Шуміць зялёнай хваляй за гумном,*
*Як за кармою карабля. Пясчынкай*
*Адпачывае на руках ралля.*
*Ганяецца дзіця іх за пушынкай,*
*Падобнай на жывога матыля,*
*Сапраўднага, што ловіцца*
*за крылы.*
*А можа гэта не яны, а іх*
*Далёкія патомкі, што ў сваіх*
*Абліччах іх далёкія аблічы*
*паўтарылі?*
*Хто б ні былі яны, а толькі зноў*
*Яны — жыцця людскога сувязныя,*
*Дзве долькі неразлучныя, якія*
*Вякам перадаюцца ад вякоў.*

Дом і ніва з'яўляюцца сталым топасам і ў беларускім жывапісе. Язэп Драздовіч, у творчасці якога «касмічныя бегі» маюць канцэптуальную значымасць, у арганічным адзінстве сялянскага дому і ландшафту бачыў унікальную каштоўнасць паразумення чалавека з абсалютным касмічным духам. Уся творчасць мастака-філосафа прасякнута пачуццём адказнасці за ўраўнаважаную дыялектыку зносін земляроба з космасам. Гэтая раўнавага на працягу тысячагоддзяў стрымлівала энтрапію соцыуму. У Беларусі заканамерна ў XVII стагоддзі ўзнікла ідэя дзяржавы-дома — як альтэрнатыва перш за ўсё дзяржаве-казарме ўсходняга ўзору, а ў пэўным сэнсе і дзяржаве-лабараторыі заходняга ўзору. Лука Залускі (1604–1676) ў працы «Агульная філасофія» зазначыў: «Між вучонымі ідзе спрэчка пра тое, ці з'яўляецца дом першай супольнасцю ці не. Я лічу, што ў плане паслядоўнасці дом як супольнасць стаіць наперадзе іншых; ён з'яўляецца раней і за паселішча, і грамадзянскае грамадства, і царства; у плане ж інтэнсіўнасці гэтыя супольнасці апераджаюць дом».

**У Беларусі заканамерна ў XVII стагоддзі ўзнікла ідэя дзяржавы-дома — як альтэрнатыва перш за ўсё дзяржаве-казарме ўсходняга ўзору**

У плане аксеялагічным дом быў і застаецца першаснай каштоўнасцю ў нацыянальнай культуры беларусаў. Гістарычны час быў бязлітасны да беларускага дому, асабліва ў XX стагоддзі:

*І дзверы ўсе ў доме*
*расчынены насцеж...*
*А людзі...*
*Чаму не ўваходзяць у дом?*
*Прыходзілі ж калісь —*
*у шчасці,*
*ў няшчасці...*
*Бо сёння расчынены дзверы*
*агнём.*

Выпалены знутры дом з расчыненымі дзвярыма... Гэты вобраз-сімвал у паэзіі Сяргея Дзяргая можа быць суаднесены і з выпаленай знутры душой пакінутага і забытага былымі сябрамі гаспадара. Становіцца зразумелай вага такіх фрэймаў у беларускай культуры, як вайна, акупацыя, квазі-свой чалавек. Аднак і ва ўмовах татальнага спустошання нацыя будуе супольны дом сваёй культуры, пачынаючы зверху, з даху, матэрыялам для якога з'яўляецца выпрабаваны на працягу тысячагоддзяў ідэал:

*Я пачынаю з мары,*
*З дыму над комінам,*
*З буслінага гнязда,*
*Якое прымацоўваю да страхі,*
*Страху кладу на латы,*
*Латы — на кроквы,*
*Якія асаджваю на плечы сцен,*
*І ў вокнах — яшчэ не зашклёных —*
*Стаўлю кветкі.*

Прыведзены ўрывак з верша Максіма Танка пераканаўча дэманструе вялікія магчымасці беларускай мастацкай фенаменалогіі ў сферы філасофскага пазнання.

ЮБІЛЕЙ

# «ПАМІЖ АБЛОКАЎ І ВАСІЛЬКОЎ»

**Сярэдзіна лістапада прайшла пад знакам грамадскага ганаравання паэта і перакладчыка Васіля Жуковіча, якому споўнілася 70 гадоў.**



Васіль Жуковіч, Генрых Далідовіч, Валянціна Коўтун і Анатоль Вярцінскі ў Коласавым доме

Ведаючы гэтага сумленнага, шчырага, шляхетна-далікатнага чалавека, не верыцца, што ад пачатку яго жыццёвая сцяжына была пакручастай. Нарадзіўшыся напярэдадні вайны 7 лістапада 1940 года, Васіль Жуковіч рана страціў родных: бацьку і брата рэпрэсавалі, а маці заўчасна памерла. Аднак будучы паэт не зламаўся і мужна вытрымаў цяжкае ліхалецце. Пасля школы два гады працаваў рабочым на заводзе будаўнічых дэталяў у Брэсце, закончыў Брэсцкі педінстытут. Сярод старонак працоўнай біяграфіі Васіля Аляксеевіча — праца ў брэсцкай «раёнцы» «Зара над Бугам», на Брэсцкай студыі тэлебачання, у газеце «Знамя юности», выдавецтвах «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва» ды ў часопісе «Полымя» — да ягонай «касцянізацыі», змены незалежнага статуса і кіраўніцтва.

У гонар юбіляра ў сталіцы прайшлі дзве вечарыны — у Дзяржаўным музеі Якуба Коласа і Музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Пра лёсавыя і творчыя дарогі паэта на першай сустрэчы распавядалі калегі, якія прыйшлі ў Коласавы сцены павіншаваць свайго сябра з круглай датай. Генрыха Далідовіча, які ўмела «дырыжыраваў» імпрэзай, дапоўнілі Анатоль Вярцінскі і Валянціна Коўтун. Падарункам юбіляру стала інструментальнае абрамленне вучняў музычнай школы №3 імя Шапэна, якія парадавалі гледачоў народнымі і аўтарскімі кампазіцыямі, выканаными на гітары, флейце і нават на стогадовым Коласавым раялі.

«Васіль Жуковіч здаўна ўдзельнічае ў жыцці музея Якуба Коласа. Яго лірычны голас за апошнія чвэрць веку стаў звыклым для прыветлівай гасцёўні, якая захавала свой выгляд з часоў славутага гаспадара. І на рубяжы восьмага дзясятка моц голасу ўраджэнца старажытнай Камянеччыны не аслаб. Зусім нядаўна ўбачыў свет дыск з песнямі на яго словы. Варта адзначыць добры плён на ніве дзіцячай літаратуры, а таксама зборнік вершаў, назва якога адлюстроўвае любоў лірыка да роднага куточка — «Не завіце радзіму малой». З гэтай прычыны юбілейны вечар арганічна спалучаўся з прэзентацыяй выдання, у якім шмат старонак прысвяціў паэт сваім вытокам — зямлі берасцейскай і землякам», — адзначылі падчас імпрэзы супрацоўнікі «Коласавага Дома». «Васіль Жуковіч асабістым прыкладам паказвае, што і на парозе восьмага дзясятка можна і трэба быць жыццёва рухавым, творча неспакойным, выразна мэтаскіраваным і — галоўнае — улюбёным у жыццё і людзей», — дапаўняе іх паведамленне на сайце музея.

Назву творчаму вечару Васіля Жуковіча ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры даў назву паэтаў радок «Пакуль жыву — я музу буду зваць…»

«Жуковіч — паэт-лірык, паэт-гумарыст, паэт-аўтар кніжак для дзяцей, паэт-наватар і паэт-грамадзянін, які «з болем і журботнасцю жыве». Творы Жуковіча напоўненыя жывымі рэаліямі, што прыцягваюць людзей, як магніт… Паэт жыве клопатамі аб сучаснай літаратуры, шмат вершаў прысвячае дзеячам беларускай культуры, у тым ліку Яўгеніі Янішчыц, Ніне Мацяш, Нілу Гілевічу, Алесю Разанаву», — сказаў на сустрэчы Анатоль Вярцінскі.

А Алесь Разанаў месца юбіляра ў ландшафце беларускай паэзіі вызначыў «паміж аблокамі і васількамі»: «Аблокі прыналежаць небу, і яны, моцна зацікаўленыя ў зямлі, сочаць за тым, што адбываецца на небе. Васількі імкнуцца ўвысь, здабываючы дзівосную прыгажосць».

Актрыса Галіна Дзягілева назвала Васіля Жуковіча «лірыкам-волатам, вялікім беларускім паэтам, далікатным, светлым і прамяністым чалавекам і самым прыгожым сярод беларускіх мужчын».

Сам жа юбіляр адзначыў, што «ніколі не быў модным» і што яго «заўсёды хвалюе лёс людзей». Па ягоным прызнанні, паэт часта бачыць незвычайныя сны-фантазіі: «Я часта ўзлятаю, рукамі ўзмахваю, як крыламі, — і пайшоў. І толькі азіраюся і здзіўляюся, чаму яшчэ няма кагосьці побач».

На вечарыне ў свой гонар Васіль Жуковіч прачула чытаў вершы, сярод іх — і «Цені Гітлера-Сталіна па зямлі нашай ходзяць» і прысвячэнне нацыянальнаму герою Беларусі Кастусю Каліноўскаму.

**Я. С.**

ПАДЗЯКА

## БУДЗЬ ЗДАРОВЫМ!

**У «Новым часе» за 29 кастрычніка была апублікаваная абвестка з просьбай аб дапамозе хвораму хлопчыку Эдуарду. Аўтары «Літаратурнай Беларусі» вырашылі перадаць на яго рахунак свае ганарары.**

Сям'я Эдуарда выказвае ўдзячнасць: С.Законнікаву, В.Панкратаву, Р.Малахоўскаму, М.Ільючыку, У.Арлову, С.Харэўскаму, С.Егарэйчанку, А.Наўроцкаму, Г.Янкута, А.Башарымавай, Ю.Цімафеевай, К.Мацієўскай, А.Хадановічу, Э.Дубянецкаму, Г.Каржанеўскай, А.Пашкевічу, В.Зуёнку, В.Былю, М.Шчуру, А.Тарановічу, Л.Галубовічу і Я.Лецку.

ДРУК

## СОРАК ВОСЬМЫ «ДЗЕЯСЛОЎ»

У кнігарні і да падпісчыкаў прыйшоў чарговы нумар незалежнага літаратурна-мастацкага часопіса «Дзеяслоў». Ён знаёміць з творамі пераможцаў літаратурнага конкурсу, прысвечанага памяці Ларысы Геніюш — мініанталогіяй маладой паэзіі і прозы. Са сталых аўтараў у нумары — «Споведзь крывічанкі» Ніла Гілевіча, працяг рамана «Сутарэнні Ромула» Людмілы Рублеўскай, эсэ пра Уладзіміра Караткевіча Сяргея Законнікава і Віктара Яраца, а таксама: паэзія Ігара Сідарука, Вікі Трэнас і Святланы Варонік, проза Аляксандра Лукашука, Андрэя Федарэнкі, Артура Клінава; невядомыя лісты Ларысы Геніюш; «Абрысы няспраўджаных вершаў» Уладзіміра Марука; эсэ Віталя Тараса пра Льва Талстога; невядомыя творы Анатоля Сыса; «згадка» Уладзіміра Сіўчыкава, фельетоны Алеся Няўвеся ды пераклады з замежнай паэзіі і прозы.

Набудзьце ці падпішыцеся — ды чытайце да зімы!

## ЛАРЫСА ГЕНІЮШ – НА ПОШЦЕ

РУП «БЕЛПОШТА» накладам у 30 тысячаў выпусціла ў свет нечаканы для большасці прыхільнікаў нацыянальнага слова і нацыянальнай памяці падарунак — капэрту, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння славутай беларускай паэтэсы, сталінскага вязня і мужнай «грамадзянкі Беларускай Народнай Рэспублікі» Ларысы Геніюш.




Малюнак (паводле фотаздымка «пражскага» перыяду) выканаў мастак Я. Сіманенка. Побач з ім выявай выцісн уты — чырвоным па белым, у правапісе Тарашкевіча (!) — радкі-прызнанне паэтэсы:

*Беларусь мая ясная, сіняя казка,*
*Схіліліся дрэвы над хатай ў журбе,*
*Як жа мне сёньня няскaзана цяжка*
*І хораша разам жыць для цябе…*

«КІНО»

# ЛІТНЕФАРМАТ — ЦІ ПРОСТА «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» НІЧОГА НЕ МОЖА ДАЦЬ ВАРТАГА?

**17 лістапада ў прэс-цэнтры Дома Прэсы прайшоў круглы стол «Літаратура ў вірлівых варунках сучаснасці: папулярызацыя твораў беларускіх аўтараў у тэле-, радыёэфіры і кінематографе». Найбольш вострую дыскусію выклікаў менавіта кінематограф. Чаму нацыянальная студыя «Беларусьфільм» не экранізуе творы беларускіх літаратараў?**




Абмеркаванне пачалося з жартаў: кінематаграфісты настойвалі, што насамрэч знакамітая фраза Леніна пра кіно гучала інакш: «У перыяд непісьменнасці для нас важнейшымі з мастацтваў з'яўляюцца кіно і цырк».

Другой жа палове «стала» — пісьменнікам — было зусім не да жартаў. Літаратары, рэдактары часопісаў, літаратуразнаўцы, робячы грунтоўныя даклады пра развіццё беларускай літаратуры, настойвалі на тым, што пісьменнікаў у нас шмат, і іх творы вартыя экранізацыі.

«У нас даволі моцная плынь сацыяльна-псіхалагічнай прозы, унутры якой вылучаецца філасофска-псіхалагічная проза. Я не ведаю, ці гатовы наш кінематограф цяпер засвоіць гэта. Але тое, што сярод твораў Віктара Казько, Карамазава, Анатоля Кудраўца ёсць творы, вартыя экранізацыі, я пераканаеная. Ёсць яшчэ такая плынь лірычнай прозы, якая, на мой погляд, надзвычай кінематаграфічная: я маю на ўвазе навэлы Уладзіміра Сцяпана альбо прозу апошніх гадоў Леаніда Дранько-Майсюка. Я не думаю, што ў нас абсалютная адсутнасць твораў, якія можна было б пакласці ў аснову кінасцэнару ці тэатральнай пастаноўкі», — запэўніла кандыдат філалагічных навук, пісьменніца Ірына Шаўлякова.

Вядучы рэдактар нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Рыта Шаграй адказала, што ўсе аўтары, якія называліся, былі на кінастудыі ў так званым «сцэнарным партфелі». Але, на яе думку… «многія творы, на жаль, не адаптуюцца ніякім чынам да кінаэкрану, паколькі ў кіно ёсць свае законы. Пакуль што з празаікаў больш за ўсё падыходзяць да экранных пастановак раманы Людмілы Рублеўскай, таму што ў яе ёсць дзеянне, ёсць інтрыга, ёсць героі. Выбачайце, спадары літаратары, але ў нас няма нейкай агульнай ідэі, героя, якія б былі цікавыя не толькі нам, а яшчэ і нашым сябрам, якія купяць карціну. Таму што кіно — мастацтва дарагое. Трэба, каб кіно купілі не толькі шэсць абласцей, а каб Расія зацікавілася нашым прадуктам, Украіна. Такіх твораў нашых беларускіх аўтараў, на жаль, няма».

Выступленне Рыты Шаграй выклікала шквал абурэння. Чаму не бяруць экранізаваць творы? Яна адказала такім чынам: «Таму што ў літаратуры толькі адна асаблівасць: местачковасць. Мы не можам тое, што ў нас выдаецца, паказаць нават у Расіі».

Выснову з дыскусіі, на якой адны шчыравалі, а другія рабілі выснову, нібы глухія, ды паўтаралі сваё, зрабіў вядомы беларускі сцэнарыст Уладзімір Халіп: гэта з беларускім кінематографам сітуацыя крытычная.

«Студыя, якая працуе пад мудрым кіраўніцтвам нашага «Чырвонага дома», — сказаў ён, — нічога не можа даць вартага пэўнага мастацкага ўзроўню. І таму там ідзе такая звычайная, звыклая, шэрая халтура. Экранізуюцца творы пераважна міліцэйскага генерала, які ўзначаліў праўладную літаратуру.

А тое, што яны экранізуюць калі-небудзь Караткевіча — крый Божа, каб гэта адбылося! Калі нарэшце будзе нармальная ў нас краіна — будзе і нармальны кінематограф, і нармальная літаратура, так што варта крыху пачакаць. А цяпер чаканні гэтых болей чым наіўныя».

**Паводле Радыё Свабода**

ЗАПІСЫ

# ГЕРАДОЦІНКІ-10

Леанід ДАЙНЕКА




* * *

Чым арол беларускі розніцца ад арла расейскага? У расейскага на адных плячах дзве галавы. У беларускага ж галава адна, але ў роце ў гэтай галавы два языкі!

* * *

Літаратурнай творчасцю кармілася і корміцца вялікае мноства людзей. Празаікі, паэты, драматургі, крытыкі, гумарысты, бібліяфілы, дактары і кандыдаты навук, бібліятэкары, пісьменніцкія ўдовы, сябры і землякі творцаў, перакладчыкі, выдаўцы і г. д. «Несть им числа», — сказаў бы мудрэц, які таксама корміцца тым жа хлебам.

Заўсёды былі перакананы, што з гэтага агромністага войска хоць у празаікаў маецца больш-менш прыстойная адукаванасць і эрудыцыя. Усё-ткі, збіраючыся пісаць раман, трэба злёгку паднапружыць інтэлект...

...На міжнародную кніжную выставу-кірмаш завітала з Масквы ў Мінск Паліна Дашкава . Ейныя раманы ідуць нарасхоп. Расійская Агата Крысці, дый толькі! Сам я, каюся, іх не чытаў, бо не цікаўлюся творчасцю сучасных «дэтэктыўных» амазонак. Я б і не ўспомніў пра Паліну Дашкаву (дай ёй Бог атрымаць нобелеўку ў літаратуры!), калі б не яе інтэрв'ю. У тым эмацыянальным інтэрв'ю аўтар шматлікіх раманаў паведаміла, што «Дашкава» — ейны псеўданім. Самае ж цікавае і невераемнае — наперадзе! На запытанне журналіста, чаму яна абрала такое выбітнае ў расійскай гісторыі прозвішча ў якасці псеўданіма, каранаваная шматлікімі прэміямі аўтарыса, не міргнуўшы вокам, сказала, што ўзяла псеўданім у гонар сваёй любімай дочачкі Дашкі, а пра існаванне сваёй славутай папярэдніцы Дашкавай яна не ведала (!!! ). Аўтар шматлікіх, у тым ліку, і гістарычных раманаў не ведала (!!!) пра паплечніцу і сяброўку імператрыцы Кацярыны Другой, кіраўніцу Расійскай Акадэміі Навук, пісьменніцу (!), княгіню, рамантычна-містычную прыхільніцу французскіх філасафаў-энцыклапедыстаў Кацярыну Дашкаву (!). Як кажуць: «Стоп! Далей цягнік ня йдзе!».

Хто піша раманы? Хто іх чытае? Хто сачыняе на іх рэцэнзіі? Немагчыма адказаць. Можа, адказаў бы мікраскапічны жучок — папераед, але ён вельмі-вельмі заняты. У кніжнай шафе ён са смакам грызе чарговую старонку чарговага тоўстага рамана.

* * *

Хто мне скажа, куды падзеўся «сацыялістычны рэалізм»? Знік, як туман, як мамант. Ні подыху, ні гуку... Толькі манбланы кніжак, якіх ніхто не чытае. Мяркуем, што рэалізм пабег следам за сацыялізмам.

Сёння некаторыя з творцаў зацугляліболыш гарачага коніка — ударыліся ў «неацынізм». Гэта такі стан рэчаў, калі спаборнічаюць, ці здолее адзін геній з вялікай адлегласці трапна плюнуць у левае вока другому генію. Чаму ў левае? Таму што правае вока ўжо заплявалі. Чытаць гэткія опусы — тое самае, што з голым задам дзерціся ў зараснікі вогненна-пякучай крапівы.

Пішуць людзі... Чытаюць людзі...

Мы, паверце, таксама ўмеем і можам ТАК пісАць, але не хочацца брудзіць паперу.

* * *

Дзяўбуць нашага брата, беларускага пісьменніка, усе, хто толькі дзюбу мАе . І журналісты, і публіцысты, і дэпутаты. Яны дзяўбуць, а нам смешна. Дзяўбуць, а нам весела. Чаму? А таму, што наш рабочы інструмент — слова. А ў самай галоўнай кнізе, у Бібліі, запісана: «Спачатку было Слова». Усёк, румяны крытык наш? Слова было на самым-самым пачатку, а, значыць, і нашае пісьменніцкае рамяство. І што б ты пра нас ні крычаў, а мы былі і будзем (для народу будзем!) першымі. Бо нашая прафесія з'явілася на тысячагоддзі (!) ранней, чым, скажам, прафесія старшыні калгаса...

## Лавачка Біла Клінтана

Ва ўрочышчы Курапаты ўстаноўлена мармуровая лавачка, якую падараваў Беларусі Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан.

*Не шанцуе лавачцы*
*Клінтана Біла.*
*Нечая рука яе зноў разбіла.*
*Грукнуў па ёй чарговы малаток.*
*Нехта яе на сметнік завалок.*
*Ах, бедны-бедны містэр Біл,*
*Хіба ты не ведаў,*
*дэмакратыю хвалячы,*
*Што на кожнага Біла*
*знойдзецца дэбіл,*
*Які ненавідзіць Білаву лавачку?*
*Ты думаў (дзе табе дэбілаў*
*зразумець?),*
*Што лавачкі ставяць,*
*каб іх з месца не краталі,*
*Лавачкі ставяць, каб на іх сядзець.*
*Сядзець і думаць аб дэмакратыі.*
*Да нашых дэбілаў ты не дарос.*
*Дзе табе дужацца з імі?*
*Загартаваў іх сібірскі мароз,*
*Мазгі зрабіў ледзянымі.*
*Іхні вокліч любімы: «Рота, плі !!!».*
*Для іх ты не станеш босам.*
*Яны — рыцары страху*
*і мёрзлай саплі,*
*Што ўрачыста блішчыць*
*пад носам.*

## Чызікі

Зноў чызікі па ўсім праспекце вісяць. Пэўна, нейкае свята чакаецца, — гаворыць мне мой знаёмы, прафесійны шафёр.

Не разумею яго. Ён смяецца:

— Адпаў ты ад жыцця, Марцінавіч. Чызікі — гэта беларускія сцягі. Чырвона-зялёныя. Шафярня ў нашым гаражы іх так ахрысціла.

* * *

З усіх відаў паэзіі (рамантычная, патрыятычная, лірычная, «дацкая», гэта калі вершы спецыяльна пішуцца да нейкіх юбілейных датаў) паэзія «туалетная» стаіць як бы навотшыбе. Вы, напэўна ж, здагадаліся. пра які від, а, магчыма, й падвід народнай паэзіі я пачаў гаворку. Не ведаю. ці напісаў хто пра яе кандыдацкую альбо доктарскую, але ж яна існуе, як існуюць тысячы й тысячы розна камфортнасці туалетаў у нашай неабсяжнай краіне. Сядзіш альбо стаіш, чытаеш... Нехта з вымушанай паэзіі ўрэшце не вытрымлівае, і тут жа ў павучанне нашчадкам з'яўляецца двухрадковы перл:

*Грош цана таму паэту ,*
*Хто піша тут, а не ў газету.*

Але ўсе супакойваюцца, разыходзяцца-раз'язджаюцца па сваіх жыццёвых нішах, а «нятленка» працягвае забаўляць усё новых і новых чытачоў. Нішто ёй не ўказ.

Даводзілася і мне (я ж таксама жывы чалавек з усімі біялагічнымі функцыямі арганізму) чытаць падобнае. Набяруся смеласці і працытую «шэдэўр», які я прачытаў у туалеце філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (!) яшчэ, як кажуць, за савецкім часам:

*Як не круці — без ананізму*
*Нам не дайсці да камунізму.*
*Прабачце, і будзьце здаровыя.*

## Дайнекіяда, або Адкуль пайшлі-павяліся ліцьвіны

У студзені 2004 года на востраве Кіпр у падзямеллі рыцарскага замка Калосі мне ўдалося адкапаць піфас (старадаўні бронзавы збан), у якім я знайшоў пергамен, уласнаручна напісаны маім славутым продкам Дыянекам і ягонымі шматлікімі нашчадкамі. Думаю, шаноўнае спадарства ведае, хто такі Дыянек, я ўжо расказваў пра яго. А тым, хто не ведае, але хоча ведаць, напомню: гэта гераічны ўдзельнік Марафонскай бітвы (490 год да н. э.), заснавальнік роду Дайнекаў-Марафонскіх.

Пергамен, на вялікі жаль, дрэнна захаваўся. Рыцары, якім належаў замак Калосі, стаміўшыся ад бітваў з сарацынамі і ад нясцерпнай гарачыні, пачалі займацца вінаробствам, наладзілі вытворчасць цудоўнейшага салодкага віна «Камандарыя». Я піў яго. Смаката! Язычок пракаўтнеш! Карабель за караблём грузілі рыцары віно ў Еўропу. Дый самі да яго часцяком (а, калі дакладней, кожны дзень і кожны вечар) прыкладваліся. Ці да пергаменаў ім было? Пэўна, падчас адной такой пагулянкі, калі «Камандарыі» было выпіта вышэй вушэй, і нахіліўся змарнелы жаўнерык над піфасам, падмачыў Дыянекавыя пісьмёны.

Бог, як кажуць, яму суддзя.

Такім чынам, «Дайнекіяду» я буду друкаваць кавалкамі-фрагментамі. Нешта давядзецца апускаць, нешта дадумваць. Звыклы літаратурны працэс. Справа тэхнікі. «Гані струмень!» — як самаўпэўнена пасміхваюцца сярэднеталенавітыя, але «распрадаваемые» аўтары міліцэйскіх дэтэктываў і жаночых раманаў.

Разглядваючы пад лупаю знішчаныя-знявечаныя бязлітасным часам рэшткі пергамену, я інтуітыўна-пунктырна ўлавіў нітачку лёсу Дайнекаў-Марафонскіх. Сам Дыянек, хутчэй за ўсё, трапіў у палон да персідскага цара Ксеркса. Нашчадкі ягоныя рассЫпаліся па ўсім Міжземнамор'і. Егіпет, Галілея, востраў Крыт, потым Рым... Але ж як яны ўрэшце патрапілі ў нашыя палесціны, гэта значыць, у Беларусь? Адказ дае вось такі фрагменцік. Чытаю...

«Рэпартаж пісарчука Лявона з карабля князя Палямона.

Ведайце адно — храналогія пайшла не ад слова «хрэн». ... Калі да месца Рыму пачаў набліжацца са сваёй дзікай ардою чалавекаядзец крывавы Атыла, пяць соцень знаных рымскіх сем'яў селі на караблі і аддалі лёс свой бурліваму мору. Галавою ў іх быў прыўкрасны князь Палямон. І пачалі яны, ратуючыся ад непазбежнай смерці, шукаць сабе новую радзіму.

...Куды мы плывем? У моры бушуюць велізарныя хвалі. З вачэй льюцца слёзы, а з роту (няхай прабачаюць мне далікатныя паненкі-чытачкі) ваніты.

...Адна з хваляў ледзьве не перакуліла наш карабель. Хваля гэтая падалася мне няшчаснаму велічынёю з гару Везувій.

Куды ж мы плывем? Чаму князь Палямон вядзе караблі на поўнач? На ягоным месцы я пакіраваўся б да цёплых грэцкіх астравоў, або да егіпецкай ракі Ніл. Там бы я нарэзаў і насушыў сабе папірусу. Але ж я не Палямон.

Пачынаюць мерзнуць вушы і рукі. Сцявярдзеў, як камень, нос. Немагчыма пісАць. Чаму я не Палямон?

...Праплылі каля нейкага дужа вялікага вострава. Там, па марскім беразе, імкліва імчаліся баявыя калясніцы. Рудавалосыя велізарныя людзі стаялі ў іх, люта махалі бліскучымі сякерамі і крычалі нам нешта пагрозлівае.

...Пачынаем плыць на ўсход сонца. Зямля страшных рудавалосых людзей застаецца злева. Учора князь Палямон сказаў мне, што хоча стварыць новую дынастыю і новую дзяржаву.

Я напрасіўся ў яго ў генеральныя пісарчукі гэтай новай дзяржавы. Як вогненнавокі лясны звер зірнуў на мяне князь.

...Плывем на ўсход па новым моры. Яно не надта шырокае і не надта глыбокае. Палямон пазірае на мяне, як вогненнапёры дзюбаты певень на чарвяка.

...Наперадзе — вусце шырокай лясной ракі. Яна ўліваецца ў мора шматлікімі рукавамі. Б'ецца аб зялёныя берагі вецер. Нашыя караблі ўваходзяць у гэтую невядомую раку. З хмызу, з балотаў за намі цікуюць насцярожаныя вочы тубыльцаў...

...«Я хачу стварыць новы народ», — сказаў князь Палямон. Хутка ж з усіх нас і з князя стрэслася «рымскасць». Як лясная істужка.

...Сыйшоўшы з сем'ямі, з хатнім скарбам са сваіх караблёў, зашываемся ў лясныя нетры, ідзем па звярыных сцежках. Над намі ў атачэнні галінаў дрэў блішчаць кавалкі светла-сіняга неба. І вочы тубыльцаў блішчаць са змроку.

...Князь сказаў, што новы народ павінен мець новыя імёны. Я, пісарчук Лявон, атрымаў высокі загад прыдумваць гэтыя імёны. Я не разумею... (Далей пергамен сцёрты, размыты. Ідуць нейкія трэшчыны, пісягі.)

...Пякучыя ж дубцы ў гэтых лясах! А скура ў мяне ўжо не маладая. Адразу ж з вялікім імпэтам пачынаю загаданую мне прыўкрасным і звышмудрым Палямонам працу!

...Валасаты, тоўсты, як пень, здаравіла цягне да нашага вогнішча, дзе я ляжу з заголенай спіной, велізарнае бярэмя зялёных доўгіх дубцоў.

—Дзе ты быў? — пытаюць у яго.

—Я гай ламаў, — адказвае пень.

Адразу ж пішам першае імя — Ягайла.

...З цёмнага лесу выходзіць высокі і сінявокі, пытаецца ў князя Палямона:

—Дзе жыць мне, князь ?

—Жыві там, — ляніва махае шырокай даланёю ўбок гушчара Палямон.

Пішам імя — Вітаўт.

...Хачу адзначыць, што падчас марскога блукання жорстка застудзіў я вушы свае. Быццам па цвыркуну сядзіць у кожным вуху, і трашчаць, і пілуюць-пілуюць...

...Прыймчаў на порсткім кані да нашага стойбішча вяр з чырвоным вострым мячом у руцэ, са звярынай шкурай за плячыма. Шыбнуў да князевых ног торбу з адсечанымі чалавечымі галовамі. «Ну й малайчына! Ну й вой шалёны!» — задаволена зацмокалі ўсе.

Што ж — даю імя хвату Войшалк.

...— А ці не забыў ты казну нашу княжую ў Рыме? — спытаў Палямон у свайго скарбовага служкі.

Той перагнуўся перад уладаром, як лазіна, паляпаў пальцамі па металёвай скрыні:

—Не забыў, князь. Кейс тут.

Імя яму наракаю — Кейстут.

—Дык вып'ем, панове, за нашую новую Радзіму! — крыкнуў князь Палямон, аж ліսце з дрэваў пасыпалася. — Даставай, слуга мой верны, залатыя кубкі са сваёй скрыні! Будзем у іх ліць віны!

І назваў я ўвесь народ наш прыгожым словам — ліцьвіны. І гэтак да скančэння Часу яму называцца!

* * *

Усім! Усім! Усім!

Гісторыя Беларусі, вялікая гісторыя, заўсёды пісалася на беларускай мове. Пачытайце «Хроніку Быхаўца», пачытайце «Баркулабаўскі летапіс», пачытайце, нарэшце, «Статуты Вялікага Княства Літоўскага». Пачытайце Караткевіча, Іпатаву, Арлова.. Ёсць рэчы, якія можна і неабходна сказаць-выдыхнуць толькі па-беларуску.

▸ РОЗДУМ

# СПАСЦІГНУЦЬ ГЕНІЯ

## СТАГОДДЗЮ АЛЯКСАНДРА ТВАРДОЎСКАГА ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Іван САВЕЛЬЕЎ

**У дваццатым стагоддзі было шмат першакласных расійскіх паэтаў. Але каго з іх, не прымяншаючы значэння створаных імі паэтычных шэдэўраў, можна назваць народным паэтам у пушкінскім, класічным разуменні гэтага азначэння? Блока? Не. Ясеніна? Не. І ўжо тым больш не Маякоўскага. Ім стаў Аляксандр Трыфанавіч Твардоўскі, які злучыў, сінтазаваў у сваёй паэзіі класічную выразнасць музы Пушкіна з музай гневу і смутку Някрасава, стаўшы ў дваццатым стагоддзі Паэтам новай якасці.**

Зманлівая і часам недаступная для праўдзівай адзнакі Муза Твардоўскага; ашуквае яе знешняя прастата, як зманлівая была прастата і музы Пушкіна.

У сапраўднага Майстра не відно майстэрства. Як, скажам, у гэтым вершы Твардоўскага, напісанага ў 1939 годзе:

*Рожь, рожь… Дорога полевая*
*Ведёт неведомо куда.*
*Над полем низко провисая,*
*Лениво стонут провода.*
*Рожь, рожь — до свода голубого.*
*Чуть видишь — где-нибудь вдали*
*Нырнет шапка верхового,*
*Грузовичок плывёт в пыли.*
*Рожь уходилась. Близки сроки.*
*Отяжелела и на край*
*Всем полем подалась к дороге,*
*Нависнула — хоть подпирай.*
*Знать, колос, туго начинённый,*
*Четырёхгранный, золотой,*
*Устал держать пуды, вагоны,*
*Составы хлеба над землёй.*

Мастацкая, вобразная бездакорнасць гэтага верша настолькі пераканаўчая і ўсеахопная сваімі паэтычнымі сцежкамі, што так і хочацца выпісаць цэлыя радкі, асобныя фразы і змясціць іх як узоры эпітэтаў, разгорнутых метафар… Ужо не кажу аб значэнні ў вершы дзеясловаў: яны так кідка ўплеценыя ў вобразнае поле верша, што кожны колас успрымаецца як земляроб, праца якога акупілася. І хоць у вершы нічога не гаворыцца аб тым, на чым — калгасным або хутарскім — полі паспелі «пуды, вагоны, склады хлеба над зямлёй», усе прыметы калектыўнай працы ў наяўнасці: і верхавы на вялізным полі (не кліне!) жыта, і «грузавічок», і «вагоны хлеба», якія і не сніліся селяніну ў дасавецкі час…

Калі ж гаварыць пра тры паэмы («Васілій Цёркін», «Цёркін на тым свеце» і «Па праве памяці»), то яны ўяўляюць своеасаблівую «Боскую камедыю» паэта. Але, у адрозненне ад «Боскай камедыі» Дантэ, у Твардоўскага — усё з жывога жыцця, страшнага, жорсткага жыцця сталінска-



брэжнеўскіх дзесяцігоддзяў, дзе пекла-чысцец-рай сталі мёртвым жыццём для народа.

Так, пекла вайны (паэма «Васіль Цёркін») змянілася пеклам «чысцца» («Цёркін на тым свеце»), а «рай» пасляваенны стаў ужо для самога Твардоўскага «раем» таго свету, дзе яго ўслаўлены герой, перамогшы ў гады вайны ў імя сапраўднага раю для народа, апынуўся ў цісках наменклатуры, — бацька народаў валадарыў і там.

Паэма «Цёркін на тым свеце» напісаная ў духу з'едлівай сатыры Салтыкова-Шчадрына: «той свет» — гэта свет пасляваенны, які прыціскае цэкоўская партнаменклатура, і калі Цёркін вярнуўся з таго свету, то для самога Твардоўскага ён аказаўся апошнім прыстанкам.

Але і вялікая паэма «Па праве памяці» — гэта таксама сканцэнтраваная «Боская камедыя», бо яе тры часткі — «Перад адлётам», «Сын за бацьку не адказвае», «Аб памяці» — гэта тры часавыя пласты, з'яднаныя сталінска-брэжнеўскім самаўпраўствам.

Зыход барацьбы з уладай, якая нічога агульнага не мела з сапраўднай Савецкай уладай, ад імя якой цынічна выступала, быў для Твардоўскага прадвызначаны. Але мяне цяпер цікавіць сам Твардоўскі: раптам ён памыляецца, раптам Сталін мае рацыю, і саслалі сям'ю Паэта справядліва?..

Спадзяюся, што чытач разумее, да якога разраду «кулакоў», правільней — сапраўдных працаўнікоў на зямлі, аднесіўся бацька Твардоўскага Трыфан Гардзеевіч, — і такіх «кулакоў», як ён, былі тысячы і сотні тысяч, пра лёс якіх у сталінскай зоне, са слоў маці, гаварыў Аляксандр Трыфанавіч: «Мне маці распавядала, а яна не схлусіць. Пайшла аднойчы ў лес па маліну. У Заўраллі гэта было… Падумаць толькі, колькі людзей, якія не бачылі абласнога горада, былі выдраныя з родных гнёздаў і закінутыя супраць жадання, супраць волі на край свету. І вось убачыла ў ляску баракі. Зайшла ў іх. І пах ужо не пах, а нешта такое… І бачыць, ляжаць покатам мерцвякі… Некаторыя сядзяць за сталом, іншыя прыхінуліся да сцяны… Хто сядзеў за сталом, уткнуўшыся ў дошку, так і застыгнуў і памёр, і ўжо сіл не было, каб падняцца і хоць бы легчы. І ўжо не трупы, а нешта засмаглае, аголенае, але яшчэ і не скілеты… Маці кінулася на ўцёкі, а там іншы барак, трупі. Усё гэта акружана дротам, і аніякай, вядома, аховы — сыйшла, няма каго ахоўваць».

Там і былі сталінскія «кулакі».

Жудасна!

Жахліва!

Раю прачытаць гэтыя радкі тым, хто дагэтуль усхваляе «таварыша Сталіна, вернага спадчынніка Леніна», хоць жаданне маё наіўнае, — гэтых ужо ніколі не пераканаеш, бо яны да скону адданыя бацьку народаў.

А ці была альтэрнатыва калектывізацыі? Канешне, была.

Яе прапаноўвалі выдатныя аграрыі Аляксандр Чаянаў і Мікалай Кандрацьеў (яго кніга «Рынак збожжа» мелася ў асабістай бібліятэцы Леніна, ці не з яе пачынаўся ленінскі нэп?). Гэта быў шлях сапраўднай кааперацыі, які базаваўся на галоўным тэзісе Кандрацьева: «Рост сельской гаспадаркі вядзе… да магутнага развіцця індустрыі».

Але Сталін ведаў усё лепш, чым усялякі навуковец, і, згарнуўшы ленінскі нэп, паставіў крыж на чаянаўскай і кандрацьеўскай кааперацыі ды індустрыялізацыі, а саміх вялікіх аграрыяў напаткаў трагічны лёс: імя Кандрацьева знікла на 60 гадоў, а Чаянаў пасля пяцігадовай высылкі ў Казахстан быў асуджаны Надзвычайным саветам пры НКУС СССР да смяротнага пакарання, і вялікі навуковец у той жа дзень, 3 кастрычніка 1937-га года, быў расстраляны.

Ці ведаў аб гэтым Сталін?

Вядома ж, ведаў.

Што ж тычыцца «кулацтва» бацькі і зямлі, на якой ён працаваў, то Твардоўскі піша: «Зямля — гэта дзесяць з невялікім дзесяцін, — уся ў дробных балотцах, зарослая лазняком, ельнікам, бярозкамі, — была ва ўсіх сэнсах незайздросная. Але для бацькі, які быў адзіным сынам беззямельнага салдата і шматгадовай цяжкай працай кавалія зарабіў суму, неабходную для першага ўнёска ў банк, зямля гэтая была дарагой да святасці».

І бацька вырашыў жыць з зямлёй і з зямлі; каб неяк зводзіць канцы з канцамі; з-за нізкіх ураджаяў ён звяртаўся да малатка — арэндаваў чужы горан і накавальню, працуючы ад світанку да світанку.

Супраць гэтых «суцэльных мазалёў» селяніна-працаўніка, а не нахлебніка-дармоўніка, і была скіраваная бязлітасная рэпрэсіўная машына «бацькі народаў», — і наступіла ў краіне энтрапія Духу і Працы — тое выроўніванне, якое ў выніку прывяло да казарменнага сацыялізму Сталіна і да дэградацыі ўсёй сельскай гаспадаркі...

*Но всё, что стало или станет,*
*Не сдать, не сбыть нам с рук своих,*
*И Ленин нас судить не станет:*
*Он не был богом и в живых.*
*А вы, что ныне норовите*
*Вернуть былую благодать,*
*Так вы уж Сталина зовите —*
*Он богом был —*
*Он может встать.*

Такую праўду не магла даравать Твардоўскаму ўсемагутная брэжнеўска-суслаўская ўлада. Разам з той праўдай, чым дыхала таленавітая «новомирская» проза часоў Твардоўскага; гэтая праўда адкрывала чытачу вочы на «верных ленінцаў», — таму секчы яго трэба пад корань.

І ўлада секла Паэта: ён смяротна злёг; але сваю страшную хваробу (у яго была паралізаваная правая палова цела) перанесіў гэтак жа годна, як годна і мужна трываў невыносны цяжар цэкоўскага цкавання.

З Твардоўскім паўтарылася, як з Пушкіным: калі Аляксандра Сяргеевіча рукой Дантэса забіў цар, то Аляксандра Трыфанавіча марудна зводзіў у магілу брэжнеўска-суслаўскі молах.

Аб прадчуванні блізкага канца Твардоўскі, ужо адхілены ад кіраўніцтва «Новым миром», напісаў у сваім апошнім вершы 4 чэрвеня 1970 года:

*Не впасть бы мне в чрезмерную гордыню*
*(Соблазн велик, всем прочим не ровня)*
*По поводу забот, с какими ныне*
*Стремится Власть окоротить меня.*

На стале ў Брэжнева ляжала ў той час паэма «Па праве памяці», якую генсак катэгарычна забараніў публікаваць, бачачы ў ёй намёк на свой уласны культ.

Майстэрства сапраўднага Паэта, як вядома, выяўляецца ў мініяцюры, дзе кожнае слова на вагу золата:

*Июль — макушка лет, —*
*Напомнила газета,*
*Но прежде всех газет —*
*Дневного убыль света;*
*Но прежде малой этой,*
*Скрытнейшей из примет, —*
*Ку-ку, ку-ку — макушка —*
*Отстукала кукушка*
*Прощальный свой привет.*
*А с липового цвета*
*Считай, что песня спета,*
*Считай, пол-лета нет, —*
*Июль — макушка лета.*

Гэты невялікі верш, раз прачытаны, прыцягвае да сябе, нібы святло, якое літаральна зіхціць з кожнай літары «л». Дзіўная і рыфмоўка мініяцюры: падаецца, рыфма ў ёй звычайная, але ёю Твардоўскі так па-майстэрску карыстаецца, што сама рыфма выяўляе сэнс.

Форма выяўляе сэнс — вось фундаментальны прынцып Твардоўскага, якога Паэт няўхільна прытрымліваецца ў любой сваёй рэчы: ці аб'ёмнай паэме, ці мініяцюры, як гэтыя геніяльныя радкі, што ўвабралі ў сябе ўвесь трагічны досвед-памяць вайны:

*Я знаю, никакой моей вины*
*В том, что другие не пришли с войны,*
*В том, что они — кто старше, кто моложе —*
*Остались там, и не о том же речь,*
*Что я их мог, но не сумел сберечь,*
*Речь не о том, но всё же, всё же, всё же…*

Твардоўскі не любіў белыя вершы, бо яны пазбаўленыя галоўнага — рыфмы, без якой (за рэдкімі выключэннямі) верш становіцца паўпрозай. Але і ён пакінуў нам узор белага верша, які так плаўна цячэ, што мы не звяртаем увагі на адсутнасць рыфмы:

*Который год мне снится,*
*повторяясь*
*Почти без изменений, этот сон.*
*Как будто я, уже с войны*
*вернувшись,*
*Опять учиться должен*
*в институте*
*И полон вновь школярскою*
*тревогой,*
*Как зазубрить лежалые науки.*
*И страшно мне и горько*
*осрамиться*
*В той юности, моей второй*
*иль третьей.*

Яго маладосць — другая, трэцяя і апошняя, перадсмяротная — была азмрочаная неадступным болем: у першай маладосці ў абкаме кампартыі яго прымусілі адмовіцца ад бацькі, «кулака», як там лічылі, кіруючыся сталінскім азначэннем гэтага паняцця, — інакш шлях у паэзію (а без яе юнак пазбаўляўся сэнсу жыцця) яму будзе перакрыты.

Твардоўскі жыў з гэтым болем да апошніх дзён. І нават калі была напісаная паэма-пакаянне «Па праве памяці», боль гэты не адпусціў яго сэрца, — брэжнеўска-суслаўскі рэжым, прамы спадчыннік сталінскага культу, забараніў публікацыю вялікага твора Твардоўскага, у якім ён так сказаў аб «бацьку народаў», як ні да яго, ні пасля яго не сказаў ніхто.

…Прайшлі гады.

Час усё расставіў на свае месцы. Прыстасаванцы — і ўладныя, і каляўладныя — сыйшлі ў нябыт.

І, нібы развітваючыся з імі, ён паставіў ім, за паўтара гады да смерці, палітычны помнік — забойчы верш, які цытую тут цалкам:

*Маркс, Энгельс, Ленин, знать бы вам*
*В посмертном вашем чине,*
*Каким учёным головам*
*Мы вас препоручили.*
*Вам вкупе слава и почёт,*
*Да и поодиночке,*
*А что писали — на учёт*
*И под контроль до строчки.*
*Ни шагу нам ступить без вас,*
*Но ваших целей ради*
*За вами нужен глаз до глаз,*
*По обстановке глядя.*
*И ухо надобно востро*
*Держать — при вас известно:*
*Ведь что уместно на бюро,*
*Зачем же повсеместно.*
*Ведь вы для красного словца,*
*В избытке увлеченья*
*Верны порой не до конца*
*И своему ученью.*
*Вас мягко Сталин поправлял,*
*Того вам было мало.*
*Учтите, взялся за штурвал*
*Небесный житель Мао.*

Так, усе яны адышлі ў нябыт, а Твардоўскі на небасхіле нашай Паэзіі — побач з Пушкіным — зіхціць зоркай першай велічыні.

І калі Марына Цвятаева, гаворачы пра творчасць Маякоўскага як пра «першага паэта мас», напісала, што «азірацца на Маякоўскага нам, а можа быць, і нашым унукам, давядзецца не назад, а наперад», то — дадам ад сябе — нам трэба азірацца не назад, а наперад на Аляксандра Трыфанавіча Твардоўскага як да першага і апошняга народнага Паэта дваццатага стагоддзя.

ВЕРШЫ

# У ЖОРНАХ ВЕЧНАСЦІ

Міхась БАШУРА



## Малюнак

*Глядзі, малюнак які*
*я пальцам малюю на шкле.*
*Колам абазначыў сусвет.*
*Я — кропка, што з краю,*
*кропка за колам.*
*Я адрынуў сусвет,*
*ці сусвет адрынуў мяне?*
*Узаемна!*
*Кропка — таксама сусвет.*
*Сусвет не церпіць канкурэнцыі.*
*Але ён не разумее,*
*што кропкі — гэта кроў у яго жылах.*
*Без кропак — ён мёртвы.*
*Кропкі — гэта фарбы.*
*Сусвет выштурхоўвае кропкі*
*і губляе колер…*
*Я вярнуся.*
*Я абавязкова вярнуся!*
*I расфарбую сусвет!*

21.08.2010
Жодзіна

## Снег у сне, ці сонны снег, сон у снезе, ці снежны сон

*Снег, снег, снег,*
*снег —*
*Ляжыць навокал брудны*
*снег.*
*Снег, снег, снег...*
*след —*
*На чорным снезе белы*
*след.*
*Снег, снег, снег...*
*смех —*
*На вушы ціснe злосны*
*смех.*
*Снег, снег, снег...*
*стогн —*
*Душу шматкуе сіплы*
*стогн.*
*Снег, снег, снег...*
*слон —*
*На стол падобны руды*
*слон.*
*Снег, снег, снег...*
*сон —*
*Рыпучы снег засыпаў*
*сон.*

## Агонія

*Абсыпанае попелам радыяцыі,*
*Усё ў азонавых дзірках,*
*Дзіка смяецца неба*
*Бяззубай усмешкай нябожчыка.*
*Жалезным поступам крочыць*
*Жудасная пачвара індустрыялізацыі,*
*Рагоча, скрыгоча, губляе*
*Кроплі атрутнай сліны...*
*У бетонным выскале шчэрыцца*
*Брудна-шэрая урбанізацыя...*
*Наступаюць за ёю следам*
*Ненасытная капіталізацыя,*
*Дубінагаловая абалванізацыя,*
*Стоаблічная чалавека-утылізацыя...*

***

*Дом —*
*гэта не*
*дом —*
*гэта яблык.*
*Яблык —*
*гэта дом*
*чарвякоў.*

*Цікава,*
*што адчуваюць*
*яны,*
*калі нехта*
*з'ядае іх дом?*
*Яблык — гэта не яблык…*

## Лагізмы

***

*Акварыум —*
*аква —*
*вада —*
*ква-ква —*
*зялёная жабка —*
*шкляная турма.*

***

*Бурбалка —*
*булбатка —*
*буркатня —*
*бурчаць —*
*бурліць —*
*бухторыць —*
*бухаць —*
*бухаць —*
*бутэлька.*

***

*Голас —*
*голасна —*
*галасіць —*
*галасавы —*
*галасаваць —*
*галаснуць —*
*скалыхнуць*
*паветра.*

## Curriculum vitae, альбо Гульня ў жыццё

*Старажытны грэк —*
*Адыёзная асоба,*
*Лічыў, што чалавек —*
*Абгрызены аловак,*
*У жорнах Вечнасці*
*Не варты ні на што.*

*Лічыў: жыццё —*
*Азартная гульня,*
*З якой патрэбна*
*Змыцца ў час.*
*Цыянід трымаў*
*На ўсялякі выпадак —*
*Рыхтаваў свой Exit...*

*Давесці думку да канца*
*Ён ледзь паспеў —*
*Бястварны кат*
*Сякеру доўга*
*Трымаць не змог.*

*Ён быў вандроўнікам —*
*Лічыўся валацугам.*
*Патрапіў на паліцы*
*Прыватных бібліятэк.*

## Рацыяналізатар

*Ён мае рацыю,*
*Казалі ўсе.*
*Рацыяналізатар,*
*Рамантык,*
*На крумкача падобны,*
*Збіраўся*
*Замест цырка*
*Лазню збудаваць.*

*Авантурыст,*
*Бухгалтар па натуры,*
*Прыход не разлічыў,*
*Патрапіў пад расход.*

## Стойкі алавяны ваяка

*Цынік,*
*Батанік,*
*Улюбёнец жанчын,*
*Падковы сківіцай ламаў,*
*Нічога не саромеўся,*
*Ніколі не здаваўся,*
*Як шпала, прамы,*
*Ішоў напралом*
*Пад кулі, электрычкі, абцасы.*

*Згарэў,*
*Зніякавеў,*
*Сумеўся*
*I зламаўся*
*У барацьбе з адной.*

*Гусар,*
*Ваяка,*
*Самурай…*
*Кішэнным стаў,*
*Марыянеткай,*
*Маленькай кропляй волава.*

***

*Шумяць намоклыя лісты*
*На дрэвах сонных,*
*Прыпаў вясенні дождж густы*
*Да шыб ваконных.*

*Ад сонца дзённага астыў*
*Асфальт гарачы.*
*Я за сабой спаліў масты*
*Ўсе без астачы.*

*Гараць няшчырасці лісты*
*Ў агні пякучым,*
*Ды застанешся ў сэрцы ты*
*Тугой балючай.*

***

*Вецер...*
*Вечар...*
*Сонны млын*
*разганяе чары ночы.*
*А яна па небе крочыць*
*ціхім поступам дзявочым.*
*Дочку-Сонца спаць паклала,*
*сына-Месяца пазвала*
*замяніць сястру на варце.*

*Вецер...*
*Вечар...*
*Сонны млын*
*вечарніц на баль склікае —*
*іх навокал шмат блукае,*
*маячком святляк бліскае.*
*У густой начной сінечы*
*гойдаецца голас нечы:*
*«Будзе сёння тут вяселле!»*

*Вецер...*
*Вечар...*
*Сонны млын...*

## Імёны

*За вакном рэстарана-вагона*
*Кіламетры дратоў тэлеграфных*
*Намотала жыццёвае кола.*
*Колькі лёсам мяне пакідала,*
*Колькі станцый мінуў?*
*Незлічона!*
*За плячыма — ад'езды, прыпынкі...*
*У вачах — развітанні, сустрэчы...*
*Помню боль і чыесьці абдымкі.*
*Помню слёзы і погляд нечы...*
*Твары,*
*Рукі,*
*Усмешкі,*
*Выскалы...*
*I імёны, імёны, імёны...*
*Сотні тысячаў імёнаў*
*Прамільгнулі і згаслі.*
*У свядомасці след іх застаўся,*
*Як сон, неістотны.*
*Помню дзесяць імёнаў —*
*Тваё сярод іх.*
*I ўсяго толькі?*
*Мне болей не трэба.*
*Дзеля іх я жыву.*
*Дзеля іх я...*
*Помню...*
*Званок.*
*Ужо трэці.*
*Аддаляецца ціхі прыстанак.*
*За плячыма — сонца садзіцца,*
*У вачах — нараджаецца месяц.*
*На душы — неспакой і чаканне,*
*А ў сэрцы — надзея і вера.*
*Я спынюся нарэшце*
*Сярод неба шырокага.*
*Я ўспомню*
*Адзінокае нешта і важнае.*
*Я вярнуся*
*Травеньскім вечарам*
*Да знічкі тваёй.*

## Котка

*Ты ўмееш чакаць.*
*Я ўбачыў, як ты чакаеш,*
*і зразумеў, што загінуў.*
*Мы сустрэліся нарэшце,*
*але ты вострыш кіпцюры*
*і казычаш мне спіну.*
*Ты пачала гульню.*
*Я нават не супраціўляюся —*
*у мяне няма ніводнага шанца.*
*Я бачыў сябе паляўнічым,*
*але табе ўсё роўна,*
*кім уяўляе сябе*
*твая ахвяра.*

***

*Па халодным асфальце ганяе*
*Адзінотны самотнік апалае лісце,*
*Падымае, віхурыць, кідае ў твар*
*Дзяўчыне ў жоўтым плашчы.*

*Схамянецца, ўсміхнецца і зноў засумуе*
*Дзяўчына ў жоўтым плашчы.*
*Восень...*

## Снег

*Павязкай марлевай на дол,*
*скалечаны людзьмі,*
*кладзецца першы снег.*
*Ды раны рваныя Зямлі*
*эпохі НТР*
*схаваць не здолеў ён:*
*крывава-хлюпкія дарогі,*
*як шрамы бізуноў жалезных,*
*а на іскрыстай прасціне —*
*сляды дыванна-пыльных бітваў.*
*Да неба цягнуцца з мальбою*
*іржавых труб*
*пакручаныя рукі,*
*на белым снезе*
*мерзнуць галубы,*
*як слёзы...*

***

*Каханне —*
*гэта рваныя*
*шрамы*
*чырвоным*
*алоўкам*
*на шматку*
*паперы*
*за хвіліну*
*да электрычнага*
*крэсла.*

▸ **БЫЛІЦА**

# ГІСТАРЫЧНАЕ ПЫТАННЕ

**Мікола ІЛЬЮЧЫК**



Мікола Ільючык нарадзіўся ў 1966 годзе ў вёсцы Багданаўка Лунінецкага раёна. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Аўтар зборнікаў вершаў «Дзе жывое душа», «Шматкроп'е кропель», зборніка прозы «Роспач і надзея».

У 2008 годзе быў прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Ля вясковай крамы заўсёды людна. Пакупнікі — гэта кантынгент пераменны. Але ёсць і такія, для каго знаходзіцца каля гандлёвай кропкі стала амаль абавязковым. Сярод заўсёднікаў і тыя, хто збірае дробныя грошы, не саромеючыся прасіць кожнага стрэчнага: «Дай сто рублёў, крыху не хапае». Прычым, гэтыя словы вымаўляюцца нават тады, калі ў кішэні зусім нічога яшчэ няма. Пара гадзін стаяння — і на бутэльку «бырла» назбіраецца. Калі пашчасціць, то не толькі на «дзіцячую» 0,5, але і на «дарослую» 0,7.

На вясковай «тусоўцы» абавязковая прысутнасць «арыстакратаў». Яны купляюць пляшку віна і мінімум закусі. Абавязкова — пластыкавы аднаразовы кілішак. Нетаропка, смакуючы, пацягваюць «віно» і разважаюць пра палітыку альбо аб чым-небудзь узнёслым. Гэтыя прызвычаіліся не падымаць нічога цяжэйшага за шклянку і да любой працы ставяцца з непрыхаванай пагардаю.

Апошнім часам там можна заўважыць і маладых хлопцаў, амаль падлеткаў. Ім вельмі хочацца хутчэй далучыцца да «сапраўднага дарослага жыцця». Гэтым больш даспадобы прадукцыя айчынных бровараў. Смокчуць піва з пластыкавых бутэлек і глядзяць на белы свет закаламучаным абыякавым позіркам.

Важныя жыццёвыя пытанні маглі вырашацца ля самой крамы ці ў старым садку побач, на пакінутай сядзібе…

Сярод сталых наведвальнікаў крамы ўсё часцей стаў з'яўляцца Кастусёк. Яму б унукаў ці нават праўнукаў люляць. Дык не. Цягнула да людзей, да грамады. Старога чалавека ў вёсцы звалі па-дзіцячы, ці то ласкава, ці то зневажальна — Кастусёк. Хоць даўно пара яму было звацца Канстанцінам Іванавічам.

Невялічкага росту. Шапка кліночкамі яшчэ ніжэй прыгінала яго да зямлі. У руцэ абавязкова кіёчак. Адпаведна абставінам, Кастусёк мог на яго абапірацца пры хадзе, а мог проста несці ў руцэ ці пад рукой. Мог кульгаць, а мог ісці і не кульгаючы. Накульгваць мог як на левую, так і на правую нагу. Тут ужо ніякай заканамернасці ніхто не заўважаў. Як кажуць, магчымыя варыянты… Абавязковым аксэсуарам у Кастуськовым гардэробе былі медалі на зялёным пінжаку, а з пінжаком Кастусёк не расставаўся ніколі. Сапраўдные «асарці» бразгацела на грудзях: юбілейныя медалі да розных угодкаў Перамогі, некалькі працоўных узнагародаў, сярод якіх «Ударнік пяцігодкі», і нават розныя значкі на ваенную тэматыку.

Кастусёк — ветэран. Хоць усе ведалі: на фронце ніколі не быў. Казалі, што падлеткам пасвіў скаціну, што трымалі партызаны ў далёкіх урочышчах. На паросплых лесам ды хмызам выспах сярод непралазных балотаў невялічкага расточку хлапчук, што меў ці то імя, ці то мянушку Кастусёк, бавіў час сярод чарады каровак ды некалькіх коней.



Photo.ByMedia.Net

Канешне ж, партызанскі атрад — не курорт, і, напэўна, Кастусёк заслужыў некаторыя свае медалі. Хоць было заўважна: на мітынгах, якія ладзіліся з нагоды чарговага Дня Перамогі, ветэраны-франтавікі глядзелі на Кастуська са зняважай і грэбавалі ім. А пасля таго, як у ветэранскай кампаніі паблізу славутай вясковай крамы распіваліся «франтавыя сто грам», Кастуська нават мог агрэць кіем аднавокі і аднаногі ветэран, што прайшоў амаль усю вайну, па мянушцы Артылерыст.

Чарговы выхад Кастуська «на шопінг», як жартаўліва казала яго ўнучка, выдаўся ўдалым. Выходзячы з крамы, Кастусёк сустрэўся з даўнім сваім прыяцелем Хведарам. Яны амаль што аднагодкі. Жылі да вайны на адной вуліцы. Заможная і працавітая сям'я Хведара падтрымлівала абарванца Кастуська то хлебам, то нечым з вопраткі. Прыязнасць і сяброўскія пачуцці захаваліся праз гады, і Кастусёк радасна замахаў кіем:

— Хведзька! Ну, як ты? Даўно не бачыліся!

— О, Кастусёк! Ты ўсё такі ж балбатун! — не хаваючы радасці ад сустрэчы, гучна прамовіў Хведар.

— Слухай, во пляшка ў мяне ёсць. Хадзем у садок, пасядзім, пагамонім…

— Хоць і працы зашмат, але ж хадзем, — адразу пагадзіўся з Кастуськом сябар.

Паселі на мураву ў садзе пад старой яблыняй. Кастусёк дастаў сцізорык. Адрэзаў хлеба, кавалак кілбасы. Харчы леглі на свежы нумар «СБ». Запаслівы гэты Кастусёк! Усё ў яго з сабой: і сцізорык, і выпіўка з закускай, і нават сурвэтка, няхай сабе і з газеты, і шкляначка — сапраўдная «стограмоўка»…

З лёгкім трэскам павярнуўся вінтавы корак «Беларусі сінявокай», і беленькая забулькала ў шклянку. Выпілі па адной, злёгку прыкусілі. Неўзабаве прапусцілі па наступнай. Кастусёк, надта ж энергічны і без гарэлкі, загаманіў ва ўсю моцу, дапамагаючы сабе жэстыкуляцыяй. Ад нечаканай гаманы ачомаўся хлапец, які адпачываў пад кустом непадалёку. Пераканаўшыся, што гэта ўсяго толькі два дзядзькі прыселі выпіць і ніякай пагрозы для яго нямашака, зноўку распластаўся на зямлі. Пры гэтым адзначыўшы для сябе, што калі старыя сыдуць, трэба забраць бутэльку. Вінтавая…

Раптам Кастусёк, перайшоўшы на шэпт, прапанаваў:

— Хведзька, давай я табе па дружбе дапамагу…

— А што мне дапамагаць? Я і сам яшчэ не знямоглы. Гаспадарка невялікая, нам з Параскай хапае. Калі што, сыны прыедуць, дапамогуць…

— Не, я не аб гэтым. Давай вырашым з табой адно гістарычнае, так бы мовіць, пытанне, давай цябе ветэранам зробім, — яшчэ больш сцішыў голас Кастусёк.

— Якім яшчэ ветэранам? — нічога не ўцяміўшы, перапытаў Хведар.

— Ветэранам вайны. Такім, як я. Гонар, ды і пенсія будзе большая, — аргументаваў сваю прапанову Кастусёк.

— Смяешся? Хопіць кпіць з мяне! Які я ветэран, я ж нарадзіўся ў 37-м, — пакрыўджана запярэчыў Хведар.

— Няважна. Я не нашмат старэйшы за цябе. Але ж партызанам дапамагаў, і даведку мне выдалі аб тым, што быў сувязным партызанскага атрада, — не супакойваўся Кастусёк.

— Сорам перад людзьмі які! На што ты мяне падбіваеш? Хто дасць мне такую даведку? — забубніў пад нос Хведар.

— А зараз і даведка не патрэбная.

— Як гэта?

— Напішам пару паперак: паказанні сведкаў, што ты насамрэч быў у атрадзе. Адну напішу я, другую — Максім Цыбулька з Глінішчаў. Я яму зрабіў пасведчанне ветэрана, дагэтуль не праставіўся, гад… А ты, Хведзька, толькі заяву напішаш. У раён сам усё адвязу.

— Дык што, і Цыбулька ветэран? — здзіўлена спытаў Хведар.

— Так. Напісалі, што быў сувязным у атрадзе, што прыйшоў з Глінішчаў да нас у Паплавы выведаць звесткі аб немцах, што тут атабарыліся. Нават даведку медычную зрабілі, што нямецкая аўчарка яго пакусала тады. Ніжэй спіны шнары засталіся… — скарагаворкаю адказаў Кастусёк.

— Ведаю, што сабака пакусаў яго, толькі не нямецкая і не аўчарка. То быў дварняк дзядзькі Яўхіма з хутара. Кажуць, ледзьве аднялі. Менш трэба па чужых агародах лазіць… На ўвесь азадак адмецінa, на ўсё жыццё, — незадаволена забуркацеў Хведар.

— Ой, хто там разбярэ ўжо: чый сабака, як пакусаў, дзе і за што… Ну, дык што, згодзен? — перапытаў Кастусёк.

— А што скажуць франтавікі? Засмяюць!

— Колькі іх засталося на вёсцы? Алесь Галавач ды Антось Малейчык… Ім ужо не да цябе, ледзьве клываюць.

— Кастусёк, адчапіся, не спакушай, лепей налі яшчэ па адной ды разыдземся па добраму.

— Ну ты і дурань, Хведар. Ты ж вайну памятаеш?

— Памятаю, хоць і малы быў. А немцы дык нават на пастоі ў нас былі.

Ветрык закалыхаў голле яблынькі. Лісце зашапацела, быццам таксама хацела падтрымаць размову.

— Ну вось, напішам, што ты нават шкоду ім якую зрабіў ці выведаў для партызанаў нейкія каштоўныя звесткі. Узнагародзяць! Хто цяпер разбярэ? А ветэраны патрэбныя… Хто будзе моладзі пра вайну распавядаць? Вунь у школу мяне запрашалі. Бухцеў дзеткам пра вайну, пра партызанку…

— А што ты бачыў, седзячы ў лесе ля статку? Аб чым дзецям гаварыў?

— Ці мала па тэлевізары ды ў кінафільмах паказваюць?! Ды і газеты толькі пра гэта і пішуць напярэдадні Дня Перамогі… Тое і гаварыў. Кветкі падарылі, дырэктар потым у кабінеце шклянку паднёс.

— Як быў ты прайдзісветам, Кастусёк, дык і застаўся ім! — Хведар даў зразумець суразмоўцу, што трэба ўжо спыняць гэтую бяседу.

— Няхай сабе і так. Але ж да свята мне, а не табе, новы плот паставілі, сёе-тое ў хаце падправілі. Доктарка дадому прыязджала… Адным словам — клопат аб ветэранах.

— Не, я неяк сам абыдуся… — Хведару захацелася хутчэй скончыць размову і сысці.

— Ты ж сам кажаш, Хведзька, што немцы жылі ў вашай хаце. Значыцца, і вашая сям'я пацярпела ад іх. А няўжо ты ім і сапраўды ніякай шкоды не зрабіў?

— Не, — сцішана адказаў Хведар.

— А чаму?

— Гуляліся са мной яны. Цешыліся з мяне. Нават форму салдацкую пашылі і боцікі. Мабыць, сваіх дзетак узгадвалі, вось і забаўляліся са мною. А цукерак і шакаладу колькі перакаштаваў тады. Потым за ўсё жыццё, мабыць, столькі не давялося з'есці. Не да цукерак было… А ад тых часоў толькі добрыя ўспаміны.

— Хопіць мне ўжо тваіх успамінаў, — запярэчыў Кастусёк, — апошні раз пытаюся: будзеш ветэранам?

— Не! Адчапіся, назола! — цвёрда вымавіў Хведар.

Разам яны падняліся з долу. Кастусёк склаў у торбу свой паходны камплект: шклянку і сцізорык.

— Ну бывай, Хведзька, сустрэнемся!

— Бывай, сустрэнемся, магчыма…

Старыя паклыпалі ў розныя бакі: Хведар да хаты, а ў Кастуська быццам бы засталіся нявырашаныя справы ля крамы…

На недапітую пляшку гарэлкі з-за куста пазіраў змучаны алкаголем маладзён па мянушцы Тхорык. Тхорык і жыў з таго, што збіраў бутэлькі. А тут такое шчасце. Гэтыя старыя недабіткі, мабыць, пасварыліся між сабою і пакінулі не толькі пляшку, а нешта і для яго. Хлапец, хоць у галаве муціла, падняўся, зірнуў у адзін бок, потым у другі… «Ужо не вернуцца, — падумаў пра сябе, — можна ісці да нечаканай здабычы, добра, што пасварыліся старыя. Шанцуе мне сёння»…

Звон медалёў усё больш аддаляўся, і праз нейкае імгненне нічога не было чуваць.

А ля крамы віравала сваё жыццё і вырашаліся нейкія новыя і надта важныя пытанні…

**Ліпень 2010 г.**

ВЕРШЫ

# ЗНАКІ ВОЛІ

Алесь МАСАРЭНКА

## Стольны горад

*Надзённае ў акно сініцай б'еццa
і ў мітусні звычайнай прападае.
Адвеку Менскам горад мой завецца
і новага назову не жадае.*

*Ёсць у паданнях і пра тое звесткі,
як ворагаў Няміга патапляла,
і як бясслаўна ірадаў парэшткі
славянаў сіла ў пазамежжа гнала.*

*Мой горад разбуралі недаверкі,
раскрадвалі святыя рарытэты.
У файным хараստве фасадаў яркіх
прачытваюцца продкаў запаветы.*

*Гісторыя паўторамі багата —
зайздроснікаў амбіцыі не зніклі.
Казыча сэрцы й сёння тарбахватам
архіўны пыл ад скрадзеных рэліквій.*

*Смог вынішчае паркавыя дрэвы,
спякоту правакуе, буралομы.
Экалагічных выбухаў залевы —
тэхнічнай рэвалюцыі сімптомы.*

*Шукае горад выйсце, не блазнуе —
напяты яго нервы аж да звону.
Ён дабрабыт і годнасць гарантуе,
ратуе ад духоўнага палону.*

*Абраны горад нездарма сталіцай —
тут продкаў дух крынічыць дабрынёю.
Мне даўняе і сённяшняе сніцца,
з'яднанае барацьбітоў крывёю.*

**10. 8. 2010**

## Пра мову

*Бы аладку пры голадзе,
я ацэньваю слова...
Не чуваць, каб дзе ў горадзе
была правільнай мова.*

*Нехта плешча трасянкай,
як касу адбівае.
А ў кагосьці балванкай
з рота слэнг вылятае.*

*Ах, народзе-народзе,
мовы роднае збыўся.
У сваім агародзе
ў крапіве заблудзіўся.*

*Б'е сінечаю ў вочы
слова роднае мовы,
але страўнік сірочы
на ўсе здрады гатовы.*

*Скажаш пану па-свойску —
атрымаеш хвіндоса.
Па-расейку, па-польску —
кіне костку з падноса.*

*Круць туды, верць сюды —
галава ідзе кругам.
Ад пустой лебяды —
ні з касой, ні за плугам.*

*І прывык беларус
ублагаць сваіх катаў:
чымся голад — прымус
хай, дарма што і кляты.*

*Не да мовы было,
не да кніг і выгодаў.
Мізарнела сяло,
памірала свабода.*

*Ды адвечнае штосьці
старана наша мае,
і надзея ўсё ж ёсць:
беларус акрыяе!*

*Не маўчы — карыстай
сваё слова, шаноўны:
яно — звонкая сталь,
загартоўкі духоўнай.*

**30.08.2010**

## Крамлёўцам

*Беларусь не памрэ
ад саўковай хваробы,
хоць вятры, што з усходу
і заходу дзьмуць,
намятаюць на шлях
беларускі сугробы,
беспрасветную чыняць
наўкол каламуць.*

*Лёс краіны здаўна
падаецца трагічным —
студзяць мары яе
душы прагных звырод.
Што было тут і ёсць,
ужо стала прывычным.
А як будзе далей —
тое скажа народ.*

*Неадступна, нахабна
лезуць слепнямі ў вочы
«пабрацімы» сумніву
і зла груганы.
Кодла мафіі чорнай
зубамі скрыгоча —
услаўляе фуфло
крывадушнай маны.*

*Кажуць: мы не жылі
самастойна ніколі,
і заможнага быту
нам ужо не дастаць.
І не трэба шукаць
беларускае долі —
лепей раз і навек
расіянамі стаць.*

*Светлафор праваслаўю
зялёны ўключылі:
бог адзіны, то — бачце! —
мы — дзеці яго...
Клікунам у ярмолках
працэс даручылі —
нас ратуюць панове,
але ад каго!?.*

*Перамены наўкол —
паварот да прымусу.
Двухгаловы арол —
крывадзюбы манарх —
заманууўся ўчарніць
светлы лёс беларусу,
які выбіўся ў людзі
й сам сабе гаспадар!*

*Алігархаў крамлёўскіх
пошасць дзікая точыць —
атрымалі нарэшце
ад варот паварот...
Ім уголас сказалі —
адкрыта, у вочы,
што з каленяў устаў
беларускі народ!*

*Ёсць дзяржаўнасць у нас
і палосаў памежжа.
Ёсць законы свае,
як і мова свая.
Нам гадзіннік крамля
боем сэрцы не рэжа,
не замуціць і зрок
злыдняў хіжых гайня.*

**30.08.2010**

## Настраёвае

*Барва восені яркай
чэзне ў беліве студы.
Выпадае ў асадак
вясёлы настрой.*



*Голас ветру падобны
на голас іуды,
а сняжынак палёт —
на ўспалошаны рой.*

*Лістапад прадвяшчае
завірухі, бураны.
Снежань, студзень і люты —
тройка сілавікоў —
сыпле холада соль
на душэўныя раны,
боль якіх не сціхае
ад веку вякоў.*

*Люты — цар завірух
і пякельных марозаў —
захапіў трон уладны
дый прысвоіў няўзнак.
Чыніць свой супрацьў,
віе воўкам пагрозна:
у адстаўку сыходзіць
не хоча ніяк.*

**12.09.2010**

## Знакі

*Гэтай зімняй парой
намяло белых гурбаў.
Ні прайсці, ні праехаць —
заторы паўсюль...
У падвалах бамжы
грэюць спіны ля трубаў,
на сябе нацягнуўшы
з паўдзясятка кашуль.*

*Недзе побач каты
з пацукамі ваююць,
да бамжоў не хінуцца,
бо засмажаць, з'ядуць.
Горад чынна жыве,
людзі рупна працуюць.
На ханыг-апушчэнцаў
з верхатуры плююць.*

*Знак вясны — капяжамі
трызвоніць адліга.
Знак цяпла — вылязаюць
на сонца бамжы.
Сэксу знак — у паўзмроку
на лаўцы чувіха
распластанай пад хахалем
мройна дрыжыць.*

*Прыглядзецца — і знакаў,
бы зорак на небе.
Яны ўсе — як прыкметы,
як лёсу віток...
Хто жыруе ў раскошы,
хто чэзне ў ганебе —
раўнапраўе гвалтуе
зашораны цмок.*

*Лета знак — калі ў рэчцы
зацвітае гарлачык.
І балотных вужоў
ловяць спрытна буслы.
Калі скрушна на ўзлеску
івалга плача,
закаханым вяшчуе
забавныя сны.*

*Ну а з восені знакаў —
людзі дзіву даюцца:
жоўты колер — дабро,
шэры — слота, дажджы.
Знак бяды — калі пройды
з паэтаў смяюцца
і ў Ізраіль з'язджаюць
паўкроўкі жуды.*

*Шчасця знакаў нідзе
я пакуль што не бачыў.
Пэўна, вынес іх бог
за жыцця рубікон.
Знакам волі й няволі
праўду д'ябал пазначыў.*

*...Шлю дурынду за гэта
чалавечы праклён.*

**13.09.2010**

* * *

*Пачынаюць смачнець
на выжарах суніцы.
Грому летняга медзь
па-над лесам звініць.
Высякаюць азон
з туманоў бліскавіцы,
пахкім водарам ён
на расе зіхаціць.*

*З яснай явы сыйшло
хат вясковых сутонне.
Хараство адышло
ў фазу іншую — скон.
Горад памяць набыў —
у гаршках на балконе
геаргіняй расцвіў
зніклых вёсак бутон.*

**23.09.2010**

## Бабіна лета

*Шэрых воблакаў сум,
сонца выбліск рахманы...
Я не збыўся ад дум —
у палон іх забраны.*

*Сівізной павуцін
млее бабіна лета —
стрэмка ў сэрцах мужчын,
песня, што недапета.*

*Лепш не бачыць палёт
серпанціна істужак —
карацее на год
шчасце дзеў-папялушак.*

**29.09.2010**

УСПАМІНЫ

# СТАРОНКІ ПАМЯЦІ

Анатоль КУДРАВЕЦ



…Месца для сяла было выбрана, можа, і не надта прыдатнае, балоцістае, з невялікімі выспамі вышэйшай і сушэйшай зямлі, на якой людзі будаваліся і сяліся, усё болей пашыраючы прастору свайго ўладарання.

Чаму назвалі вёску Аколіца? Відаць, таму што шукаць назву далёка не трэба было. Ледзь не ў кожным раёне Беларусі ёсць вёскі з такой назвай. Праўда, у дадзеным выпадку мелася і свая логіка: вёска была ўбаку ад важных жыццёвых магістраляў, хаця і каля іх, недзе пасярод трохкутніка, створанага гарадамі Мінск–Магілёў–Бабруйск.

Яшчэ на памяці сённяшніх старэйшых людзей раскарчоўвалі дзялянкі ў лесе на вышэйшых мясцінах, каб сеяць проса і каноплі, а каля самых хатаў і па вуліцах узвышаліся шырокія, як сталы, пні некалі магутных дубоў і ялін…

Аселі паны ў гэтых мясцінах з часоў Вялікага Княства Літоўскага.

Кудраўцы з'явіліся тут пазней. Адно вядома дакладна, што яшчэ за прыгонным часам (1861 год) нехта з Карбановічаў выкупіў у падмаскоўнага памешчыка двух братоў Кудрявцевых, прывёз, выдзеліў па некалькі дзесяцінаў прыбалотнай зямлі. Пасяліліся яны недалёка ад пана, паабапал дарогі, што вяла ў Коўбчу, насупраць, можна сказаць, вокны ў вокны.

Як звалі братоў, засталося невядома. З часам Кудрявцевы сталі Кудраўцамі. Відаць, цяжка было мясцовым людзям прамаўляць мудронае нетутэйшае прозвішча. Адзін з братоў быў рослы, другі драбнейшы, меншы, і людзі, каб не блытаць, назвалі аднаго Кудраўцом, другога Кудраўчыкам. Так і пайшлі па ўсёй далейшай лініі паралельна Кудраўцы і Кудраўчыкі, хаця ў дакументах прозвішча заставалася адно — і тыя Кудраўцы, і тыя Кудраўцы.

На аколіцкіх праваслаўна-каталіцкіх могілках у кутку, дзе хавалі Кудраўцоў (Кудраўчыкі займалі свой куток) захаваўся невысокі, пахілены, урослы ў зямлю вострazакруглены шэры камень, на якім выбітыя два словы: Кудравец Анастасія. Дзядзька Мікола казаў, што гэта камень на магіле ягонай бабкі, а нашай прабабкі. Побач з гэтым каменем яшчэ некалькі гадоў таму стаяў высокі, метры ў тры, абымшэлы дубовы крыж. Зноў жа, дзядзька казаў, што стаяў ён на магіле мужа Анастасіі, нашага прадзеда.

Кудраўцы старэйшага пакалення ўсе сыйшлі ў магілу, і сёння даведацца што-небудзь новае ці пацвердзіць усё гэта няма каму. Як помню (а гэта, лічы, семдзясят гадоў), крыж заўсёды быў такі шэры, высахлы, абымшэлы, нібыта час не меў улады над ім. Усё-такі знайшоў уладу — нядаўна зваліў.

Па ўсім, апошні пан Карбановіч быў не з ганарыстых, часам запрашаў беднага суседа Хведара на паляванне і нават да сябе ў дом. Здавалася, так будзе заўсёды. Але нечакана здарылася бяда: ці пастухі праспалі, ці так захацелі, але ў згаданы час панкія коні да чарнаты здратавалі дзедаў азімы клін. Дзед пайшоў да пана з прэтэнзіяй, каб той ці сплаціў, ці адмяніў здратаванае поле на сваё засеянае. Відаць, гаворка праходзіла бурна, бо дбайныя служкі вынеслі дзеда з панскіх пакояў на кулаках. Пакачалі так, што той ледзь дабрыў да сваёй хаты. Паляжаў некалькі дзён, пахаркаў крывёю і памёр. Пан Карбановіч прыйшоў развітацца з суседам, пастаяў у галовах ля дамавіны, выдзеліў на жалобны стол бычка са свайго статку. Дзеду Хведару было сорак гадоў. На руках у ягонай удавы Параскі засталося шасцёра: Аўгіння (1901 год нараджэння), Яўмен (1903), Пятрок (1905), Павел (1907), Паўліна (1909), Мікола (1911). Быў то 1914 год.

Баба Параска была быстрая, рухавая, росту невялічкага, трошкі больш за метр пяцьдзясят, але характар мела дзелавы, актыўны.

Некалькі гадоў малы Павел — мой будучы бацька — летам дапамагаў пастухам пана Карбановіча пасвіць свіней, а зімой вучыўся ў школе. Пасля пачатковай школы, прадаўшы бычка, Параска аддала Паўла вучыцца на шаўца ботаў. У шаўца Павел быў на падхваце: тое падай, тое падрыхтуй — дратву, воск, бярозавае зуб'е… Хаця майстар і не надта кіраваў навукай, маладыя вочы і рукі вучня запаміналі тое, што трэба было ўмець рабіць. Калі праз паўгода майстар ад'ехаў на тыдзень у госці да радні ў Бабруйск, то, вярнуўшыся, убачыў свайго вучня ў новых, самім пашытых ботах. Майстар сказаў здзець боты, пакруціў іх у руках, павярцеў, паглядзеў на маладога майстра. «Ну што ж, даражэнькі, бачу: табе няма чаго рабіць у мяне. Што трэба, ты ўмееш. А астатняе — у Божых і тваіх руках».

Малады майстар вярнуўся дамоў. Яму было трошкі болей за трынаццаць. Пятрок працаваў у Бабруйску, неспакойны Яўмен ваяваў у Чырвонай арміі. Уся гаспадарка была на руках жанчын: мамы Параскі, дзяўчат Аўгінні і Паўліны. Ды яшчэ малы Міколка…

Як птушку да гнязда, як жабу да карча, цягне чалавека ўспомніць сябе малым, і перш за ўсё — з чаго ж усё пачыналася, як табе адкрываўся гэты свет.

Самае першае, што засталося ў маёй памяці: лета, акно ад вуліцы



вынята, а на падаконніку, на ўсю яго шырыню, ляжыць маснічына — вузейшы канец ля парога, шырэйшы — на падаконніку. Насцілаюць падлогу, дошкі на ўсю даўжыню хаты, і занесці іх усярэдзіну можна толькі праз акно. Сонца збіраецца заходзіць, і чыста адгабляваная залацістая маснічына з магутнай яліны аж іскрыцца пад яго касымі праменнямі. Яліна сапраўды была магутная, на чатыры ці пяць таўстых дошак, якіх, калі паклалі адну ля адной, хапіла на добрую трэць падлогі. Пазней, ужо дарослы, я спрабаваў даведацца ў мамы, у якіх гадах, калі гэта было. Яна сказала, што я не магу гэтага помніць: калі слалі падлогу, мне было паўтары гады. «Не магу», але ж я помню: лета, сонца збіраецца заходзіць, вынятае акно, а на падаконніку шырачэзная залацістая маснічына…

Помніцца яшчэ такое: вясна, я на падаконніку таго ж акна, уторкнуўшыся носам у шыбіну. Па вуліцы, па яе сярэдзіне, ідзе трактар на жалезным колавым ходу, арэ вуліцу пад дарогу. За ім, як вараннё, бягуць дзеці. Мне таксама хочацца туды да ўсіх, але я не магу: я малы, на дзве трэці акна, у мяне нават штонікаў няма, адно доўгая, ніжэй каленяў, кашуля. Колькі мне — два, тры гады, — не ведаю…

І зноў вясна. Пасля менінгіту я пайшоў на папраўку, і мяне, захутанага ў посцілку, мама вынесла на ганак, пасадзіла ля сцяны. Добра грэе сонца, у небе заліваюцца жаўранкі, ля хлява на дрывотні грабуцца ў трэсках куры з пеўнем. Мне хочацца расхінуць гэтую посцілку і пагнацца за імі, але я вельмі слабы, ногі калоцяцца, і двор мокры. Але жыццё кліча і радуе…

Восень, дзеці пасвяць коней. У нас кабыла — армія забрала нармальнага каня, а пакінула дурную кабылу з перарэзанымі на нагах жыламі. Пацыху з кустоў яна забрыла ў жыта. Разумны чалавек адвярнуў бы… голасам, крыкам. А я — дубцом па нагах, раз, другі. Яна падкінула задам і капытом мне ў лоб… Я і зваліўся. Трохі паляжаў, ачнуўся, убачыў, што на ілбе кроў і на руцэ кроў, і з голасам пайшоў дамоў…

Пачатак вайны ўспамінаецца нечаканасцю, няпэўнасцю. Мужыкі ходзяць па сяле і месца сабе не знаходзяць. То там збяруцца, то там. Шу-шу, шу-шу… Малых хлапцоў не падпускаюць… А тым хочацца ўсё ведаць, усё чуць.

Пасля мужыкі раптам папрападалі. Тут былі, а тут іх не стала. І Санькоў, і Цэдрыкаў, і Ізмераў, і Кудраўцоў. Каго прызваў ваенкамат, хто сам прыхаваўся. Дайшлі чуткі, што многіх з прызваных ваенкаматам немцы загрэблі ў лагер пад Магілёвам. Бабы пацягнуліся туды. З торбамі, з яйкамі, з салам… Жах што тварылася там. Мужыкі гінулі з голаду, з холаду, ад паносаў пасля вараных буракоў. Трапілі туды і мае дзядзькі Пятрок і Мікола. Цётка Поля, Міколава жонка, ездзіла туды. Вярнуўшыся, яна расказвала пра дрыжачыя рукі, якія цягнуліся праз сетку да кожнага кавалачка хлеба…

Чаму я пачаў пісаць? Відаць, таму, што не пісаць не мог. Калі б сур'ёзна перабіла нешта іншае — праца з тапаром у руках, ці матэматычныя практыкаванні, ці яшчэ што, — калі б усё гэта было мацнейшае і захапіла ўсяго, можа б, і не пісаў. Хаця не, усё роўна пісаў бы.

Калі чалавека недасведчанага, далёкага ад тэхнікі, прывесці да кучы металу, розных дэталяў і механізмаў і сказаць, што гэта машына і для таго, каб паехаць на ёй, патрэбна зусім нямногае: сабраць у пэўнай паслядоўнасці, звінціць адны часткі з другімі, спаяць, паставіць на колы, «абуць» колы ў гуму, заправіць бак бензінам — гэта значыць, зрабіць тое, каб кожная з гэтых дэталяў увайшла ў звязку з астатнімі і ўсе яны разам зажылі як адзіны жывы арганізм, — дык вось, калі гэта сказаць чалавеку недасведчанаму ў тэхніцы, ён ніколі не паверыць, што на гэтай кучы металу можна паехаць.

Але калі сказаць вопытнаму механіку аўтагаража, варта яму кінуць вокам на ўсю гэтую груду механізмаў, каб ва ўяўленні ягоным паўстала машына — прыгожая, лёгкая, паслухмяная, якія тысячамі бегаюць і па нашым Мінску, і па зямлі ўвогуле, ён не толькі возьмецца за работу, а і давядзе яе да канца, і паедзе на той машыне.

У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра неабходнасць фантазіі нават дзеля таго, каб з гатовых дэталяў, блокаў сабраць машыну. Тым болей яна патрэбна пісьменніку для таго, каб з неіснуючых рэальна частачак слоў сваіх пошукаў сканструяваць, прыдумаць, выдумаць, сабраць нешта такое, што людзі чыталі б з цікавасцю і ўспрымалі як рэальна існуючы свет…

А з чаго ўсё пачыналася?.. Можа, з гэтага?..

Суботні зімовы вечар. У хаце распаленая да чырвоных бакоў жалезная печка — сушыць нядаўна памытую падлогу. Смалновы пах чыста выскабленых падсохлых маснічын. Ля сцяны, на шырокай канапе — бацька з дзядзькам Міколам. Кураць, ціха гавораць. Ні мамы, ні дзяўчат няма — яны пабеглі ў лазню.

Пад столлю над сталом вісіць лямпа. Паставіўшы кнігу так, каб было лепш відно, стоячы перад сталом, я чытаю «Дрыгву». Стоячы, бо так, па прычыне малога росту, я вышэйшы. Чытаю ўголас, каб чулі бацька і дзядзька Мікола. «Дрыгву» ў другім класе яшчэ не праходзяць, гэта кніга маёй старэйшай сястры Мані, я ўзяў яе паглядзець. Пачаў чытаць і ўжо не мог адкласці. І мне хочацца, каб і бацька, і дзядзька чулі, пра што тут напісана і напісана так хораша.

«Спакойна і павольна, як у зачараваным сне, утуліўшыся ў балоты, нясе Прыпяць сухадоламу Дняпру сваю багатую даніну…»

Чытаю, заварожаны магіяй слоў, яны ліюцца плаўна і вольна, нібы нараджаюцца ўва мне самім, нібы гэта я сам усё так складна прыдумаў. Закалыханы сваім голасам, не адразу заўважаю, што перастаў разумець, пра што чытаю. Словы перарастаюць у музыку, і ўжо здаецца, што не маё сэрца ідзе ўслед за пісьменнікам, а ён сам ідзе ўслед за рухам маёй душы і гэтага вечара, і гэтай цішыні, і гэтай цёплай вымытай і падсушанай падлогі…

Спахопліваюся, бо бачу, што бацька з дзядзькам перасталі гаварыць, слухаюць мяне. Гэтае адкрыццё перарывае чытанне, я пазіраю на іх. І тады дзядзька, ускінуўшы галавой, пачынае сам:

*Дрэнна маё жыццё,*
*Усё ідзе не ў лад:*
*Лезу я наперад —*
*Асадзі назад…*


Photo.ByMedia.Net

Гэты знерваваны, успыльчывы, пашчыпаны фінскай і гэтай войнамі чалавек, ён і цяпер, праз паўтара гады пасля таго, як яго прывезла дамоў шпітальная сястра, прыйшоў з мыліцамі: зноў адкрылася рана на назе. Але як ён чытае?.. Ён не чытае, а расказвае пра сябе. Гэта ў яго, куды ні ткніся, «асадзі назад». Гэта ён і ёсць той мужык, сын бядоты, які недаесць і недаспіць…

І гэта праўда, так і было. Яго бацька, і бацька майго бацькі, да смерці збіты наймітамі пана Карбановіча, памёр у сорак гадоў. Баба Параска засталася адна, на руках шасцёра дзяцей. І яны вымушаны былі пайсці на паклон да таго ж пана Карбановіча, прасіцца, каб узяў на працу, каго парабкам, каго пастушком…

Засталіся жывыя, павырасталі, пажаніліся, разбудаваліся ў Аколіцы на шэсць двароў…

Недзе неўзабаве за гэтым вечарам здарыўся ў Аколіцы, на нашым пасёлку, выпадак, які абурыў усіх. Знайшоўся ў сяле чалавек, які ноччу, калі гаспадар дома, наш сусед, быў у ад'ездзе, залез на гарышча ягонай хаты і адкруціў галовы дзвюм курыцам. Іх і было толькі дзве ў беднай Шварцавай хаце! Разам з курамі злодзей прыхапіў сухога ліпавага палосся на лапці і трохі высушанай табакі — усё гэта вісела там жа, на гарышчы. Палоссе — гэта не страшна, нават табаку можна было б даравацъ, а дзве курыцы — гэта ўжо было зладзейства і па ваенным часе не малое. Па маштабе галодных пасляваенных гадоў такое нельга было пакінуць беспакарана, або зрабіць выгляд, быццам нічога не здарылася, хоць злодзея і не злавілі на месцы злачынства.

Пагаворвалі, што тое зладзейства — справа рук аднаго чалавека, зноў жа, недалёкага нашага суседа Марушкевіча: гэта мог зрабіць толькі ён. Тым болей, што той жа ноччу гаспадыня скрадзеных курэй, якая трошкі запозднена выскачыла з хаты, пайшла па следзе, і след прывёў да хаты гэтага суседа, і праз шчыліну занавешанага акна яна бачыла, як сусед скуб птушак. Але не ўзяў за руку — не кажы, што злодзей. Так гаварылі дарослыя.

Дзеці пра ўсё гэта думалі пасвойму, з дзіцячым максімалізмам. Тое, пра што дарослыя ведалі, але не хацелі гаварыць адкрыта, для нас было элементарнай аксіёмай: пра зло трэба гаварыць на ўвесь голас, і зло павінна быць пакарана. Чаго маўчаць? Пра гэта павінны ўсе ведаць.

Словам, у грудзях маіх адбыўся нейкі зрух, штуршок, які і павёў маю руку з ручкай па паперы. За нейкія хвіліны быў напісаны вершык пра тое, як хлопцы, мае равеснікі Пеця з Віталем, кніжкі чытаюць, а нехта на гарышчы закурыць шукае і г.д. І ўсё гэта з канкрэтнымі дэталямі, імем, прозвішчам… Сваёй паэтычнай удачай я падзяліўся з сястрой Галяй і лёг спакойна спаць. Якое ж было маё здзіўленне, калі назаўтра я ўбачыў, што слава мая як паэта выйшла за межы нашага двара і разышлася па пасёлку. Хлапчукі вывучылі вершык на памяць і чыталі яго ўголас усюды і ўсім, а асабліва тады, калі паблізу паказваўся той незадачлівы курыны забойца.

Само сабой зразумела, што інкогніта аўтара было раскрыта. Спачатку гэта мяне спалохала, але пасля, калі я ўбачыў, што дома ў нас усё ціха, я супакоіўся і нават заганарыўся. Слава — магутны рухавік, хоць і трымалася яна не столькі на нейкай мастацкай вартасці вершыка (якая там вартасць!), колькі на адкрытай, легальнай форме выказвання праўды.

На гэтым можна было б і спыніць расказ пра мой паэтычны дэбют, калі б ён не меў непажаданага для мяне працягу…

А было так. Другі сусед Юрчонак Хведар, ягоная хата была за хатай цёткі Аўгінні, тапіў лазню. Дзень быў суботні, зіма, асаблівай работы ў людзей не было, і яны папрыходзілі ў лазню раней, чым яна была гатова. Чакалі ў хаце: жанчыны ў адной палавіне, мужчыны за дзвюхстворкавымі дзвярыма ў другой.

Зайшоў у хату і я. І як толькі зайшоў у першую палавіну, на мяне адразу накінуліся жанчыны з просьбай: прачытай свой вершык. Было адчуванне няёмкасці ад усіхнай увагі, але бацькі славы ўжо рабілі ўва мне сваю разбуральную работу. І я тут жа, ля парога, прачытаў вершык, прачытаў так, як трэба было б чытаць, калі б я стаяў на сцэне, а ў зале было не меней, як чалавек сто. Крычаў на ўсю хату і сам з задавальненнем слухаў свой голас.

Не паспеў я скончыць чытанне, як раптам рэзка расчыніліся дзверы з другой палавіны хаты і адтуль разлявана вылецеў мой бацька. Ён рашучым крокам падышоў да мяне, моўчкі ўзяў за вуха і, не выпускаючы яго з сваіх жалезных пальцаў, вывеў на вуліцу, паказаўшы каленам бок, у якім была наша хата. Было крыўдна да слёз, былі і слёзы. Я пайшоў дамоў. Можна лічыць, што гэта было маё першае публічнае выступленне і мой першы зароблены ганарар.

Аказваецца, у другой палавіне хаты мужчыны за сталом гулялі ў карты. Болей таго, Марушкевіч, пра каго і быў мой вершык, быў бацькавым напарнікам па картах, і яшчэ горай — яны прайгравалі. А тут за дзвярыма літаратурны канцэрт з вершамі пра тое, «як убачыла Сабіна, што закраталась драбіна, выскачыла яна ў двор, і пачаўся ў іх спор: — Ты чаго тут, злодзей, ходзіш? Ты курэй са свету зводзіш…»

Школа ў Аколіцы адкрылася ў 44-м, у год вызвалення. Недзе ўслед за тым, як па ўтравелай зялёнай вуліцы сяла прайшлі стомленыя салдаты-вызваліцелі. Іх і не шмат было. Сяло ляжала ўбаку ад бойкіх дарог, і праход войскаў хутчэй меў сімвалічны сэнс. Нехта з вышэйшага начальства мудра рашыў, што людзі, стомленыя чаканнем, павінны на свае вочы пабачыць вызваліцеляў, каб канчаткова паверыць, што вайна хоць і не скончылася, але адкацілася ад іх.

Чырвонаармейцаў чакалі два дні. Мы залазілі на хаты і хлявы, выглядаючы, ці скора пакажуцца чырвоныя, а іх усё не было. Аб'явіліся яны пад вечар, запыленыя, стомленыя, але спакойныя і таксама ўпэўнена-шчаслівыя. Адразу, як па нейчай камандзе, на вуліцу павыносілі сталы, на сталах былі хлеб і… графіны з самагонкай — тое, чым людзі маглі сустрэць і пачаставаць вызваліцеляў. Гарэлку салдаты не пілі, прасілі вады, і пабылі, можа, з паўгадзіны, адсыпаючы ад сваіх салдацкіх запасаў цукрупяску кожнаму малому. Сыпалі на скібку хлеба, а ў каго не было хлеба, насыпалі ў шматкі паперы, дастаючы іх з той жа салдацкай торбы.

У школу спачатку перапісалі ўсіх вучняў, а іх набралася шмат, асабліва пераросткаў, выгадаваных чатырма гадамі ваеннага жыцця. Маларослы нават на свае няпоўныя сем гадоў, я выглядаў дзіцём побач з 10–11–12-гадовымі дзецюкамі, не гаворачы пра тых, хто пачынаў вучыцца да вайны, а цяпер павінен быў працягваць вучобу ў другім, трэцім ці чацвёртым класах. Але імкненне не адстаць ад «усіх», як інстынкт калектыўнай бяспекі, пасадзіла мяне на школьную лаву побач з гэтымі пераросткамі.

Перапісвалі ў хаце цёткі Аўгінні. Я з мамай сядзеў на шырокай лаве, мае босыя ногі не даставалі да падлогі, і мне ўвесь час хацелася ўзяць сваю нагу ў руку. Мама брала тую маю руку сваёй рукой і апускала пад лаву: што ты робіш, у школе так няможна. Я супакойваўся, але праз нейкі час нага зноў была ў маёй руцэ.

Так я стаў вучнем першага класа Аколіцкай пачатковай школы. Размяшчалася яна ў дзвюх хатах трэцяй брыгады, гэта далёка, за ракой…

Помніцца некалькі школьных момантаў, якія і цяпер, праз столькі гадоў, прымушаюць унутрана чырванець пры адным успаміне пра іх. Але…

Зіма. Да позняга часу я загуляўся ў маіх браценікаў — Міколавых Вовы і Шуры. Здаецца, гулялі ў саматробныя шашкі — драўляныя кубікі, расфарбаваныя ў два колеры, на фанерцы, разлінаванай на квадраты, як на сапраўднай шашачнай дошцы. Дзядзька Міхола быў у шпіталі, а цётка Поля працавала ў калгасе кладаўшчыцай. У яе ў руках я і ўбачыў хімічны аловак, нават не аловак — меншую палову яго. Цётка Поля складала нейкую ведамасць, і лічбы і літары такім зайздросным залацістым бляскам адсвечвалі на паперы, што калі яна некуды выйшла, я ціхенька зацісну гэты аловак у жменю і шмыгнуў за дзверы.

Вярнуўшыся дамоў, я не мог не паспрабаваць пісаць сам і радаваўся, што літары гэтак жа залаціста адсвечваюць і на маёй паперы. Аловак убачыла мама. «Дзе ты ўзяў яго?» — было заканамернае пытанне, на што я адказаў бліжэйшае: «Знайшоў». Дзе і як знайшоў, ніхто дапытвацца не стаў. З тым я і заснуў.

Па пасляваенным часе аловак, ды яшчэ хімічны, быў такой рэдкасцю, што проста так «знайсці» яго было, відаць, цяжэй, чым знайсці залаты самародак дзе-небудзь у Кландайку ці Магадане ў самую залатаносную пару.

Прачнуўся на досвітку ад галасоў. Гарыць лямпа. У хаце цётка Поля. Мама падыходзіць да ложка, дзе мы спім з малодшым братам Жоржам, бярэ мяне за плячук, будзіць: «Сынок, прыйшла цётка Поля, яна ўчора згубіла аловак… Можа, ты бачыў яго? Ёй у кладоўку трэба ісці, накладныя выпісваць…»

Можа, бачыў… Просценькая мацярынская дыпламатыя. Куды тут дзенешся.

Аловак давялося аддаць. Можа, з тыдзень я не паказваў носу ў цётчыну хату, пакуль аднойчы Вова не сказаў: «Пайшлі да нас, пагуляем у шашкі. Не бойся, мама пра аловак і не ўспамінае».

І праўда, і тады, і пазней цётка Поля ні разу ні словам, ні намёкам не напомніла пра той выпадак, пра тое маё «знайшоў».

Цяжка сказаць, што больш уздзейнічае на чалавека: акружаючыя людзі ці акаляючае асяроддзе. Мінаюць гады, чалавек з'язджае з месца, дзе прайшло ягонае дзяцінства, адступаюць у цень, быццам размываюцца ў часе, постаці людзей, з якімі ён жыў, а зямля, мясціны тыя, па якіх ён хадзіў, застаюцца, як жывыя. Нават болей, і іх можа ўжо не быць, час можа знішчыць і іх, але памяць захоўвае іх з такой беражлівасцю, быццам гэта і ёсць тое адзінае, вечнае, што павінна застацца.

Вось загаварыў пра школу, пра мосцік, пра раку Гарадзечанку тых, 1944–1945 гадоў… Даўно няма ўжо і школы той, час не пашкадаваў… Няма і млына таго, перавезлі ў Коўбчу, і, зноў жа, час не збярог і яго. Асушылі балоты, і замест рэчкі засталася прамая канава… Скажы сённяшнім школьнікам, што некалі тут несліся ў разводдзе крыгі, не паверацъ… А ў памяці ўсё гэта жыве. І, бывае, калі-небудзь сасніцца так ясна, так чыста, што, прачнуўшыся, доўга жывеш шкадаваннем пра незваротнасць жыццёвага працэсу, і што не ад цябе залежыць магчымасць яго паправіць.

**Першадрук успамінаў —**
**у альманаху «Тэрмапілы»**
**(Беласток, Польшча).**

АПАВЯДАННЕ

# САМ-НАСАМ

Рэй БРЭДБЕРЫ



Гэта было летнім вечарам. Мы ішлі плячо ў плячо па дарожцы Оўшн парка, я і мой сябра Сід, калі пабачылі знаёмую карціну на адной з лавак недалёка ад прычала.

— Паглядзі, — сказаў я, — і паслухай.

Мы глядзелі і слухалі.

Гэта была старая габрэйская пара, яму я даў бы каля сямідзесяці, а ёй прыблізна шэсцьдзясят пяць. Іх вусны і рукі варушыліся адначасова, абое размаўлялі, і ніводзін не слухаў.

— Колькі разоў я ўжо табе гаварыў, — казаў ён.

— Што ты гаварыў? Нічога ты не гаварыў! — казала яна.

— Гаварыў, — казаў ён. — Я табе заўсёды штонебудзь гавару. І вельмі важнае, калі ты даеш мне сказаць.

— Вельмі важнае! Вы толькі паглядзіце на яго! — казала яна, міргаючы. — Назаві хоць адно.

— Калі ласка, пра вяселле.

— Зноў пра вяселле?

— Так, пра вяселле! Колькі было беганіны і выдаткаў.

— А хто бегаў, а хто плаціў?

— Я табе дакажу…

— Не трэба ніякіх доказаў. Бачыш, я глухая!

І гэтак далей, і да таго падобнае.

— Шкада, няма з сабой дыктафона, — сказаў я.

— Навошта дыктафон, — сказаў Сід. — Я і так магу пераказаць, што я толькі што пачуў. Патэлефануй мне хоць сярод ночы, і я табе ўсё паўтару.

І мы пайшлі далей.

— Яны сядзяць на гэтай самай лаўцы кожны вечар ужо доўгія гады!

— Веру, — сказаў Сід. — Яны вясёлыя людзі.

— А ты не думаеш, што гэта сумна?

— Сумна? Супакойся! Гэта ж персанажы вадэвіля. Я магу іх паставіць хоць заўтра на сцэне!

— І табе зусім не сумна?

— Галаву аддаю: яны жанатыя ўжо каля пяцідзесяці гадоў. Яны пачалі сваю балбатню яшчэ да вянца, а пасля мядовага месяца зноў узяліся за сваё.

— Але ж яны не слухаюць адно аднаго!

— Проста мяняюцца ролямі. Спачатку яна не слухае, затым — ён. Калі яны пачнуць уважліва слухаць, яны здранцьвеюць. Усё па Фройдзе.

— Чаму?

— Яны шчодра выліваюць адно на аднаго ўсё, што набалела. Вось пабачыш, што яны кладуцца спаць у зацятай спрэчцы і засынаюць праз дзве хвіліны з усмешкай на вуснах.

— Ты напраўду так думаеш?

— Мае цётка і дзядзька былі такія самыя. Добрая лаянка падаўжае жыццё.

— І колькі ж яны пражылі?

— Цётка Фані і дзядзька Аза? Восемдзесят і восемдзесят дзевяць.

— Так доўга?

— На дыеце словаў, амаль адной лаянкі. Габрэйскі бадмінтон: ён кідае — яна адбівае, яна кідае — ён адбівае, ніхто не перамагае, але, як бачыш, ніхто і не прайграе.

— Я ніколі так не думаў.

— Падумай, — сказаў Сід. — Самы час.

— Мы яшчэ доўга гулялі па парку гэтым цудоўным летнім вечарам.

— І яшчэ! — казаў стары.

— І яшчэ дзесяць тысячаў «яшчэ»!

— Так ужо і дзесяць тысячаў? — казаў стары.

— Глянь. Дзе падзеўся гэты спіс?

— Ды каму патрэбныя твае спісы!

— Мне! Чакай!

— Дай мне скончыць!

— Гэта ніколі не скончыцца, — заўважыў Сід, калі мы зноў мінулі тую лаўку, і ўсе аргументы расталі за нашымі спінамі.

Сід патэлефанаваў мне праз два дні і сказаў:

— У мяне ёсць дыктафон.

— У сэнсе?

— Ты пісьменнік. Я пісьменнік. Збярэм ураджай з нашых ніваў.

— Ну, не ведаю… — адказаў я.

— Давай збірайся, — сказаў Сід.

Ён мяне выцягнуў на шпацыр. Быў звычайны ціхі каліфарнійскі вечар, такі, пра які мы не расказваем усходнім сваякам, баючыся, што прыедуць праверыць.

— І слухаць не хачу, — казаў стары.

— Заткніся і слухай, — казала старая.

— Толькі не гэта! — здзівіўся я, заплюшчыўшы вочы. — Яны ўсё яшчэ тут. Тая самая пара. Тая самая спрэчка. Валанчык заўжды ў палёце над сеткай. Ніколі не ўпадзе на зямлю. Ты напраўду будзеш запісваць?

— Калі ўжо Дзік Трэйсі яго вынайшаў, то я скарыстаюся.

Я пачуў, як зашыпеў дыктафон, калі мы павольна праходзілі паўз лаўку.

— Як яго звалі? Ага, Ісаак.

— Не Ісаак.

— Вядома, Ісаак.

— Аарон!

— Ды не Аарон, ён старэйшы брат!

— Не старэйшы, а малодшы!

— Хто гэта сказаў?

— Ты. І як заўсёды няслушна!

— Зноў крыўда.

— Праўда вочы коле?

— Я ўжо стаміўся табе даказваць сваю рацыю.

— Пара пад'есці, — сказаў Сід, калі мы адышлі ад лаўкі з галасамі старых у дыктафоне.

А потым здарылася дзіва. Лаўка пуставала два дні.

На трэці дзень я зайшоў у кашэрную краму і запытаўся пра старых, ківаючы на знаёмую лаўку. Я не ведаў іменаў. «Вядома, — адказалі мне, — Роза і Эл, Эл і Роза. Штэйн — іх прозвішча. Эл і Роза Штэйн былі тут заўсёды, штовечар. А цяпер іх няма. Цяпер няма Эла. Адышоў у аўтарак. Лаўка пустуе, але што цяпер зробіш?»

Гэтая сумная вестка пра двух незнаёмых, але ўжо блізкіх людзей не давала мне спакою, і я вырашыў нешта рабіць. У маленькай мясцовай сінагозе я даведаўся, дзе былі габрэйскія могілкі і пайшоў туды падвечар, адчуваючы сябе маленькім гоем, як калісьці ў дванаццаць гадоў, калі зазірнуў у храм у цэнтры Лос-Анджэлеса, каб адчуць сябе часцінкай натоўпу, што моліцца і спявае разам з хорам пеўчых у капелюшах.

На могілках я знайшоў тое, што і думаў знайсці. Старая сядзела тут, каля каменя, на якім было выгравіравана ягонае імя. І яна гаварыла, гаварыла, гаварыла, дакранаючыся да каменя, размаўляючы з каменем. А ён? Што ён? Як заўжды, не чуў.

Я пастаяў, паслухаў, заплюшчыў вочы і пайшоў прэч.

Неяк туманным вечарам я праходзіў міма знаёмай лаўкі. Яна па-ранейшаму пуставала.

Што я мог зрабіць? Я патэлефанаваў Сіду.

— Слухай, я наконт тваіх дыктафонных запісаў… — сказаў я.

Напрыканцы лета мы з Сідам шпацыравалі ўздоўж кашэрных шапікаў з цудоўнай бастурмой і тварожнікамі, спыніліся каля аднаго з іх, каб набыць чаго-кольвек пад'есці. Потым пайшлі далей паўз два тузіны пляжных лавак, сумяшчаючы прыемнае з карысным. Раптам Сід заўважыў:

— Нешта я часцяком задумваюся…

— Над чым? — спытаў я, бо ён глядзеў на лаўку, што пуставала цэлы тыдзень.

— Зірні. — Сід крануў маю руку. — Гэта тая самая старая?

— Бадай што тая.

— Яна вярнулася! Я думаў, што яна захварэла ці яшчэ што якое, а яна тут.

— Я ведаю, — усміхнуўся я.

— З якога часу? На той самай лаўцы. І гутарыць сам-насам — вар'ятка!

— Ага, — сказаў я, і мы падышлі бліжэй.

— Але, — прамовіў Сід як мага цішэй, — нікога ж няма. Яна гутарыць сама з сабой.

— Амаль што, — сказаў я. І мы падышлі зусім блізка. — Паслухай.

— Ты мне прыносіш адны пакуты. Доказы? Колькі заўгодна! — казала старая, звяртаючыся да пустога месца на лаўцы. Вочы яе гарэлі, твар быў напружаны, вусны хутка варушыліся. — Колькі заўгодна! У мяне безліч доказаў. Слухай!

І пасля — самае дзіўнае — адказ!

— Слухай, кажа яна! — выгукнуў голас. — Ды колькі можна слухаць! І навошта?

— Ягоны голас! — Сід аслупянеў. — Гэта ж ягоны голас. Але ж ён памёр!

— Так, — сказаў я.

— І яшчэ, — працягвала старая, — ты паглядзі, як ты ясі. Хоць раз звярні ўвагу!

— Лёгка табе казаць, — адказаў голас старога.

— Ну давай, скажы!

Тут нешта пстрыкнула. І Сід убачыў тое, што і я: у руках старой ягоны дыктафон.

— І яшчэ, — сказала яна пасля паўзы.

Пстрык.

— Чаму мне даводзіцца гэта трываць? — крычаў старэчы голас.

Пстрык.

— У мяне ёсць спіс, пра які ты нават не здагадваўся! — жыва адказала яна.

Сід зірнуў на мяне.

— Твая работа?

— Ага, — адказаў я.

— Якім чынам?

— Я ўзяў усе твае запісы, сцёр ейныя словы, пакінуў толькі ягоныя рэплікі і паўзы паміж імі, каб яна магла на іх адказваць. Або яна можа спыніць дыктафон і выгаварыць усё, што пра яго думае. А пасля зноў пстрыкне — і чуе ягоны адказ.

— Як гэта прыйшло табе ў галаву?

— Яна была на могілках, — сказаў я. — Гэта было невыносна. Яна размаўляла з халодным кавалкам мармура і не чула адказу. Таму я і перапісаў толькі ягоныя крыкі, і прыйшоў на могілкі, і ўбачыў яе. Я падумаў, што яна тут застанецца назаўжды і памрэ з голаду. Так і не пачуўшы ягонага адказу. Але адказ павінен быць, нават калі ты не слухаеш, або думаеш, што не слухаеш. Я падышоў да магілы, уключыў дыктафон, уклаў ёй у рукі, упэўніўся, што з дыктафона пачуліся ягоныя крыкі, і пайшоў прэч. Я не азіраўся і не чакаў, пакуль яна закрычыць у адказ. Яна — яму, ён — ёй, вышэй — ніжэй, ніжэй — вышэй, валанчык узняўся над сеткай — і я пайшоў. Мінулым вечарам яна ўжо сядзела тут на лаўцы і ела піражок. Па-мойму, яна будзе жыць. Хіба не цуд?

Сід слухаў.

Стары скардзіўся.

— Чаму я павінен гэта трываць? Хто-небудзь мне скажа? Я чакаю! Ну?

— Вось і слухай, — крычала старая.

Мы з Сідам пайшлі ў цемрыва летняй ночы. Ейны высокі голас і ягоны нізкі засталіся ззаду.

Сід узяў мяне пад руку.

— Як для гоя, ты аказаўся досыць добрым габрэем. Што я магу для цябе зрабіць?

— Як наконт вяндлінкі пад гарэлачку? — адказаў я.

**Пераклад з англельскай Х.**

АПАВЯДАННЕ

# ТОКАР СА СТАЛІЦЫ

Язэп ПАЛУБЯТКА



Ха-а!.. Жоначка… паехала адпачываць… у санаторыю… хм-м… з дзецьмі.

Лярва! Мусіць, хахель услед.

Напужала Маскву лапцямі! Я, токар-універсал, бабу не знайду? Заўтра ў кабет і дзяўчат з цэха запытаю на згоду.

Ведаю! Адказу не будзе!

Баба Насця спаслалася на тое, што старая. Хапае вартаўніка з пятай прахадной. Маня Л. напачатку адмоўна замахала галавой, але ў занатоўніку пазначыла. У гэтым месяцы не свеціць. Трыццаць другі. Люба Т. сказала, што не будзе ні з кім, у дзеўках памрэ.

Прадчуваю. Доўга давядзецца шукаць.

Цю! Труба справы. Станкі самыя лепшыя ў свеце чуркі купляць не хочуць.

Халява! Стаім, курым.

Прафсаюз ссучыўся з адміністрацыяй. Паслалі ў бестэрміновы адпачынак.

Жыццё — рай!

Дзень ляжу, другі, тыдзень.

Колькі не ляжы, есці хочацца. Грошы самі не ідуць.

Цьфу! Праблему знайшоў. Гандляваць, як усе, буду. Навука вялікая. Стой, прадавай калготкі ды трусы.

Дзень пагандляваў — і поўны парадак!

Туалет урэшце кафляю абкладу.

Праз месяц залаты ўнітаз куплю.

Бабы — якія пажадаю. Адпачываць буду на Анарах ці Нарах, як той замежны хутар правільна зваць, не ведаю...

Мікола, чаўнок са стажам, засведчыў: «Патрэбен першапачатковы капітал — «кусок» дольцаў».

Насмяшыў. Такога дабра ў нас пад нагамі валам.

Не разумею! Як знайсці яго?

На вуліцы не знайшоў. Не губляюць.

Пайшоў пазычаць.

Суседа ахапіў істэрычны смех. Шкада, добры чалавек. «Хуткая» адвезла ў Навінкі.

Кум пакруціў пальцам ля скроні і хуценька зачыніў дзверы.

Брат жонкі абазваў дурнем. Цешча зжалілася, спрэзентавала некалькі прасцірадлаў ды галёшы, што не знасіла яе маці.

Цесць адшпіліў ордэн і, гарота плачучы, са словамі: «Навошта мая дачушка пакутуе, лепш памерла б маленькаю», па-святочнаму ўручыў мне.

Не багата тавару.

Мікола-чаўнок у абмен за ордэн падкінуў ідэю: прадаць жончын гарнітур. Паколькі новы муж павінен «гэтую крываногую мадам абуць-адзець ва ўсё шыкоўна-імпартовае».

Святая праўда! Навошта дабру прападаць?

Напакаваў дзве валізы. Во грошай закалачу!!!

…Што рабіць?

Як што! Як усе… паеду на «Дынама» бубло нажываць.

Народу, як мурашоў у мурашніку. Усе цягнуць не меней пяці торбаў. Кожны кожнага штурхае. Усе крычаць, лямантуюць… Рой дзікіх пчолаў.

Блукаў гадзіну, пакуль знайшоў месца.

З Богам, за справу!

Таксама праява. Падбег шпанюк і пішчыць, што тут яго месца. Даў «ляшча» і прагнаў. Праз хвіліну падышлі амбалы ростам за два метры. Пасля трэцяга ўдару пад дых ласкава запыталі: «Навошта маленькіх крыўдзіш?»

Другую гадзіну лямантую. Ніхто тавар не купляе. Распрадаў тыя лахманы на пяты дзень.

Грошай не густа, але гульнуць можна. Закадрыць бы якую-небудзь.

На лаўца і звер бяжыць.

Як можна ўпусціць такі момант? Сама напрасілася.

Во! Гэта кабета — блакітная мара токара-ўніверсала. Нічога не шкода для такой.

Шампанскае, каньяк, балык… Што яшчэ, радасць мая, жадаеш?

Я мужык-хват! Такую кабету закадрыў.

Падымаюся раніцой… Ні кадры, ні грошай…

Бяда вялікая, у Шабаны з Курасоўшчыны пешшу зайсці можна…

Мая жоначка з санаторыі прыехала. Цалавацца лезе.

«Паглядзі, як нашыя дзеткі загарэлі!»

«Дзе мой ружовы халацік?.. Дзе адзенне, апратка?»

Дзе-дзе!? Там, дзе была.

Зараўла гучней сірэны.

Дзякуй Богу, посуд не жалезны.

Знайду месца, дзе жыць.

Да суседа прыехала маці.

Цесць прабурчэў: «Пад плотам тваё месца».

…На вакзале не кепска.

Міліцыянт спытаў пра білет.

Што, сабака, хочаш?

Гумавыя дубінкі гнуцца, ды не ламаюцца.

Пяць разоў паспеў стукнуць. Як спрытна пераскочыў цераз дзве лаўкі! Куды яму за мною ўгнацца?

Чаго я забыў ў горадзе? На бацькаўшчыну махну.

Вёсачка мая! Палеткі родненькія! Дваццаць гадкоў вас не бачыў. Мамачка тут жыве. Дай цябе абдыму, пацалую, крывінка мая!

Пляменнікі з-за вушака выглядваюць. Гасцінца чакаюць. Я крама ці што?!

Маці выцягнула з шуфляды пенсію і падала ўнукам: «Гэта вам ад дзядзькі на цукеркі».

Знаёмлюся з роднымі мясцінамі. За сто метраў ад дому заблудзіўся ў хмызняку.

Набыў правадыра. Сямігадовы суседскі хлопчык Федзька ведае ўсё і ўсіх. Распавядаў па мянушках пра аднавяскоўцаў, паказаў ваколіцы, запытаў, ці не хачу пабавіць час у «вясёлым куточку».

Дыпламатычна адмовіў, здагадваюся, што за ўстанова. Вёска ёсць вёска. Тут людзі ўсе дурні, недавукі і недарэкі. Вечна п'юць самагонку і закусваюць салам з цыбуляю.

Корпацца ў зямлі вялікага розуму не трэба. Не тое, што ў сталіцы. Там тэатры, кіно, музеі, выставы.

Ніколі не хадзіў, што я там забыў?

Тут клуб вось-вось разваліцца. Каб я быў брыгадзірам (ён тут, відаць, самы галоўны, бо крычыць больш за іншых, а дарослыя малых дзяцей ім палохаюць), дык у мяне ўсё было б інакш. Усе мяне слухаліся б і на каленях поўзалі.

Сказаў аб тым швагру. Не разумею чаго ён смяецца. Не патрэбна мая дапамога, адпачываць далей. Гэта не Сочы, хоць там ніколі не быў. Сонца свеціць, буду загараць.

Увесь дзень хадзіў распрануты. Ноччу спаў стоячы. Спіна пакрылася пухірамі. Маці выліла на плечы жбан кіслага малака. Палягчала. Адпачываць болей не хачу.

У вёсцы нічога не змянілася за дваццаць гадоў маёй адсутнасці. Толькі чаранок ад вілаў згніў, і швагер замяніў яго.

Прыгожа тут.

Які непаўторны пах квітнеючага луга! Іншы раз не шкодзіць прагулянца.

Фу-у! Што так смярдзіць? Як можна пасвіць кароў па такой прыгажосці? Не ступіць. Што мне рабіць з новымі красоўкамі, якія маці купіла?

Клышаногі Федзька пазнаёміў з Вяроўкаю і Путам. Узрост іх не вызначальны. Ад Пута пастаянна смярдзіць гноем, у Вяроўкі штохвілінная адрыжка, але ўсяроўна цудоўныя хлопцы.

За знаёмства глыкнулі па шклянцы нейкай жоўтай вадкасці. Мала. Вяроўка падаўся шукаць яшчэ. Не знайшоў. Халява абламалася.

Пайшоў спаць. Маці сказала, што раніцай трэба касіць сена.

Сена дык сена. Што такога? Я на арбітальную станцыю «Мір» такую дэталь забацаў, што яна і па сённяшні дзень лётае. Каб касіць сена, не трэба ФЗВ канчаць.

Пайшлі на луг. Навошта так рана? Сена нікуды не ўцячэ. На заводзе змена пачынаецца а палове дзявятай.

Расколваецца галава. Якую атруту пілі ўчора?

Швагер патлумачыў: Вяроўка і Пута п'юць толькі тармазную вадкасць.

Галава хоць расколваецца, але нешта цёміць. Памятаю бацьканыбожчык некалі вучыў: «Пяту касы цісні, падразай вярхом».

Прыцісную. Кепскі настаўнік. Зямля хоць і мяккая, але ўчатырох касу выцягвалі.

Выцягнулі. Здаецца, асабліва не гнуткая, аднак стала прапелерам.

Швагер сказаў так: «Болей ёй змогуць касіць толькі чуркі», — і выкінуў у кусты.

Яшчэ загадаў шчарбатаму і сапліваму Федзьку, каб пільна назіраў за мною і не дазваляў інструмент браць у рукі, бо сябе скалечу.

Падчас вячэры швагер выпіў тры шклянкі самагонкі і шчыра зацвердзіў, што будзе кахаць жонку да ранку без перастанку. Сястра з радасці наліла яму чацвертую, шчыра ўсміхнулася і абняла. Як адзін казаў: кансэнсус поўны.

Таксама адолеў дзве шклянкі пад кумпяк.

Пахарашэла. Пацягнула на подзвігі. Вырашыў: час да каго-небудзь падваліць.

Запытаў у Федзькі пра «вясёлы куток». Адчуваю, там неабходна «лавіць».

«Там бл…шнік», — адказаў, не выбіраючы слоў, хлапчук і, як дарослы, брудна вылаяўся.

На хаце ў нямытаногай Венеры збіраюцца разведзеныя і ўдовы розных узростаў. Запрашаюць мужыкоў, квасяць і… не без гэтага.

А што мне! Мужык не жанаты. Магу гульнуць.

Шпанюк цвердзіць, што Венера нікому не адмаўляе. Не адмовіць мне, я токар-універсал.

Неяк не звыкла. Бачыць бачыў, а незнаёмы. Як пытаць?!

Нахрапістаць другое шчасце.

Не спатрэбілася. Нямытаногая Венера храпла ў качаргешніку.

Пайшоў дамоў агародамі.

Дзядзька Іван думаў, што злодзей крадзецца за гуркамі і агрэў паленам па патыліцы.

Галава баліць. Болей дамінае, што кумпяк скончыўся.

Ранкам маці зазначыла, што засталося паўапольца сала. Сястра залямантавала: «Гультай! Сеў на матчын карак. Мог бы пайсці ў брыгаду працаваць». Я, токар-універсал, пайду ў калгасную брыгаду, віламі гной валіць?!

Рабіць няма чаго. Пайду ў калгас працаваць.

Маці рада. Нават дала з сабою пляшку. Прызначылі сціртаваць салому.

Дождж. Ляжым у стозе…

На полі заспрачаліся брыгадзір з аграномам, як правільна жаць ячмень. Ад слоў перайшлі да справы. Хацеў умяшацца. Кулаком навесці парадак.

Венера параіла не супакойваць.

Упершыню паслухаў бабу. Ушчэнт збузавалі палетак, які павінны былі жаць. Іх прынцыповую спрэчку спыніў участковы: аднаго брат, другога кум. Даў аграному ў каршэль, брыгадзіру па хлябах. Потым яны ўдвух білі міліцыянера і надалей бузавалі поле. Пасля чаго камбайнер сказаў, што тут усё зжата, і паехаў на другі ўчастак.

З абеду і да самага вечара яны ўтрох сядзелі за скірдой і пілі міравую. Дзеля гэтай справы участковы канфіскаваў трохлітровы слоік самагонкі ў сваёй цёткі.

Яны п'юць, а мы працаваць павінны. Кукіш з маслам. З другога боку сціртьі гуляем у карты…

У мамы кончылася сала. З'явілася маладая бульба.

Малако добрая рэч, але страўнік не прымае, дае аддачу. Угнаіў увесь сад. Швагер дамоў ідзе з супрацьгазам.

Тэлефанаваў майстру на завод. Прыязджаў да нас міністр. Усім рабочым выдалі новыя спяцоўкі і загадалі ўключыць станкі… Іх у цэху засталося толькі тры.

«Як так! Чаму мяне, токара-ўніверсала, не запрасілі? Гэтых злодзеяў — дырэктара і галоўнага інжынера — здаў бы…»

А-а-а! Міністр выказаў шчырую падзяку кіраўніцтву завода за паспяховую прыватызацыю, дырэктара прызначыў сваім намеснікам, галоўны інжынер атрымаў дзяржаўную прэмію.

Усё павязана! Усё схоплена!

Вечарам пайшоў да сажалкі купацца. Увесь дзень там боўтаюцца гусі, але вада чыстая.

Прыпляліся Венера і Харашуха. Венера —васпаватая дурніца, загадчыца мясцовага трухлявага клуба. Ой! Якую з сябе інтэлігентку корчыць!

«Ніхто, акрамя цябе, у гэтай багне не боўтаецца».

Прыйшла пагутарыць з разумным чалавекам, дык гавары, а не прыдурняйся.

«Ты Някляева ведаеш?»

Хі! Такі токар, як і я. Толькі дэтальку для касмічнага карабля тачыў я, а не ён.

Што? Паэт?

Ён такі паэт, як я балярына! «Вальтануты», як ты.

Я — хам?!

Я — токар-універсал са сталіцы. Не лічы сябе разумнейшай за мяне. У горадзе жыву.

Баба. Ніяк не ўгамонніцца.

«Ты Разанава любіш?»

Хіба я хворы на галаву Разанава кахаць! Я мужык! Мала бабаў ці што? Ды з ім у нашым цэху ніхто піць не хоча. Ад яго заўжды мазутам смярдзіць.

Праўду казаў я: усе вясковыя — дурні.

Венера не захацела са мной, бо ад мяне смярдзіць балотам і я — дурань.

Маці таксама адразу не пусціла ў хату, прымусіла памыцца ля калодзежа.

На вёсцы таксама ідзе прыватызацыя.

Старшыня пабудаваў за калгасныя сродкі два вялізныя дамы і задарма выкупіў…

Сцяпан К. стырыў паўмяшка збожа. Суд вызначыў яму тэрмін у тры гады.

Праўду людзі кажуць: не умееш красці, не крадзі.

Прыехаў у калгас чалавек з райцэнтра. Расказаў яму пра мясцовае беззаконне. Перад усімі вяскоўцамі мне было сказана, што я не разумею дзяржаўнай палітыкі на вёсцы ў дадзены момант, бо я гарадскі чалавек.

Старшыня калгаса быў больш канкрэтным: «Будзеш вякаць не тое, што трэба, прывяжам да бервяна і праедзем гусенічным трактарам».

Раніцай у маці здохлі ўсе куры.

У калгасе працаваць не дазваляюць.

Баюся тут некага! Я — токар-універсал са сталіцы. Бачыў вас усіх у адным месцы.

Нейкая скаціна з-за вугла каменем у лоб патрапіла. Вочы запухлі. Нічога не бачу.

Не паддамся. Выведу ўсіх на чыстую ваду.

Ноччу прыйшоў швагер, шапнуў на вуха, каб зараз жа мой след прастыў тут, бо паплыву па рэчцы, як сякера без тапарышча.

Што тут такое творыцца? Пайду шукаць справядлівасці.

Бачу, на пілараме старшыня выбірае самае тоўстае бервяно. Швагер заводзіць трактар.

Час мацаць вуды.

Куды беднаму токару-ўніверсалу падацца?

Праблема, куды!.. У сталіцу, да жоначкі родненькай.

НАТАТНІК

# ПАДАРОЖНЫЯ ГІСТОРЫІ: У НАВАГРАДКУ

Раіса КРЫВАЛЬЦЭВІЧ

**Даўно не была ў родным горадзе, важна пабачыць яго, упэўніцца, што стаіць…**

Наваградак... Вакзал... Выходзіш з аўтобуса... Шыльды — выключна па-расійску: «Рынок», «Кондитерские изделия», «Овощи», «Фрукты»... Дзякуй хоць за адну беларускую: «Аўтавакзал». Хоць дзе нашае Ў пабачыць…

Купіць білет назаўтра назад, у Мінск — і па вуліцы Міцкевіча далёка, на другі край горада — да бацькоўскай хаты...

...Наваградак ахутвае, абдымае, атульвае снегам і роднасцю, песціць…

Усё тут выклікае ўспаміны… Яны адны і тыя ж, бо засталіся з мінулага, якое не змяніць…

…Афіша на свежапафарбаваным кінатэатры «Звязда», у якім мы некалі адчынялі зубамі і з'ядалі падчас сеансу не адну жасцянку-каробачку (і як алергія не выскоквала!) вітаміна С — прадбачліва набытай у аптэцы прысмакі, — паведамляе, што свята закаханых у Наваградку працягваецца два дні: 13 і 14 лютага… Чакаюцца конкурсы і прызы... Прапануюцца фільмы: расійскі кінабаявік «Запрещённая реальность» і «Чернильное сердце»…

...Будынак райвыканкама (ці гарсавета? блытаюся ў назвах улады). Стандартна-казённае, чорным-па-белым і на чырвоным паведамленне пра выбары ў мясцовыя дэпутаты — 25 красавіка …26-га склікання… Хіба што ад гэтага зменіцца? Прасцей пабіць рэкорд Гінэса ў конкурсе на доўгі пацалунак, чым дачакацца рамонту старых дамоў на Паштовай ці Замкавай вуліцы…

...Гэтаму з прэтэнзіяй на арыгінальнасць будынку салона прыгажосці некалькі гадоў. Гадзіннік, які яшчэ з мінулай вясны толькі двойчы ў суткі паказвае правільна час… Маленькая фігурка анёла з наваградскага герба — наверсе…

Цяпер уверх — на Гродзенскую…

На Гродзенскай, недалёка ад Свята-Мікалаеўскай царквы — Сабора — новая скульптура — святы Елісей Лаўрышаўскі... Хто такі, падпісана па-расійску… На сцяне царкоўнай прыбудовы шыльда «Московский патриархат. Белорусская православная церковь. Новогрудская епархия.» У вокнах будынка бялеюць выдрукаваныя аб'явы. Абедзьве пачынаюцца з хвалюючага «Внимание!». Цікава… Пад абедзьвюма стаіць імя: іерэй Вадзім Кузьміч, і ўласнаручны подпіс аўтара адозвы. Першая паперына мае назву «Духовное невежество», другая — «Кощунство». Бацюшка паведамляе тым, хто не ведае: вада на свята Богаяўлення мае аднолькавыя лекавыя ўласцівасці незалежна ад крыніцы, дзе яе



Раіса Крывальцэвіч нарадзілася ў 1960 годзе на Наваградчыне. Атрымала адукацыю на гістарычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага. Працавала настаўніцай гісторыі і нямецкай мовы. Выкладчыца ЕГУ. Жыве ў Мінску.

набіраюць. Але сфармулявана не вельмі ясна, думаю, невукі не адразу зразумеюць, якую думку хоча данесці пастыр…

Заблытанасцю гэта нагадвае аб'яву на нашым пад'ездзе, якую напісалі раззлаваныя на жыхароў, што кідаюць смецце, не ўпакаваўшы яго, дворнікі: «Убедительная просьба выносить мусор в мешках или оставлять у себя в квартире». Харошая альтэрнатыва..

У другой «энцыкліцы» бацюшка пагражае Божымі карамі тым вернікам, якія набіраюць святую ваду ў бутэлькі з-пад віна і піва, бо гэта ёсць блюзнерства… Што ж, бацюшку можна зразумець, але Гасподзь, думаецца, больш літасцівы да чадаў сваіх і радуецца, што яны прыйшлі да яго хоць з такімі сасудамі…

Вялікія цяжкія дзверы Сабора час ад часу расчыняюцца, каб прапусціць унутр некалькі нямаладых жанчын, якія прыйшлі на вячэрнюю малітву. Можа, яны памоляцца і за гэтых двох скурчаных ад холаду, здыхлявых на выгляд маладзёнаў, што выскачылі папаліць з «Забаўляльнага цэнтра», які абяцае весяліць 24 гадзіны ў суткі. Хлопцы нешта зацікаўлена абмяркоўваюць, перасыпаючы размову мацюкамі…

Ад Сабора да плошчы — два крокі…У цэнтры горада — горы снегу, якія нядаўна былі скульптурнымі творамі… Масленіца… Абавязковае казённа-народнае, арганізаванае мясцовымі ўладамі свята на ўсіх раённых гарадках… Казёншчыной патыхае ад аб'явы пра свята ў Карэлічах — яна парасійску, у афіцыйнай форме: «В 12 часов …состоится…». Як партыйны сход… Так і хочацца дапісаць «Явка обязательна»…

Над былым кафэ «Вясна» (яно ж «Гостиный двор» — праўда, госці тут доўга не затрымаліся — будыніна даўным даўно на рамонце) — шыльда: Навагрудку — 965...

…Плошча… Раней тут быў «Малочны», дзе я, выконваючы хатнія абавязкі, купляла для сваіх бедных (калі ў хаце не было сала) бацькоў прадукт пад дзіўнай назвай «маргагуселін», які насамрэч быў маргарынам і намазваўся на хлеб…

…А тут была «Кулінарыя» (бацька «не выгаворваў», казаў — кілунарыя), дзе працавала прыгажуня Валька… У Valькі былі цудоўнай прыгажосці, як анёлы, дзеці, а вось з мужамі ёй не шанцавала…

У былой «кілунарыі», а цяпер бары з гучнай назвай «Рым» — ні душы… Наогул, назіраецца пэўная паступовая італьянізацыя горада (калі не ўлічваць новае кафэ з панібрацкай назвай «Іваныч»): улетку заўважыла аж дзве вялізныя поліэтыленавыя «палаткі» — памяшканні для продажу піва: «Палермо №1» (на плошчы, у цэнтры горада) і «Палермо №2»(у скверыку на Міцкевіча, там, дзе некалі на высокім пастаменце стаяў Сталін, якога змяніла жанчына з галубком — мы ўжо яе засталі...).

…«Першы магазін»(магазін №1) даўно згубіў наведвальнікаў… Раней старыя нязручныя дзверы, якія бесцырымонна маглі надаць паскарэнне кожнаму няспрытнаму, не паспявалі зачыняцца за жадаючымі набыць «булку хлеба», кілбасы ці піва… Цяпер гэта крама для выбраных — не кожны можа дазволіць сабе гадзіннік фірмы «Зіко», гэта вам не тавары паўсядзённага попыту… Прыветлівя і ўтульна праменіць падсветка ў шкляных футаралах-вітрынах з гадзіннікамі, але аматараў дарагіх рэчаў няма... Хіба зайцы як на экскурсію…

Каб папасці дадому, можна ад плошчы пайсці па Замкавай ці па Паштовай… Сёння — па Замкавай…

...О не, лепш тут не хадзіць… Шчыльны высачэзны плот, каб схаваць брыдоту разбурэння, ужо падпёрты калкамі…Бязглуздая шыльда на ім паведамляе, што тут будзе рэканструяваны (!) гатэль «Еўропа», «с рестораном историко-культурных ценностей XVIII-XIX вв.».

Старая забудова... Трэшчыны па сценах, пакрыўджана падціснутыя вусны, сумныя вочы старых дамоў… Дысанансам — акуратныя прыгожыя шыльдачкі: «Ахоўваецца дзяржавай»... Крывадушнасць... Людзі чакаюць іх смерці…

Цяпер — на Люсі Сечка…Вуліца носіць імя мясцовай загінулай партызанкі. Злыя тутэйшыя языкі казалі, збіваючы наш школьны піетэт перад загінулымі, што, маўляў, маладая была, з камандзірам спала, вось і пашана…

…А вось і мая школа, з шыльдай па-беларуску (усё, што захавалася ад яе сапраўднай беларускасці, што была «за польскім часам»). Тут яшчэ мой дзед Сяргей цэглу цягаў («Дужы быў! І плацілі добра — па 10 злотых, за гэтыя грошы можна было 5 пудоў жыта купіць… ») на пабудову школы для дзяцей беларускіх сялян… І бацька мой тут вучыўся перад вайной…У 39-м — заўсёдная бацькава крыўда — «адсадзілі назад», у першы клас, дзе вучыў вершык «Есть человек за стенами Кремля…».

Школьны двор… Туалет паранейшаму на двары, як сорак гадоў назад…

...Былы будынак аўтабазы… Гіпсавы (?) Ленін у двары з выцягнутай, як належыць, рукой… Мой верны арыенцір у пешым паходзе да школы са сваіх Слухавічаў — нарэшце засталося няшмат.. Сюды, на аўтабазу, мы хадзілі з класным кіроўніком па мянушцы Калхознік (з-за моцна заселай вясковасці) заказваць аўтобус у Вільню для нашага класа… Мы былі ўжо ў 9-м, і чакаць далей не было куды — мары Калхозніка, які адзіны ў школе мог цытаваць на памяць Міцкевіча, пра тое, што клас зойме першае месца па чысціні і іншых важных паказчыках, а школа падорыць нам за гэта бясплатную паездку — засталіся марамі…

Вільня тады моцна ўразіла — зусім родны горад, быццам ты ў ёй заўсёды жыла, такі ж дух, як і ў Наваградку… Хто ж ведаў тады пра Княства Літоўскае... Толькі не школьнікі Наваградскай школы №1... Праўда, саромелiся хадзіць побач з Калхознікам па вуліцах горада — з яго гаспадарчай сумкі недвухсэнсоўна тырчэлі лапкі набытай у віленскай краме курыцы...

Наваградскія горкі і горачкі...

На гэтую падымалася разам з класам і першай настаўніцай, трымаючы за руку першую школьную сяброўку — Вальку Равека. Патаемная радасць спявала ў душы, відаць, гэта былі самыя шчаслівыя моманты школьнага жыцця: у сталоўцы чакала гарачая катлета і тоўстыя, як трубкі, макароны…

Будынкі грамадскія скончыліся, пачалася «прыватная забудова». Гаспадары дамоў… Многія з іх пайшлі ў лепшы свет… Адразу налічваю мо чалавек трыццаць… Але гэта не ўсе…

Хаты — гэта памяць пра тых, хто тут жыў… І жыве яшчэ… Хаця ў некаторых гаспадары даўно змяніліся…

Дамы ўсё на горках, а вуліца бяжыць унізе...

Вялікі цагляны дом мае аднакласніцы Галі… Бацька паспеў пабудаваць…Яна ўжо даўно — шчаслівая бабуля… Рана выйшла замуж… У класе Галя мела найлепшае жаночае развіццё, і нашыя хлопцы, якія называлі дзявочыя грудзі «буферамі», гэта заўважалі, давалі хаду рукам…Мы, худыя і бязгрудыя, асуджалі Галю за лёгкадумныя паводзіны, за тое, што рагоча, калі малы ростам, але прагны да Галіных акругласцяў Коля Блескін смешна падскоквае і бессаромна лапае яе…

…Яшчэ прайсці ля лужка, які належаў панне Мар'і… Тут даўно забудавана, жывуць людзі. Лужок быў часткай нашага беднага на падзеі, увагі бацькоў і прысмакі дзяцінства. Мы смакталі тут кіслыя, утравянела-цвёрдыя, з чырвонай шчотачкай дробных кветак цымбуры праспелага дзікага шчаўя, збіралі дзіўныя кветкі, якія называлі цюльпанамі, а таксама дэманстравалі адзін аднаму смеласць — заключалі пчалу на кветцы ў даволі цесныя абдымкі пальцаў і чакалі…

Панна Мар'я (у дзяцінстве я была ўпэўнена, што Паннамар'я — гэта імя) была асколкам даваеннага жыцця. Былая настаўніца польскай гімназіі, полька, яна не з'ехала на сваю радзіму ў «Польшч», як казалі ў нас. Панна Мар'я была адзінокая, няньчыла чужых дзяцей па хатах, жыла ў чужым хляве, прыстасаваным пад пакойчык… Яна моцна вылучалася з асяроддзя, у якім мы жылі: заўсёды ласкавая ўсмешка пры сустрэчы, далікатнае маўленне… Насельнікам вуліцы Слухавіцкай было незразумела, чаму панна Мар'я так і не вярнулася да сваякоў, што слалі ёй на дзень нараджэння прыстойныя сумы, якія жыва абмяркоўваліся суседзямі..

Хату Шуркі Туркевіч не пазнаць, бо жывуць тут іншыя людзі, якія перарабілі-перабудавалі яе на свой лад… І зорка ветэрана вайны на хаце з'явілася… Шурка была вясёлая, любіла выпіць і рэдка палола агарод, што заўсёды асуджалася суседзямі. Але ў Шуркі рос цудоўны куст бэзу, у прахалоду якога мы, «падшпаркі», хаваліся, гуляючы ў альтанцы днямі напралёт у карты...

Пад старасць да Шуркі заявіўся старэйшы сын Пеця, які некалі з'ехаў у далёкія краі, у яго юнацтве гэта было папулярна… Пецяў быў без пальцаў на абедзьвюх руках і без сям'і. І тое, і другое згубіў па п'янцы… Потым Шурка памерла, дачка прадала хату, і бяздомны Пеця з'ехаў назад у Расію…

Я ўжо амаль каля дому…

Войткава хата, з лавачкай і вазончыкамі на паліцы ля сцяны — новаўвядзенне дачкі Лены… Лена прыходзіць сюды на выхадныя са свае кватэры, а так у хаце ніхто не жыве. Косцік Войтка, мой бліжэйшы сусед, і яго жонка Мілка ўжо пайшлі адсюль… Косцік быў ветэранам вайны, і першы на вуліцы, на зайздрасць суседзям, займеў «машыну». Хоць і не сабе, а зяцю… На пачатку 90-х Косцік ставіў новы плот, часта прысядаў адпачыць, і ўсё не мог зразумець, куды прапалі грошы… «Ты ж вучоная, інсцітут канчала», — пачынаў ён пытанне да мяне… Косцік памёр раптам, дапамагаючы сваякам капаць бульбу…

Заўсёды была ўдзячная яму за некалькі вялікіх чырвоных яблык, якія зімою, здымаючы з гарышча, ён шпурнуў-кінуў мне праз плот у снег… На нашай вуліцы дарослыя не часта заўважалі дзяцей…

….Снякыць… Снегу ўсё прыбывае… Масленіца…

Дома, паглядзеўшы тэлевізар, бацька смяецца: «Во, бліном зіму гналі, а яна не паддаецца, пахілілася толькі трохі…».

Сняжыць і на раніцу… Маці знайшла вінаватых: «Гэта бальшавікі прынеслі снег, холад з Расеі… Манёўрамі прыроду пазрывалі…»

Пара вяртацца ў Мінск…

**14 лютага 2010 г.**

ЮБІЛЕЙНАЕ

# МОЦНЫЯ ДУХАМ НА КАЛЕНІ НЕ СТАНУЦЬ

Яўген ЛЕЦКА

**Яўгену Гучку — семдзесят. Аж не верыцца. Ведаю яго з 1986 года, ад часу супольнай выдавецкай працы ў адным будынку — ён у «Народнай асвеце», а я над ім, паверхам вышэй у «Мастацкай літаратуры». Прыкмеціць яго ў тым гаманкім чалавечым вулею было няцяжка.**



Ён з натоўпу вылучаўся як знешне: высокі, стрункі, паглядны, з дагледжаным шчаціннем на твары, так і паводзінамі: гаварыў звычайна, у адпаведнасці са сваім прозвішчам, гучна, не баючыся ўголас выказваць і тое, што звычайна адзін аднаму перадавалі шэптам, падмацоўваючы сказанае толькі яму ўласцівымі рухамі і смехам, бо сарказм, іронія ўнутрана для яго арганічныя. Будучы дасціпным, вострым на слова, да выдавецкай працы ставіўся абавязкова, мог гадзінамі карпець над рукапісам, але не як нежывы манекен, а з усмешкай, нібы размаўляючы з аўтарам нячутна, пра сябе. Сваю правату пры сустрэчах сцвярджаў доказна, на канкрэтных лексічных і стылёвых праўках, на выверанных у энцыклапедычных даведніках фактах. Таму я і не чуў, каб у яго ўзнікалі нейкія «гучныя» канфлікты, якія даводзілася вырашаць і пагашаць за межамі асабістай выдавецкай прасторы, гэта значыць уласнага стала ў пакоі, дзе звычайна сядзелі па чатыры-пяць чалавек. Над рукапісамі тады працавалі з вялікай адказнасцю, іх, апрача рэдактара, умоўна кажучы, «вылізвалі» стылісты і карэктары разам з так званымі падчытчыкамі, бо ўголас прамоўлены тэкст часам выяўляў памылкі, якія праскоквалі пры асабістым чытанні вачыма…

І сёння ён застаецца хлапцом-малайцом: рухавым, імклівым, незалежным у сваіх меркаваннях на свет і людзей, на сённяшнюю сітуацыю ў краіне, на літаратуру і яе творцаў. Ён ніколі не прыстасоўваўся, не ўступаў у адзіную для ўсіх партыю, членства ў якой гарантавала службовы рост і трывалы кавалак хлеба. А таму ў такіх, як Яўген, звычайна ніякага службовага росту, нягледзячы на іх здатнасць да працы, не было. А ён пра гэта і не дбаў — нават каліва крыўды я ад яго не чуў, што вось, маўляў, чарговую партыйную бездар прасунулі на пасаду, а ён, як быў, так і застаўся на сваім месцы. Бо хіба кепска, хіба нязручна быць на сваім месцы, адчуваць, што ты тут патрэбен, робіш карыснае і пры гэтым сам выдатна адчуваеш. А заадно можна пасмяяццапацешыцца над «прасунутымі», бачачы іх мітусню, іх клопаты і перажыванні.

Са мной у рэдакцыі крытыкі і драматургіі працаваў адзін паэт — у побыце досыць разбэрсаны, у працы не заўсёды абавязковы, прычым аматар чаркі да таго, што часамі занікаў галавою над рукапісам, не раўнуючы, як самлелы конь у спёку. Даводзілася прасіць машыну і адпраўляць яго «па этапу» дахаты. Але які ж ён быў важны ды ідэйна на ўсе чатыры нагі падкуты падчас партыйных сходаў! «Глядзі, — пацяшаўся аднойчы Яўген, — як хораша набрыняў чырванню, як важна надзьмуўся твой Міколка партыйнасцю! Гарантую з'яўленне чарговай «міскі» (чытай нізкі) высокаідэйных твораў. А тут сядзіш, карпееш над вершам. Ты як хочаш, а я хоць ракачам, а ў партыю палезу! Я ж таксама хачу быць прадуктыўным для грамадства членам!». Прамовіць пафасна, артыстычна, задзірыста блісне вачыма, і мы ўзрываемся смехам, рагочам.

Аднак незалежнасць, сапраўдная, а не ўяўная, бутафорная, як дзяржаве, так і чалавеку, не даецца сама сабой, а аплочваецца тым ці іншым коштам. І калі пра службовы рост Яўген Гучок мала, а дакладней ніяк не дбаў, то нейкае незразумелае глухое маўчанне вакол ягоных вершаў давалася яму ў знакі. Увогуле шлях яго ў паэзію, зрэшты, як і па жыцці, быў няпростым. У пераважнай большасці тыя, каго апаноўвае паэтычны сверб яшчэ ў школьныя гады, уваходзілі па пратаптанай папярэднікамі сцяжыне, на пачатку якой быў «Піянер Беларусі», дзіцячы часопіс «Вясёлка», потым «Бярозка», «Чырвоная змена» і «Маладосць». Ну а расійскамоўныя, адпаведна, варыліся ў сваім расійскамоўным катле, які, дарэчы, не толькі за гады перабудовы і незалежнасці не выкіпеў, але яшчэ больш прыбавіў імпэту ў варыве. Кажучы інакш, расійскамоўных дзіцячых выданняў стала куды больш, чым было. Але некуды падзеліся беларускамоўныя: ад «Піянера Беларусі», «Ранціцы», «Чырвонай змены» засталіся толькі ўспаміны. Аднак Яўген Гучок дзіцячым, як і юнацкім таксама, паэтам, здаецца, ніколі і не быў. Вось адзін з яго ранніх вершаў:

*Калі твае сэрца ў палоне тугі,*
*Сябе накіроўвай трэба*
*Туды, дзе промнямі сонца*
*на нашы лугі*
*Апіраецца бездань неба.*

Хібы гэтыя радкі не сведчаць пра паэтычна-светапоглядную сталасць аўтара? Створаны тут вобраз-метафара, дзе трывожны стан чалавека нечакана падаецца ў глабальным касмічным, але не адарваным ад родных каранёўвытокаў асэнсаванні. А такое, ды яшчэ ў ёмістай форме выказанае не кожнаму паэту даецца.

Перад намі паэт двойчы народжаны, і не толькі ў дзвюх моўных, незалежных стыхіях, але і ў сваім сутнасным выяўленні.

Яўген Гучок пачынаў пісаць на расійскай мове, кніжна-запазычанай, нежывой, пазбаўленай самабытнасці. Юныя паэты не самі такую мову выбіралі і выбіраюць, а жыццёвыя абставіны, ды дарослыя прыўладныя дзядзькі, якія зрабілі так, што дзеці Беларусі змалку адлучаюцца ад роднай мовы, бо ходзяць у расійскамоўны садок, потым у такую самую школу, чуюць вакол сябе нахай недасканалую, трасянкавую, але па лексічнаму складу усё ж расійскую мову. І, натуральна, пачынаюць на гэтай мове складаць свае першыя спробы пяра. Так доўжыцца некалькі гадоў, пакуль нарэшце да іх не прыходзіць грамадска-нацыянальнае самаўсведамленне, да якога народа і да якой культуры яны насамрэч належаць. У выніку адбываецца тое самае другое нараджэнне і, паўторым, яно куды глыбейшае і шырэйшае, чым фармальны пераход з няроднай на родную мову.

Менавіта такі шлях прайшоў Яўген Гучок, ураджэнец слаўнага горада Слуцка. Як і ў класіка беларускай літаратуры, які ўвасабляе сабой найбольш яскравы прыклад павяртання на генным узроўні да сваіх родных каранёў. Гены генамі, яны сапраўды шмат для чалавека значаць, але, апрача падсвядомага, тут істотны нават іскрынкі рэальных праяў свайго запаветнага роднага, якое змалку западае ў душу і памяць ды спрыяе далейшаму абуджэнню. Для Яўгена гэта найперш былі беларускія матчыныя песні, якія яна прыгожа спявала. А гэта ж цэлае багацце, якое ўвесь час свяціла сыну пяшчотай і хараством, клікала яго ў далёкіх дарогах да сябе, да сваёй роднай моўнай стыхіі. Пад далёкай дарогай мы разумеем не толькі геаграфічнае перамяшчэнне, але і ўнутраныя вандроўкі па кнігах.

Пасля заканчэння школы ён працаваў у геалагічнай разведцы, на мэблевай фабрыцы, служыў у войску, ды не дзе, а ў самой сталіцы імперыі пад назвай Савецкі Саюз. Тут ён наведваў музеі, тэатры, выставы, хадзіў на вечарыны сталічных паэтаў. Нават адважыўся сабраць лепшае з напісанага і аднесці ў Саюз пісьменнікаў СССР. Былі там і вершы пра салдацкую службу, якраз тое, за што маглі ўхапіцца літаратурныя начальнікі і парэкамендаваць для публікацыі. Але якія?

*Днем тут учат попасть в висок,*
*По ночам тут храпят угарно;*
*Отломать бы луны кусок —*
*Сунуть в черную пасть казармы.*

Пагадзіцеся, што з падобнымі вершамі савецкага салдата, якога ўзмоцнена рыхтавалі да выканання свайго інтэрнацыянальнага абавязку перад народамі, якія жылі ў капіталістычнай «кабале» і якім трэба было паспрыяць далучыцца да прагрэсіўнага сацыялістычнага лагеру — ніяк нельга было рэкамендаваць у друк. Так што дэбют адклаўся…

Мы абодва, я і мой цёзка, сённяшні юбіляр, адносімся да розных масавых кампаній вельмі насцярожана, бо шмат іх пабачылі на сваім вяку. Калі верыць завадатарам, то і ў камунізме пажылі, і Амерыку дагналі і перагналі. У кампанію ператварылася і модная на сённяшні дзень будаўніцтва так званых аграгарадкоў. Колішняя наша звыклае і мілагучнае беларускаму вуху мястэчка Нягневічы пераназвалі аграгарадком. А што ад гэтага памянялася? Шмат чаго. Раптоўна, за пару гадоў узнік на гарадскі лад цэлы мікраён. Раней, каб пабудаваць хату, чалавеку трэба было сабраць на гэта грошы, а потым шмат папрацаваць. Будоўля патрабавала вялікіх намаганняў. Затое свая хата была як святыня.

**Ён застаецца хлапцом-малайцом: рухавым, імклівым, незалежным у сваіх меркаваннях на свет і людзей, на сённяшнюю сітуацыю ў краіне**

А цяпер нахлынулі ў аграгарадок прыезджыя з-за свету і на дурніцу паўсяліся ў гатовае жытло. Але гаспадары і работнікі ў бальшыні з іх проста ніякія. Затое выпівохаў пабольшала ў Нягневічах у некалькі разоў. Ля прадуктовай крамы з самай раніцы п'яны тлум гудзе. Пабольшала крадзяжоў, боек, забойстваў і самагубстваў. А літаральна на днях патэлефанавала сястра і паведаміла навіну, ад якое хоць вазьмі ды куды падзенься, каб не чуць і не бачыць такога. Выходкі ўжо і на нябожчыкаў пайшлі ў наступ. Ахвярай сталі і нашыя бацькі, дакладней, помнікі ім. Іх аўтар — мой колішні сябар скульптар Алесь Шатэрнік. Ён тады шчыра папрацаваў, помнікі мелі арыгінальную форму, былі мо найбольш эстэтычна дасканалымі на ўсе могілкі. Цяпер знявечаныя і наўрад ці падлягаюць рэстаўрацыі. Хутчэй за ўсё, рабаўнікі пагналіся на бронзу, з якое былі адлітыя аблічча спачылых, крыжыкі і даты жыцця, зразумела, па-беларуску. Я, дарэчы, не бачыў нідзе на іншых могілках, хіба што на беларускіх у так званым заходнім свеце, столькі беларускамоўных надпісаў, што мяне прываблівала, каб і самому знайсці вечны спачын сярод родных і ўвогуле землякоў. А цяпер?...

А адхіляюся ад асноўнай тэмы гаворкі, у аснове якой — юбілей пісьменніка. Але расказваю пра тое, што нам абаім блізкае, пра што мы гаворым на сустрэчах і па тэлефоне, а яна, балючая праўда жыцця, становіцца пасылам для ягоных вершаў ці публіцыстычных выступленняў у перыёдыцы, найчасцей на старонках «Народнай волі». Калі ж хто з чытачоў «Літаратурнай Беларусі» пажадае больш грунтоўна пазнаёміцца з Яўгенам Гучком, адсылаю цікаўных да гэтага выдання, дзе ў нумары за 2—4 лістапада надрукавана вялікае, на цэлую паласу, інтэрв'ю з ім. Менавіта адтуль я і даведаўся пра дзень народзінаў аўтара. Факт таксама паказальны: ён не з тых, хто знарок арганізоўвае прэсу пра сябе. Хоць падставіць плячо таму, у каго адчувае дух пабрацімства, еднасць пазіцый і поглядаў — заўсёды напагатове. Як і аддаць памяць спачылым.

Толькі што ён закончыў кнігу пра свайго земляка, надзвычай арыгінальнага чалавека літаратара і краязнаўцу Рыгора Родчанку, здаў паэму ў газету «Наша слова» пра надзвычай таленавітую паводле ягоных слоў дзяўчынку Ганну Уланаву, якая так заўчасна, у юным узросце, пакінула гэты свет.

Сам Яўген нялёгка пракладваў сваю літаратурную сцяжыну. Увогуле мне і да сёння не зразумела, чаму тады, калі мы працавалі разам у Доме кнігі, ягоны паэтычны зборнік гадамі марнаваўся ў маёй роднай «Мастацкай літаратуры», дакладней, у рэдакцыі паэзіі? Колькі за гэты час і тут, і ў іншых выдавецтвах было надрукавана шэранькіх, нічым не прыкметных зборнічкаў, якія даўно разам са сваімі аўтарамі канулі ў лету. Я неаднойчы тады цікавіўся ў калегаў, чаму так атрымліваецца; яны ці прамаўлялі штосьці няўцямнае, ці абяцалі разабрацца і выдаць. Прычына, мабыць, у непадатлівым характары Яўгена, які не ўмее прасіць, а тым больш залагоджваць выдаўцоў чаркаю, што ў тыя часы практыкавалася паўсюдна. А ён жа належыць да меншасці, а таму атрутнага зелля і ў рот не бярэ. Магчыма, за ім цягнуўся шлейф, складзены на падставе звестак так званых сексотаў. Дый паэзія яго ў той час не ўкладвалася ў распаўсюджаныя стандарты. Занадта была рэзкай, пратэстнай як па змесце, так і формай. Ды і цяпер яна займае сваё адметнае месца.

Хацелася б пажадаць Яўгену большай разняволенасці і фармальнай разнастайнасці, пазбаўляцца дэкаратыўнасці, рацыяналізму, быць больш лірычна непасрэдным, усмешлівым, як, скажам, у гумарэсцы «Як я быў дзьмухаўцом?».

З такім, як у яго, грамадзянскім гартам, можна штурмаваць і дасягаць непрыступных вяршыняў, уздымаючы на іх свой нацыянальны сцяг.

▸ УРОК

# КРАЙ НЕ СКАРЫЎСЯ

Уладзімір АРЛОЎ

**Вольналюбівы дух паўстанцаў Тадэвуша Касцюшкі і Якуба Ясінскага быў жывы. Як тлее пад попелам гарачае вуголле, так у душах ліцвінаў-беларусаў увесь час не патухала нянавісць да царскіх прыгнятальнікаў. Продкі хацелі самі быць гаспадарамі на сваёй зямлі.**

## Міхал Бабpоўскі і Ігнат Даніловіч

Царскія ўлады старанна знішчалі памяць пра незалежнае Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. У Расею вывозілі летапісы, гістарычныя дакументы і цэлыя бібліятэкі. Беларусаў хацелі пераканаць, што яны — частка расейцаў. Супроць гэтага ўсё больш смела выступалі адукаваныя людзі. Сярод іх вылучаліся прафесары Віленскага ўніверсітэта Міхал Бабpоўскі і Ігнат Даніловіч.



Міхал Бабpоўскі



Ігнат Даніловіч

Будучыя вучоныя нарадзіліся ў сем'ях вуніяцкіх святароў на беларускай Беласточчыне. Бацькі з дзяцінства вучылі Міхала ды Ігната паважаць мову і звычаі прадзедаў. Абодва спасцігалі навуку ў былой сталіцы Вялікага Княства і захапіліся яго гісторыяй і культурай.

Міхал Бабpоўскі нанова адкрыў для суайчыннікаў і Еўропы імя і справу Францішка Скарыны. Ігнат Даніловіч даследаваў славутыя Статуты Вялікага Княства, а таксама нашыя летапісы. Адзін з летапісаў, пра які ўжо забыліся, ён сам знайшоў у бібліятэцы Супраслеўскага манастыра, што паблізу Беластока.

Бабpоўскі і Даніловіч разам з аднадумцамі казалі ў лекцыях і пісалі ў кнігах пра тое, што беларусы — асобны самастойны народ з неацэнным спадчынай, што засталася з прамінулых стагоддзяў. Вучоныя выступалі за аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага і за тое, каб беларуская мова зноў была ў ім дзяржаўнай.

Расейскія ўлады адпомсцілі Бабpоўскаму і Даніловічу. Першага выслалі ў манастыр, а другому наогул забаранілі жыць у Беларусі. Але іхняя справа не загінула. Яна запальвала веру ў вольную будучыню нашай зямлі ўсё новыя і новыя сэрцы.

Дзякуючы Міхалу Бабpоўскаму і Ігнату Даніловічу ў навуцы ўзнік новы кірунак — беларусазнаўства.

## Таемныя таварыствы

Пра вызваленне краю ад расейскага панавання марылі многія выкладчыкі і студэнты Віленскага ўніверсітэта. Яны гуртаваліся ў таемных патрыятычных таварыствах. Самым вялікім і моцным было таварыства філаматаў. У перакладзе з грэцкай мовы «філамат» — гэта чалавек, які імкнецца да ведаў.

Стварылі таварыства студэнты Тамаш Зан і Адам Міцкевіч ды іхнія сябры.

Спачатку філаматы вывучалі гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, запісвалі народныя песні, паданні і казкі. Але неўзабаве яны пачалі гаварыць пра незалежнасць краіны. Старэйшы таварыш філаматаў прафесар Віленскага ўніверсітэта гісторык Яўхім Лялевель прыдумаў заклік, звернуты да лепшых людзей Расіі — «За нашу і вашу свабоду!». Сувязі з філаматамі падтрымлівала ўжо знаёмы нам Ігнат Даніловіч. Аддзяленні таварыства, якія называліся філіямі, існавалі ў Полацку, Віцебску, Свіслачы.

На сустрэчы, што ладзілі філаматы ў ваколіцах Вільні, збіраліся сотні юнакоў. На зялёным беразе ракі, альбо на лясной паляне каля вогнішча яны марылі пра свабоду, спявалі, чыталі вершы. У статуце таварыства гаварылася пра неабходнасць любіць і вывучаць родную мову. У большасці філаматаў яна была беларуская.

Сярод віленскай моладзі існаваў і план узброенага выступу супроць расейскай улады.

У 1823 годзе на след таварыства выйшла паліцыя. Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Ігнат Дамейка ды іншыя патрыёты апынуліся ў вязніцы. Тамаш Зан быў засуджаны да зняволення ў астрозе і высылкі і вярнуўся на радзіму амаль праз дваццаць гадоў. Адам Міцкевіч, які пазней стаў знакамітым паэтам, расказаў пра сваіх сяброў у неўміручай паэме «Дзяды».

Шмат хто з колішніх філаматаў таксама здабыў славу ў розных галінах. Тамаш Зан і Ян Чачот зрабіліся паэтамі. Ігнат Дамейка праславіўся як выдатны вучоны-геолаг. Ён даследаваў далёкую амерыканскую краіну Чылі і стаў яе нацыянальным героем. Язэп Кавалеўскі застаўся ў навуцы як знаўца Манголіі.

Думкі і мары філаматаў не зніклі бясследна. Былы філамат Міхал Рукевіч заснаваў новае таемнае таварыства «Ваенныя сябры». У яго ўваходзілі вайскоўцы, шляхцічы, гімназісты. «Ваенныя сябры» дзейнічалі на Гарадзеншчыне і Беласточчыне.



Ля каменя філарэтаў. Мастак Міхась Карпук. Музей А.Белага ў Старых Дарогах

У Віленскай медычна-хірургічнай акадэміі студэнт Францішак Савіч арганізаваў «Дэмакратычнае таварыства». Яно выступала за вызваленне сялянаў, роўнасць усіх жыхароў краю і перадачу ўлады народу.

Браты Аляксандр і Францішак Далеўскія стварылі «Братні саюз літоўскай моладзі», які яшчэ называлі «Саюзам свабодных братоў». Гэтае таварыства мела галоўную сядзібу ў Вільні і філіі ў Менску, Горадні, Навагрудку, Слоніме і Лідзе. «Свабодныя браты» рыхтавалі вызвольнае паўстанне. У фальварку Бараўляны пад Менскам яны выраблялі зброю і адлівалі кулі.

Расейскім жандарам удалося разграміць і гэтае таварыства. Змагароў кідалі ў турмы, высылалі, аддавалі ў салдаты, але барацьба супроць прыгнёту працягвалася.

## Змагары 1831 года

Увесну 1831 года Беларусь услед за Польшчаю зноў паўстала.

Найбольш чыннае змаганне разгарнулася ў Ашмянскім, Браслаўскім, Дзісенскім і Віленскім паветах. Трохтысячны аддзел з сялянаў і шляхты некалькі дзён утрымліваў горад Дзісна. А ўсяго на землях колішняга Вялікага Княства са зброяю ў руках выступілі супроць расейцаў больш за 30 тысячаў патрыётаў.

Цар кінуў на іх у некалькі разоў большую, добра ўзброеную і вымуштраваную армію. Карнікі перамаглі змагароў на Меншчыне і Віленшчыне, але паўстанне разгарэлася на Гарадзеншчыне. Расейцаў разбілі у Белавежскай пушчы.

У бітве на Панарскіх гарах пад Вільняй 25-тысячнаму царскаму войску ўдалося перамагчы. Але чатыры тысячы змагароў здолелі адарвацца ад ворага і рушылі на захад. Яны ішлі праз Жодзішкі, Смаргонь, Дзятлава, Дзярэчын, Зэльву, Поразава. Паўсюль да паўстанцаў далучаліся новыя ваяры.

Гэты паход выклікаў паўстанне ў Навагрудскім і Слонімскім паветах. Там змаганне ўзначаліў шляхціч Язэп Кашыч, які калісьці ваяваў у арміі Напалеона. Аддзел Кашыча хутка вырас да тысячы ваяроў. Яны вызвалілі мястэчка Беліца, а ў Навагрудку разбурылі расейскую варту і вызвалілі з астрога паплечнікаў. Іскры паўстання перакінуліся і на поўдзень — у Рэчыцкі, Мазырскі і Пінскі паветы.

Паўстанцы заклікалі расейскіх дэмакратаў разам ваяваць з царызмам «за нашу і вашу свабоду», але тыя адказалі маўчаннем.

## Эмілія Плятэр

У той гераічны год здабыла сабе вечную славу нашая зямлячка графіня Эмілія Плятэр.

У мірны час яна збірала беларускія песні і казкі, пісала вершы. Эмілія любіла народныя танцы. Асаблівa добра ў графіні атрымлівалася старадаўняя «Лепятуха», у якой яна лёталa перад гасцямі па зале, як птушка.

Калі пачалося паўстанне, Эміліі было дваццаць пяць гадоў. Адважная жанчына пакінула багаты дом, балі і забавы і далучылася да змагароў. Вось калі ёй вельмі спатрэбіліся яшчэ дзяцячыя захапленні коннай яздой і стральбой.

Маладая графіня стварыла вялікі паўстанцкі аддзел. За ўласныя грошы яна выдатна ўзброіла яго і, пераапрануўшыся ў мужчынскае адзенне, стала камандзірам чатырох сотняў жаўнераў. Сярод іх ваявалі яшчэ тыя, хто ў маладосці змагаўся пад сцягамі Тадэвуша Касцюшкі. Але і такія бывалыя жаўнеры паважалі графіню і выконвалі яе загады.

Аддзел Эміліі Плятэр вёў паспяховыя баі з карнікамі на мяжы Віцебшчыны і Віленшчыны. За гераізм графіня атрымала званне капітана. Вестка пра мужную ліцвінку-беларуску шырока разляцелася па свеце. Ёй прысвячалі вершы паэты ў Францыі, Англіі, Італіі, Нямеччыне.

Знясіленая ў баях і паходах, нялёгкіх і для загартаваных мужчын, Эмілія цяжка захварэла і згасала на вачах у паплечнікаў. Калі яна памерла, Адам Міцкевіч напісаў верш «Смерць палкоўніка». Паэт ведаў, што Эмілія — не палкоўнік, а капітан, але ад захаплення павысіў суайчынніцу ў вайсковым званні.

Вы, напэўна, ведаеце пра француженку Жанну д'Арк, якая ваявала за вызваленне сваёй радзімы. Эмілію Плятэр часам называюць беларускай Жаннай д'Арк.

## Міхал Валовіч

Царскія войскі бязлітасна задушылі паўстанне. Тысячы патрыётаў мусілі пакідаць радзіму. На чужыне апынуліся былы філамат Ігнат Дамейка і ягоны сябар, прыхільнік паўстанцаў Адам Міцкевіч. З бацькоўскай зямлёю развітаўся і яшчэ адзін выхаванец Віленскага ўніверсітэта, нядаўні паўстанец Міхал Валовіч.

Міхал знайшоў прыстанак у сталіцы Францыі Парыжы. Там пасялілася шмат выгнанцаў. Да іх ставіліся прыязна, бо гераізм нашых продкаў у 1831 годзе не дазволіў Расеі паслаць войскі, каб душыць рэвалюцыю ў Францыі.

Нядаўнія паўстанцы стварылі Таварыства Літоўскіх і Рускіх земляў і марылі аб працягу барацьбы. Міхал і яго таварышы хацелі аднавіць Канстытуцыю 1791 года, даць сялянам зямлю і абвясціць усіх людзей роўнымі. Яны пастанавілі зноў распачаць збройнае змаганне з расейцамі. Валовіча зацвердзілі паўстанцкім начальнікам слонімска-навагрудскай акругі.

Пакінуўшы спакойнае жыццё ў Парыжы, Міхал праз два тыдні дабраўся да роднай Слонімшчыны і стварыў партызанскі аддзел. Змагары жылі на закінутай смалакурні. Пад камандаю Валовіча было пакуль толькі дзесяць чалавек, але расейцы так перапалохаліся, што паслалі на іх болей за тысячу карнікаў. Калі Міхала арыштоўвалі, ён параніў кінжалам двух ворагаў, а потым, каб не дацца жывым, спрабаваў забіць сябе. На допытах трымаўся гераічна і не назваў нікога з паплечнікаў.

Партызанскага камандзіра прысудзілі да смерці. На адным з гарадзенскіх пляцаў паставілі шыбеніцу і сагналі мясцовых жыхароў. Ім абвясцілі, што зараз будзе павешаны небяспечны злачынец. Але людзі не верылі царскім катам.

Пад покрывам ночы расейскія салдаты перавезлі цела Валовіча ў стары вапнавы кар'ер і таемна закапалі, каб ніхто не ведаў, дзе магіла героя.

Калі-небудзь у Горадні абавязкова з'явіцца помнік Міхалу Валовічу.

***

Царскія ўлады адбіралі ў былых паўстанцаў маёнткі і шляхецкія правы. Быў зачынены Віленскі ўніверсітэт. За тое, што беларускія вуніяцкія святары падтрымлівалі змагароў, цар загадаў павесіць замкі на іхніх манастыры, якія называў «вражескими крепостями».

Але ніякія здзекі не паставілі народ на калені. Праз тры дзесяцігоддзі ліцвіны-беларусы зноў узяліся за зброю. Іх вёў Кастусь Каліноўскі…

### Пытанні і заданні

1. Чым заслужылі добрую памяць Міхал Бабpоўскі і Ігнат Даніловіч?
2. Хто ўваходзіў у таемнае таварыства філаматаў?
3. Аб чым марылі патрыёты?
4. Якія філаматы сталіся вядомымі ў свеце? Чым яны праславіліся?
5. Якія таемныя таварыствы працягвалі справу філаматаў.
6. Раскажыце пра пачатак паўстання 1831 года і баі змагароў з расейскімі карнікамі.
7. Колькі нашых продкаў узялі ў рукі зброю?
8. Ці дзейнічалі паўстанцы ў вашых родных мясцінах?
9. Што вы ведаеце пра графіню Эмілію Плятэр? Чаму яе называюць беларускай Жаннай д'Арк?
10. Хто такі Міхал Валовіч? Дзеля чаго ён вярнуўся з Парыжа ў Беларусь?
11. Чаму Валовіча так баяліся расейскія ўлады?
12. Як цар помсціў паўстанцам?

УРОК

# СЛУЦКІЯ ПАЎСТАНЦЫ

**Увосень 1920 года Расея і Польшча, якія тады ваявалі між сабой, падпісалі дамову пра замірэнне. Расейцы прапанавалі палякам забраць сабе Заходнюю Беларусь. Хоць яна была часткаю БССР, кіраўнікоў Савецкай Беларусі на перамовы з польскай дэлегацыяй нават не пусцілі. Гэта паказвала, якой у сапраўднасці была «незалежнасць» створанай камуністамі БССР. Але наш народ не хацеў мірыцца з тым, што родную зямлю дзеляць суседзі-драпежнікі. Беларусы са зброяй у руках баранілі незалежнасць. Прыклад змагання паказалі жыхары Слуцка і ягоных ваколіцаў.**



Штаб Булака-Балаховіча



Уладзімір Пракулевіч, кіраўнік Слуцкага збройнага чыну. Мастак Анатоль Крывенка



Эмілія Плятэр у сутычцы пад Шаўлямі. 1831 год. Карціна Войцеха Косака




Сцяг Слуцкага збройнага чыну

## Каб жыла Бацькаўшчына

Случчына з яе ўрадлівымі землямі па праву лічылася адной з самых багатых частак Беларусі. Там заўсёды жыло моцнае імкненне да незалежнасці. У час, калі палякі ўжо адступілі, а расейцаў яшчэ не было, случакі вырашылі распачаць барацьбу за ўсталяванне сваёй улады.

Напачатку сабраўся з'езд Случчыны. Ён праходзіў у доме багатага беларускага шляхціча Эдварда Вайніловіча, які пабудаваў Чырвоны касцёл у Менску, падтрымліваў беларускія выдавецтвы і газету «Наша Ніва». Залу з'езда ўпрыгожвалі бел-чырвона-белыя сцягі.

Дэлегаты з'езда прагаласавалі за падтрымку Беларускай Народнай Рэспублікі. Уладу расейскіх камуністаў яны назвалі чужынскай. З'езд пастанавіў узняць паўстанне за вольную Беларусь. Случакі спадзяваліся, што яно ахопіць усю краіну.

На з'ездзе абралі часовы ўрад — Раду Случчыны на чале з Уладзімірам Пракулевічам. Гэта быў адукаваны і паважаны чалавек, які тады працаваў у Слуцку суддзёй. Яго ведалі як адданага прыхільніка беларускай незалежнасці. Надзейным паплечнікам Пракулевіча ў Радзе стаў Павел Жаўрыд. Ён паходзіў з Слуцкага павета і меў добры вайсковы досвед, бо доўга служыў у войску афіцэрам.

Рада Случчыны ўзяла ўладу ў горадзе і навакольных вёсках. Усяго за тры дні яна здолела стварыць Слуцкую брыгаду стральцоў Беларускай Народнай Рэспублікі. Брыгада складалася з двух палкоў: Слуцкага і Грозаўскага, у які ўваходзілі жыхары мястэчка Грозаў і наваколля.

10 тысячаў случакоў былі гатовыя бараніць Беларусь ад расейскіх бальшавікоў. З Гарадні змагары атрымалі сцяг з прыгожа вышытай нашымі жанчынамі «Пагоняй» і словамі: «Тым, што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына».



Яшчэ ў 2003 годзе побач з царквой стаяў крыж памяці Валовіча і паўстанцаў. На загад праваслаўнага святара крыж выкапалі і кінулі побач са Шчарай

## І дзяды, і ўнукі

Паўстанцы пачалі баявыя дзеянні 27 лістапада 1920 года.

Слуцкім палком камандаваў падпалкоўнік Ахрэм Гаўрыловіч, а Грозаўскім — капітан Лукаш Семянюк. Яны падпарадкоўваліся камандзіру Слуцкай брыгады Антону Сокалу-Кутылоўскаму.

Аддзелы паўстанцаў занялі мястэчкі Семежава і Вызна (цяпер Красная Слабада) і працягвалі наступ на чырвонаармейцаў. У Семежаве знаходзіўся штаб паўстання.

Асабліва моцныя ўдары бальшавікі адчулі на лініі Капыль–Цімкавічы–Вызна. Слуцкія сяляне ўсім, чым маглі, дапамагалі паўстанцам. Часам зброю бралі ў рукі ўсе мужчыны ў сям'і — ад 70-гадовага дзеда да 15-гадовага ўнука.

У горадзе і вёсках расказвалі пра гераізм камісара Грозаўскага палка Васіля Русака, якога на Случчыне ведалі раней як здольнага артыста і спевака з мясцовага тэатральнага таварыства «Папараць-кветка». У баях вызначыліся таксама Марк Асвяцімскі, Юрка Лістапад, Юльян Сасноўскі, Янка Біруковіч і сотні іншых змагароў.

Трое слуцкіх хлопчыкаў-сяброў, Уладзік, Янка і Міколка, пад выглядам пастушкоў шмат разоў прабіраліся на заняты бальшавікамі абшар і прыносілі адтуль каштоўныя для паўстанцаў звесткі. У тым, што за мужнасць у баях Слуцкі полк атрымаў высокую ўзнагароду — залацісты сцяг з «Пагоняй», была і заслуга гэтай неразлучнай тройцы.

Масква паслала супроць паўстанцаў свежыя добра ўзброеныя палкі Омскай дывізіі, якія ў некалькі разоў пераважалі беларусаў колькасцю. Змагары з баямі адыходзілі на захад і перайшлі раку Лань, за якой стаялі польскія войскі.

Палякі, як і расейцы, былі супраць незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Яны раззброілі абаронцаў БНР і некалькі месяцаў трымалі іх пад аховаю ў лагеры. Але адзін батальён случакоў са сваімі афіцэрамі застаўся на роднай зямлі. Гэтыя 400 паўстанцаў яшчэ доўгі час ваявалі з бальшавікамі. Разам з імі з савецкага і з польскага боку дзейнічала больш за дзясятак беларускіх партызанскіх аддзелаў, аб'яднаных у арганізацыю «Зялёны Дуб».

Слуцкае паўстанне, якое доўжылася цэлы месяц, паказала свету, што беларусы хочуць жыць у сваёй незалежнай дзяржаве. Дзень 27 лістапада, калі пачаліся баі з бальшавікамі, — нашае вялікае нацыянальнае свята. Яго называюць Днём Герояў і штогод адзначаюць у Беларусі і паўсюль, дзе жывуць нашыя землякі.

## Случакі былі не адны

Супроць улады камуністаў змагалася не толькі Случчына. Паўстанні ўспыхвалі ў розных мясцінах Беларусі.

Паводле Берасцейскай дамовы бальшавікоў з немцамі, частка ўсходніх беларускіх земляў трапіла пад расейскую акупацыю. Камуністы праводзілі там гэтак званую «продразвёрстку» — забіралі ў сялян амаль усё збожжа, асуджаючы іх на голад.

Нашыя дзяды не маўчалі. За стрэльбы ўзяліся жыхары Полацкага, Аршанскага, Віцебскага ды іншых паветаў. У Сянне паўстанцамі ўмела кіраваў Зміцер Прышчэпаў. Пазней ён стаў народным камісарам земляробства ў савецкай Беларусі, але не захацеў падпарадкавацца Маскве і загінуў ад бальшавіцкай кулі.

Моцнае змаганне з камуністамі разгарнулася ў Вяліжскім павеце на Віцебшчыне. Адтуль барацьба перакінулася ў Смаленскую губерню. Нянавісць паўстанцаў да чужынскае ўлады была такой вялікай, што ў баях пад Вяліжам беларусы ішлі на расейскія кулямёты з косамі, віламі і сякерамі.

Свае сялібы баранілі жыхары ваколіцаў Гомеля, Рагачова, Рэчыцы, Нясвіжа, Міра… Улетку 1920 года чатыры дні трымалася Койданаўская незалежная рэспубліка.

## Генерал Булак-Балаховіч

У тыя гады грымела слава пра беларускага генерала Станіслава Булак-Балаховіча.

Ён прыйшоў на свет у тым самым маёнтку Мэйшты на Браслаўшчыне, дзе на сто трыццаць гадоў раней нарадзіўся Тамаш Ваўжэцкі. Тамаш пасля паланення Касцюшкі камандаваў паўстанцамі 1794 года. Станіслаў Булак-Балаховіч ведаў пра гэта і натхняўся славаю выдатнага земляка.

Са сваімі падначаленымі ён геройчна дзейнічаў супраць немцаў у гады Першай сусветнай вайны. Потым абараняў ад бальшавікоў маладую незалежную Эстонію.

Камандуючы вялікім конным аддзелам, ён прызнаў уладу БНР і ўдала ваяваў з Чырвонай арміяй.

Увосень 1920 года на чале цэлага войска з 20 тысячаў жаўнераў і афіцэраў Булак-Балаховіч зрабіў паход на Палессе. Ад бальшавікоў былі вызваленыя гарады Петрыкаў, Калінкавічы і Мазыр. Генерал абвясціў сябе «начальнікам» незалежнай Беларускай дзяржавы і выдаў загад пра стварэнне беларускай арміі. У шмат разоў большыя сілы Чырвонай арміі не дазволілі гэтым планам здзейсніцца. Але аддзелы баявога генерала яшчэ два гады не давалі спакою бальшавікам.

Слуцкія паўстанцы ды іхнія пабрацімы ў іншых кутках нашай зямлі ішлі ў бой з воклічам «Жыве Беларусь!»

Сёння гэтыя словы дарагія і блізкія кожнаму з нас.

### Пытанні і заданні

1. Дзеля чаго сабраўся з'езд Случчыны? Якія пастановы ён прыняў?
2. Хто кіраваў Радай Случчыны?
3. Якую збройную сілу здолелі стварыць случакі? Хто ёю камандаваў?
4. Раскажыце пра баявыя дзеянні паўстанцаў.
5. Хто з слуцкіх змагароў найбольш вызначыўся ў баях?
6. Дзе яшчэ беларусы падымаліся на паўстанні супраць бальшавіцкай улады?
7. Хто такі Булак-Балаховіч?
8. Які дзень мы называем Днём Герояў?

▸ ЭСЭ



Фота аўтара

# Ш(ЧАСЛІВЫЯ)ВЕДЫ

## ВЫСПЫ ДУМАК І ASTRAВЫ ПАЧУЦЦЯЎ

Аксана СПРЫНЧАН

**Ужо трэці год беларускія літаратары дзякуючы падтрымцы Каралеўства Швецыя і Саюза беларускіх пісьменнікаў маюць магчымасць творча адпачываць-працаваць у Балтыйскім цэнтры пісьменнікаў і перакладчыкаў у горадзе Візбю на шведскім востраве Готланд. «Літаратурная Беларусь» працягвае знаёміць сваіх чытачоў з іхнімі згадкамі і ўражаннямі.**



***Востраў***

Кінуць манетку мору, каб вярнуцца, кінуць хлеб чайкам, каб чакалі, кінуць слова на вецер (марскі, а не марны), каб закахаўся з першага слова.

***Выспа***

Некаторыя дамкі ў Візбю прасмоленыя дзёгцем і пахнуць мінулым. Каля іх квітнеюць ружы і пахнуць будучыняй. Калі заплюшчыць вочы, апынаешся ў сучаснасці.

***Востраў***

Няма ў Візбю, як і ва ўсёй Швецыі, бяздомных катоў і сабак. Увечары брукаванымі вулачкамі тупаюць вожыкі — улюбёнцы готландцаў і турыстаў. Неяк прынёс адзін на сваіх голках пялёсткі ружаў. І я ўзгадала вожыка з Лысай Гары, які мне паказваў свой язычок. 5 разоў-пялёсткаў. Вожыкі — цікава-колкія, як і іншая краіна. Вожыкі хаваюцца ад цябе ў клубочку, як і іншая краіна. Але могуць дазволіць дакрануцца да свайго жывоціка ці чмыхуць носікам, і ты падскочыш ад радасці. Я чула, як Готланд мне чмыхнуў.

***Выспа***

Візбю — найбольш захаваны ў Скандынавіі сярэднявечны горад. Дзе, як не ў ім, падумаць і пра тое, як жа заставацца самім сабой: стварыць свой уласны востраў, збудаваць мур, заплятаць сябе ружамі, стварыць музейчыкі, мець не толькі турыстычны сезон, але і час зімовых балтыйскіх вятроў, калі адно незвычайныя падарожнікі дабяруцца да цябе. А незвычайнае — яно найболей ахоўнае.

***Востраў***

Спёка. Мора пахне балотам. На вячэру Балтыка харчуецца сонцам-журавінаю.

***Выспа***

Готланд — мая першая сустрэча з Еўропай, першае антыдэмакратычнае каханне. Бо ніякага выбару ў мяне не было: перамагла ў конкурсе і атрымала прыз — паездку ў Швецыю на месяц. Дыктатура з адным кандыдатам.

***Востраў***

Паводле афіцыйных дадзеных археолагаў, Готланд займае першае месца паводле знойдзеных скарбаў, а Беларусь — другое. Паводле неафіцыйных звестак, Готланд і Беларусь мяняюцца месцамі. Бо які ж беларус аддасць скарб за 25 адсоткаў? Ды і беларуска не аддасць. Вось такая ракіроўка. А археолагам 25 адсоткаў і не абяцаюць, бо аддаваць скарбы — гэта іх пакліканне.

***Выспа***

Думала, што паеду ў Швецыю і буду шукаць на кожным даху дамок Карлсана. А ў Візбю дамкі такія нізкія, што, відавочна, Карлсану на іх не схавацца. Ды і Карлсана ў Швецыі не надта любяць, бо як аказалася, не вельмі ж ён станоўчы персанаж. А ўвесь Готланд у сувенірах з Піпі Доўгай Панчохай, спадаром Нільсанам, канём і злодзеямі. Выходзіць, яны больш станоўчыя. Праўда, аднаго Карлсана я ўсё ж такі бачыла: гэта маленькае крэселка для дзетак у бібліятэцы Альмедален, на якое можна сесці дупай і падум(п)аць пра больш станоўчых герояў.

***Востраў***

Сярод бязмежжа готландскіх сувеніраў танчыць шотас Піпі Доўгая Панчоха, скачуць спадар Нільсан і конь, бэкаюць бараны, тупаюць вожыкі, плывуць караблі, змагаюцца вікінгі, б'ецца на шчасце незвычайная готландская кераміка, асвятляюць шлях маякі, і адно няма шуму самога мора — ракавінак.

***Выспа***

На Готландзе знаходзіцца віла Пэпі Доўгай Панчохі — музей літаратурнага персанажа. І як тут не памарыць пра тое, што ў Беларусі калісьці з'явяцца Музей палескіх рабінзонаў — герояў Янкі Маўра. Альбо Музей-норка Мышкі Пік-Пік — гераіні Людмілы Рублеўскай. А чыгуначнікі дык ужо даўно маглі зрабіць замест вялікіх і малых паравозаў на пастаментах Музей Міколкі-паравоза — героя Міхася Лынькова. Беларусь — называюць краінай паэтаў. Першы крок, каб стацца і краінай літаратурных музеяў.

***Востраў***

У чалавека звычайна ёсць родныя сцены, якія дапамагаюць яму. А ў горада Візбю ёсць родная сцяна, узведзеная яшчэ ў XIII стагоддзі. Пашэнціла ж!

***Выспа***

Назва «Візбю» літаральна значыць «вёска ля Ві», а «vi» перакладаецца як «святыня, святое месца». Горад вырас блізу цэнтра паганскага культу. У назве маёй улюбёнай Лысай Гары слова «лысая» таксама значыць «яснае, святое месца». Гэта культавае месца, куды прыходзіла яшчэ Рагнеда. Дзе было створана пісьменніцкае мястэчка. Безумоўна, і ў Візбю невыпадкова ўзнік Балтыйскі цэнтр пісьменнікаў і перакладнікаў. Творцы і святыя мясціны ўзаемапрыцягальныя.

***Востраў***

І на востраве ста сабораў для мяне Беларусі храм вышэй зораў.

***Выспа***

Падчас расейска-шведскай вайны 1808—1809 гадоў Готланд колькі тыдняў быў расейскай правінцыяй. І як тут не пашкадаваць, што Беларусь не выспа. Далёкая-далёкая.

***Востраў***

Готланд — месца, дзе памятаеш, што сонца кладзецца спаць. Дзе не забываешся на тое, што перад сном яно найболей сонечнае, і таму варта кінуць усе справы, глядзець на яго і думаць пра сваё. І верыць у тое, што на ноч увесь востраў разам з сонцам схаваецца ў моры, і выйдзе на паверхню разам з першымі промнямі. Сны на Готландзе з марскога дна. Але нават на марскім дне чуваць гадзіннік бажніцы Святой Марыі. Яго музыка хваламі праходзіць праз твой сон, пакуль урэшце не адбіваецца дзявяты вал прачынання.

***Выспа***

Фатограф марыць пра аблокі, пра сонца ў патрэбным месцы, пра час пасля дажджу. Земляроб марыць то пра дождж, то пра сонца, марак — пра спадарожны вецер і адсутнасць шторму, рыбак — пра рыбнае месца. А ў паэта заўжды ўсё ёсць. Калі толькі ён яшчэ і не фатаграфуе, не працуе на зямлі, не плыве на караблі, не ловіць залатую рыбку.

***Востраў***

Ловіш фотавокам шведскія імгненні. І раптам апынаешся ў родным Лунінцы — герань на вакне вясковай хаткі, куст шыпшыны ля бажніцы, бярозка ў порце. Мае ўспаміны — кветкавыя. І з Лысай Гары я прывезла кветкі ў Візбю, пасадзіла пад вакном, што выходзіць да бажніцы Святой Марыі, жывучку. Сапраўды яна і пералёт перанесла, і прыжылася на схіле скалы. І зямлю лысагорскую не пакрыўдзіла я — прывезла гейхеру, якая цяпер красуе ў маім кветніку.

***Выспа***

Ёсць фатографы, якія займаюцца жывёлагадоўляй — студыйныя, пастановачныя фотаздымкі, а ёсць тыя, якія палююць на дзікія імгненні. Я люблю дзічыну. Сезон палявання заўжды адкрыты і абмежаванняў ніякіх не існуе.

***Востраў***

Перакладнік Лакана на расейскую мову Аляксандр Чарнаглазаў, з якім пазнаёмілася ў Балтыйскім цэнтры пісьменнікаў і перакладнікаў, устойліва ставіць беларусаў на другое месца. Калі служыў пэўны час у Беларусі, на ягоную думку сярод розных нацыянальнасцяў найлепшыя былі паўночныя архангельцы, на другім — беларусы. Сярод бальзамаў — найлепшы самаробны валаамскі, на другім — беларускі. Увесь час ён спрабуе давесці: Беларусь — не пісьменніца, а перакладніца — ганаровае другое месца пасля аўтара.

***Выспа***

Калі спёка ў Візбю становіцца невыноснай і ў галаве круціцца адно — «мяне няма», я разумею, што «Шчасце быць» Барыс Пятровіч у адрозненне ад Валянціна Акудовіча пісаў у лютаўскія маразы.

***Востраў***

На востраве ста цэркваў, якіх насамрэч 92, ніхто за мяне не моліцца. Малюся за сваю Беларусь.

***Выспа***

У готландскіх бажніцах часта вісяць пад скляпеннямі ці стаяць непадалёк алтара караблікі. Іх рабілі маракі, як ахвяру Богу. Але ж і сам храм — гэта карабель, які ратуе тых, хто шукае выратавання.

***Востраў***

Калі ляцела па-над ліпеньскімі аблокамі на Готланд, раптам адчула, што гэта і ёсць сапраўдны баланс белага, што дзесьці тут, у гэтай пяшчоце, нарадзілася Беларусь. Калі ляцела назад, у адным з аблокаў пабачыла твар мудрага Бога. Вярнулася ў краіну, дзе жыве Бог. ЖываЯ.

***Выспа***

У Візбю я навучылася глядзець у вокны. Нават заўважыла, што раней асабліва і не глядзела ў іх, а пагатоў не разглядала. На Готландзе ж я проста ашалела: вокны невялікага старажытнага горада, абведзенага мурам амаль у 3,5 км, не давалі мне праходу. Гэта сапраўдныя маленькія музейчыкі. То парцалянавых фігурак, то караблікаў, то свечнікаў… Напачатку было сорамна, што я ўвесь час імкнуся глядзець у вокны. А потым я пастанавіла, што гэтак і задумана было гаспадарамі, бо інакш навошта б яны іх так упрыгожвалі.

***Востраў***

Як добра гуляць у Батанічным садзе ўначы. Вядома ж, не ў менскім, бо той замыкаецца а 20-й гадзіне. Шпацыраваць добра ва ўтульным садзе Візбю, які нават уначы не замкнёны. А значыць, кветкі ў ім заўжды на свабодзе. І неістотна, што іх не відаць. Галоўнае, што і ты не пачуваешся замкнёным.

***Выспа***

Герб Готланда паўстаў у XIII стагоддзі. На ім выява барана, які трымае сцяг. Баран уважаецца сімвалам Ісуса Хрыста. Цікава, што раней часам замест барана малявалі авечку. Але ў 1936 годзе прыхільнікі мужчынскага пачатку перамаглі, і выяву барана замацавалі афіцыйна. Полава-гербавы гармідар скончыўся. Але, як ні цяжка паверыць, на Готландзе жыве такая парода авечак (не кажуць жа парода бараноў), у якіх таксама растуць рогі. Поўсць у готландскіх баранчыкаў незвычайна мяккая. Паўсюль прадаюцца цудоўныя скуры. Неяк зранку пісьменнікі задаліся пытаннем, навошта яны — скуры — патрэбныя? Хто казаў — на падлогу класці, каб нагам цёпла было, хто прапаноўваў на сцяну дзеля прыгажосці павесіць. Я ж упэўненая, што на такіх скурах — адно кахацца. Скуру каханаму не прывезла, бо грошай столькі няма. Затое жарсці хапіла б на сотні скураў.

***Востраў***

З ліста Надзвычайнаму і паўнамоцнаму амбасадару Швецыі ў Беларусі Стэфану Эрыксану: «Усё сапраўды было паводле майго ўлюбёнага прынцыпу трох Э: Эстэтычна, Эратычна і Энергетычна. Нездарма ж у беларускай мове паводле правіла Э пішацца пад націскам. А не пад націскам пераходзіць у А. Адчувальна, Адчайна, Анёльна хацелася ў Беларусь. Яшчэ адзін мой прынцып, за які я ўдзячная Швецыі».

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 3 СТУДЗЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 00.05** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**09.40** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Меладрама «Жаночая інтуіцыя-2».
**14.25** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**15.20, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**16.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**18.50** «КЕНО».
**19.00** Выбары-2010. Выступы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе» (ЗША).
**00.20** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
**00.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**01.45** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Катоўскі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў.
**22.30** АНТ прадстаўляе: «Музычны суд».
**23.40** Наша «Белараша».
**00.15** Прэм'ера. Фільм «Кароткае замыканне».
**03.00** Начныя навіны.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Першая дачка краіны». ЗША, 2004 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Вельмі эпічнае кіно». ЗША, 2007 г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Меладрама «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**10.45** Музычная камедыя-казка «Туфлі з залатымі спражкамі» (СССР). 2-я серыя.
**12.05** Кінаспробы.
**12.25** Жывы гук.
**13.10** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.00** «Расшыфравацьдрэс-код». Дакументальна- пазнавальны цыкл (Францыя).
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**16.40** Дакументальны фільм «Моцарт у лістах» (Францыя).
**17.40** Усё аб бяспецы.
**18.15** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**19.35** «Сусветная музыка галасамі Беларусаў». Канцэртная праграма.
**20.35** «Калыханка».
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.50** «Бітва экстрасэнсаў».
**22.55** «Пра мастацтва».
**23.25** Дыялогі аб рыбалцы.
**23.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**00.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Застылыя дэпешы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.20** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** «Дзяўчаты».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Фільм «Жаночае сяброўства».

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.25** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «У зоне адмысловай рызыкі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Бітва за Поўнач».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**22.10** Прэм'ера. «Жыццё без болю».
**23.25** Прэм'ера. Баявік «Турнір на выжыванне».

### EUROSPORT

**09.30, 16.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127.
**10.30, 14.30** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**11.30, 17.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**12.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Глазга, Шатландыя).
**18.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Жанчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**19.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). HS 138. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**20.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**21.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Аспен). Жанчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**23.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Спрынт.
**00.00** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live (Кіеў, Украіна).
**01.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**01.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі. HS 138. Кваліфікацыя.
**01.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Аспен). Жанчыны. Хуткасны спуск.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Праект «Будучыня».
**07.50** Асабістых капітал.
**08.10** Рэпартэр.
**08.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**08.55** Хто ёсць кім?: Зінаіда Бандарэнка.
**09.10** Басаног па свеце: «Людажэры».
**09.40** «Школа на санцапёку», серыял.
**10.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 9 серыя.
**10.50** «Украдзены цуд», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 9 серыя.
**18.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Сэрца за кратамі», дак. фільм, Беларусь.
**19.10** Маю правa (прававая праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Перад выбарам.
**20.55** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Амаль забыты фатограф», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Дазнанне», маст. фільм, 1982 г., Польшча.
**00.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Робін Гуд».
**00.10** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**00.15** Аб'ектыў.

## 4 СТУДЗЕНЯ, СУБОТА

---

**06.35** Мультфільм «Прыгоды пінгвіняткі Лола».
**07.05** Дзень спорту.
**07.15** Існасць.
**07.40** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.15** «Ваша лато».
**10.05** Латарэя «Пяцёрачка».
**10.20** Здароўе.
**10.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё»(Украіна).
**12.10** Лірычная трагікамедыя «Жэня, Женечка і «кацюша» (СССР).
**13.55** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**16.05** Nota Bene.
**16.30** «Млын моды- 2010» .
**17.00** Тэледэбаты кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**18.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Творчы вечар Р. Паулса.
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Фільм тыдня. Дэтэктыўны трылер «Мядзведнік» (ЗША).
**00.35** Дзень спорту.

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Разумніцы і разумнікі».
**12.00** «Хвіліна славы».
**14.00** Прэм'ера. «Урок даўжынёю ў жыццё».
**15.00** «Генадзь Хазанаў. Містычны аўтапартрэт».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Зваротны адлік».
**16.50** «КВЗ-2010».
**19.30** «Адзін супраць усіх».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Беларусь-гэта мы!».
**23.00** «Дэтэктар хлусні».
**00.05** «Што? Дзе? Калі?».
**01.20** «Пражэктарпэрысхілтан».

---

**06.40** Фільм «Макар - следапыт». СССР, 1984 г. Заключная серыя.
**07.45** Фільм «Першая дачка краіны». ЗША.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.25** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.55** Фільм «Рэспубліка ШКІД». СССР.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Жанчына, не схільная да авантур». Украіна, 2008 г.
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Сутычка». ЗША, 1995 г.
**00.30** Фільм «Ва ўсёй красе». ЗША, 2002 г.
**02.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.55** Усё аб бяспецы.
**08.20** «Рэальны свет».
**08.50** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.20** Жансавет.
**10.00** Дача здароўя.
**10.40** Рамантычная меладрама «Беражыце жанчын» (СССР). 1-я і 2- я серыі.
**13.25** Тэлебарометр.
**13.30** «Запал па культуры».
**14.10** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) -Металург (Новакузнецк). Прамая трансляцыя.
**19.20** Тэлебарометр.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Блэкпул-Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**21.25** Джэймс Бонд-Агент 007. Прыгодніцкі баявік (ЗША-Вялікабрытанія-Германія).
**00.10** Жывы гук.

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Фільм «Сямейная меладрама».
**08.30** «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Мая планета».
**12.00** Фільм «Жаночае сяброўства».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Шукальнікі». Дак. фільм.
**15.50** Фільм «Шосты».
**17.25** Прэм'ера. «Новая Хваля - 2010». Лепшае.
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Тэлесерыял «Сваты-3».
**00.35** Фільм «Вячэра ў чатыры рукі».

### НТВ

**07.30** «Агляд».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Прыгодніцкі фільм «Джэк Хантэр: у пошуках скарбаў Угарыта».
**16.20** Прэм'ера. «Апошняе слова».
**17.30** «Вочная стаўка».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія Рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Рускія сенсацыі».
**22.20** «Ты не паверыш!».
**23.25** «Музычны рынг НТБ».
**00.55** Крымінальны баявік «Падвойная ракіроўка-2».

### EUROSPORT

**09.30, 16.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі. HS 138. Кваліфікацыя.
**09.55** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**10.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі. Адборачны этап. Жанчыны. Шатландыя - Германія. Прамая трансляцыя.
**12.00** Санкавы спорт. Кубак свету ў Германіі (Вінтэрберг). Двойкі. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.30** Зімовыя віды спорту. Лыжныя гонкі (Нарвегія). Часопіс.
**12.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). HS 138.
**13.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі. Мужчыны і жанчыны. Спрынт. Вольны стыль. Прамая трансляцыя.
**15.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Мужчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**17.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі. HS 138. Прамая трансляцыя.
**18.45** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Шамперы). Адборачны этап. Жанчыны. Германія - Данія. Прамая трансляцыя.
**20.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША. Мужчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**21.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Аспен). Жанчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**22.55** «Снежны выходны». Агляд. Часопіс.
**23.00** Конны спорт. Турнір Мастэрс (Парыж, Францыя). Прамая трансляцыя.
**00.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Шамперы). Адборачны этап. Мужчыны. Шатландыя - Германія.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** На колах.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Калыханка для самых маленькіх.
**08.40** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**09.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Сэрца за кратамі», дак. фільм, Беларусь.
**10.15** Маю правa (прававая праграма).
**10.35** Невядомая Беларусь: «Амаль забыты фатограф», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**11.05** Перад выбарам.
**11.50** «Дазнанне», маст. фільм, Польшча.
**13.45** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**13.50** «Машына зменаў», серыял.
**14.50** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**14.55** Сальда (эканамічная праграма).
**15.10** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**15.15** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 9 серыя: «Крывавыя карыкатуры», 2007 г., Данія.
**16.05** «Ранча», серыял: 9 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.00** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Гаспадар...», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**18.30** Макрафон: канцэрт «Іх N.R.M – іх Мроя», ч. 2.
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Еўропа сёння.
**20.10** «Мультклуб».
**20.15** Вагон.
**20.25** Моўнік.
**20.35** Навігатар.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Улюбёная студэнтка», трылер, 2000 г., ЗША.
**22.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Белыя госці».
**22.55** Аб'ектыў.

## 5 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**07.45** Дзень спорту.
**07.55** Мультфільм «Прыгоды пінгвіняткі Лола».
**08.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага» .Ток-шоў (Украіна).
**12.10** Музычная камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (СССР).
**14.05** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Млын моды».
**16.00** Камедыйная меладрама «Нявернасць» (Расія).
**17.45** Відэафільм «Ідэальны горад графа Чарнышова» цыклу «Зямля беларуская».
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.05** Прэм’ера. Рамантычная меладрама «Нью-Йорк, я люблю цябе!» (ЗША-Францыя).

**ОНТ**

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**10.00** «Шалапутныя нататкі».
**10.20** Пакуль усе дома.
**11.20** «Фазэнда».
**11.55** «Ранішняя пошта».
**12.30** Асяроддзе пасялення.
**13.30** Тэлечасопіс «Звяз».
**14.00** Прэм’ера. «Урок даўжынёю ў жыццё».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай пажэнімся!».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.45** Прэм’ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: ток-шоў «Кухня».
**21.40** «Лёд і полымя». Працяг.
**23.25** «Вялікая розніца».
**00.30** Прэм’ера. Канцэрт групы «Іванушкі International».

**СТВ**

**06.15** Фільм «Сутычка». ЗША, 1995 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** Фільм «Страпуха». СССР, 1965 г.
**15.10** «Мінскі час». Відэафільм.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Гісторыя пра Трыстана і Ізольду». Германія - ЗША - Вялікабрытанія - Чэхія, 2006 г.
**23.00** Фільм «Поры года». Францыя - Турцыя, 2006 г.
**00.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

**06.35** Дабравест.
**07.00** Мір вашай хаце.
**07.15** Джэймс Бонд-Агент 007. Прыгодніцкі баявік (ЗША- Вялікабрытанія-Германія).
**09.50** Медычныя таямніцы.
**10.30** Школа рамонту.
**11.40** Тэлебарометр.
**11.45** Бухта капітанаў.
**12.25** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.10** Кінаспробы.
**13.35** «Правы чалавека».
**13.50** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**15.55** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**17.00** «Навагодні жарт з…» Гумарыстычная праграма (Расія).
**17.50** Трагікамедыя «Простыя рэчы» (Расія).
**19.50** Смешная часіна.
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Прыгодніцкі баявік «Ніколі не кажы «ніколі» (ЗША- Вялікабрытанія).
**23.25** Культасвет.
**23.55** Канцэрт Joe Satriani «Satriani Live» (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** «Мая планета».
**07.30** Тэлесерыял «Сваты-3».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Часы камoрнікаў».
**13.45** «Мая планета».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.45** «Рамантыка рамансa». Дак. фільм.
**16.40** Фільм «Дзень вяселля прыйдзецца ўдакладніць».
**18.30** Прэм’ера. «Усмешкі сяброў». Канцэрт-прысвячэнне.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм’ера-2010. «Стылягі-шоў».
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.10** 1/2 фіналу першай лігі «КВЗ».

**НТВ**

**07.20** Мультфільм.
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Справа цёмная».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Праспявана ў СССР».
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.20** «Развод па-руску».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм’ера. Вострасюжэтны фільм «Чалавек ніадкуль».
**00.05** «Асабліва небяспечны!».
**00.40** «Нерэальная палітыка».

**EUROSPORT**

**09.30** Часопіс «Еўраспорт за чыстую планету».
**09.35, 19.30, 00.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). HS 138.
**10.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі. HS 138. Прамая трансляцыя.
**11.30** Санкавы спорт. Кубак свету ў Германіі (Вінтэрберг). Жанчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.30** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**13.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі. Каманды. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**15.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі. HS 138. Прамая трансляцыя.
**16.45** Конны спорт. Турнір Мастэрс (Парыж, Францыя). Прамая трансляцыя.
**18.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**18.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**20.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША. Жанчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**21.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**22.25** «Снежны выходны». Агляд. Часопіс.
**22.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**01.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**01.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб’ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.10** Калыханка для самых маленькіх.
**08.40** Навігатар.
**09.00** Макрафон: канцэрт «Ix N.R.M – іх Мроя», ч. 2.
**09.35** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Гаспадар...», дак. фільм, Польшча.
**10.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.15** Вагон.
**10.20** «Мультклуб».
**10.25** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**11.25** «Улюбёная студэнтка», трылер, ЗША.
**12.55** «Чароўнае дрэва», серыял.
**13.25** «Сон-трава», канцэрт гурта «Троіца», ч. 1.
**13.55** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**14.00** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**14.20** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**14.25** Перад выбарам.
**15.10** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**15.15** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 10 серыя: «Кампанія», Японія.
**16.10** «Стабільнасць», дак. цыкл.
**16.15** «Ранча», серыял: 10 серыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Час гонару», серыял: 6 серыя.
**18.05** Дакументальная гадзіна: «Усяго найлепшага!», дак. фільм, 2008 г., Венгрыя–Аўстрыя–Германія.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Гальшанскіх».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Экспедыцыя на Мадагаскар».
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.50** Фільматэка майстроў: «Пасля канца свету», маст. фільм, 1998 г., Балгарыя.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Брыдуля».
**23.45** Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Будзьце ўважлівымі: змяніліся нашы рэквізіты ў банку і адрас рэдакцыі. Рахунак: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**
**Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________


## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ВЫБАРЫ

# ГАЛАСАВАННЕ ЯК АРГАЗМ

Алег НОВІКАЎ

**Праз сем гадоў праўлення кіроўнай кааліцыі — tripartito (цяперашні каталонскі ўрад складаецца з прадстаўнікоў трох партый: сацыялістаў, рэспубліканцаў і зялёных) — Каталонія знаходзіцца на пераломе. Да ўлады вяртаюцца правыя.**

Калі нічога сенсацыйнага не здарыцца, пасля выбараў 28 лістапада кіраваць краем будуць памяркоўныя нацыяналісты з партыі «Канвергенцыя і Саюз» (CiU). Прынамсі зараз усе сацыялагічныя прагнозы на іх карысць. CiU здольная атрымаць 63–65 месцаў у парламенце (усяго каталонскі корпус складаецца з 135 дэпутатаў) і стаць гаспадаром у аўтаноміі. Такім чынам, CiU адновіць статус-кво, парушаны левымі партыямі сем гадоў таму. Раней, з часу абвяшчэння аўтаноміі Каталоніі ў 1976-м, «Канвергенцыя і Саюз» без перапынку 26 гадоў кантралявала генералітэт (так называецца мясцовы ўрад).



У сваю чаргу, усе партыі блоку tripartito нешта губляюць. Сацыялісты могуць разлічваць хіба што на 20 працэнтаў (30–31 мандат). Раней у іх было 37. Зялёныя і іх саюзнікі з партыі Аб'яднаныя левыя (ICV—EUiA) будуць мець столькі ж, колькі і мелі, — сем мандатаў. Найбольшыя электаральныя страты ў нацыяналістаў з партыі «Левыя рэспубліканцы Каталоніі» (ERC). Іх фракцыя ў будучым парламенце паменшыцца больш чым удвая — з 23 да 9 мандатаў.




Што тычыцца іншых палітычных гульцоў Каталоніі, то Народная партыя (PP), якая традыцыйна выступае супраць пашырэння суверэнітэту Каталоніі, будзе мець трэцюю па колькасці дэпутатаў групу (прыкладна 14 мандатаў). Павялічыць сваё прадстаўніцтва і іншая антыкаталонская партыя — Ciutadans — Грамадзянская партыя. Гэта маладая фармацыя, якая змагаецца за роўныя правы каталонскамоўных і іспанамоўных жыхароў краю (як правіла, гэта нашчадкі працоўных эмігрантаў, якія прыехалі сюды ў 1960-я гады з іншых іспанскіх правінцый).

Відавочны правал галоўнай партыі незалежнікаў на фоне ўздыму лаяльных Мадрыду партый — добрая ілюстрацыя падзення цікавасці да тэмы незалежнасці. У шмат чым такая фрустрацыя звязаная з лёсам новай рэдакцыі Статута пра аўтаномію, які быў прыняты ў часы tripartito. Тэкст статуту, які абвяшчаў каталонцаў асобнай нацыяй і надаваў ім права на асобную фіскальную палітыку і ўласную палітыку ў рамках ЕС, у штыкі быў сустрэты ў цэнтры. Кіраўніцтва PP звярнулася са скаргай у Канстытуцыйны трыбунал, які пасля доўгай паўзы выкрасліў з тэксту закону шэраг ключавых параграфаў. Пратэсты супраць такога свавolля не набылі паслядоўнага характару.

Сацыялісты — галоўныя аўтары Статута пра аўтаномію — увогуле кажуць, што ва ўмовах рэцэсіі незалежніцкі праект небяспечны.

Толькі «Левыя рэспубліканцы Каталоніі» захавалі незалежніцкую рыторыку. ERC абяцае ў выпадку новай рэдакцыі tripartito навязаць кааліцыянтам «сапраўды дыскусію аб незалежнасці». З улікам таго, што патэнцыйныя саюзнікі, прынамсі сацыялісты, асцярожна ставяцца да такіх тэмаў, усё гэта выглядае мала рэальным.

Што да CiU, якая таксама лічыць сябе нацыяналістычнай партыяй, то яна клянецца пасля перамогі заняцца выпрацоўкай саліднай юрыдычнай базы. Гэта, быццам, з аднаго боку, дазволіць прымаць законы на карысць пашырэння правоў рэгіёну. З другога — юрыдычна не дазволіць цэнтру адмяніць іх. Таксама правыя выступаюць за новы пакт паміж Мадрыдам і Барселонай у галіне падатковай палітыкі.

На першы план у дадзенай кампаніі вышлі тэмы крызісу, экалогіі, міграцыі, адукацыі і правоў царквы.

Найбольш цікавай падаецца дыскусія пра эмігрантаў. Так здарылася, што гістарычна каталонскі нацыяналізм быў левым рэспубліканскім рухам, які супрацьстаяў касцільскай манархіі і Касцёлу. Цяпер, калі ў Каталоніі, з'явіліся першыя камуны, дзе эмігрантаў больш за тутэйшых, яны вымушаныя шукаць нейкі рэцэпт, як стварыць тут каталонскую ідэнтычнасць. Вялікая роля адводзіцца мове. Выключна тыя, хто здаў іспыт на веданне каталонскай мовы, могуць, па ідэі патрыётаў, атрымаць карту побыту і нават права кіраваць машынай.

Нягледзячы на тое, што вынікі выбараў, па вялікім рахунку, вядомыя ўжо зараз, цікавасць да іх вельмі вялікая. Калі верыць апытанням, да 74 працэнтаў выбаршчыкаў збіраюцца прыйсці ў дзень галасавання на ўчасткі. Такі высокі працэнт звязны з некаторымі аспектамі цяперашняй кампаніі. На гэты раз у выніку дэмаграфічных цыклаў сярод выбаршчыкаў будзе вялікая група маладых людзей, якія прагаласуюць упершыню (каля 120 тысяч). Гэта прымусіла спецыялістаў па палітычнаму піяру прыдумаць рэкламу, накіраваную на маладую аўдыторыю. Як следства — выбарчая кампанія стала больш цікавай і каларытнай.

Так, сацыялісты выпусцілі плакаты, на якіх іх лідэр намаляваны як супергерой: яго так і называюць — SuperMontilla. У адным з ролікаў сацыялістаў сцвярджалася, што галасаванне за іх партыйны спіс можа выклікаць аргазм. Кансерватары запусцілі кампутарную гульню, галоўны персанаж якой, правадыр PP, змагаецца з сацыялістамі і эмігрантамі (гульню, праўда, хутка забаранілі). Нарэшце, лідэр партыі «Каталонская салідарнасць» (Solidaritat Catalana) Жаан Лапорта, былы прэзідэнт футбольнага клубу «Барселона», узяў у сваю каманду порназорку, якая час ад часу паказвала стрыптыз на публіцы.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

З Беларуссю трэба мець адносіны, улічваючы досвед Іспаніі ў апошнія гады жыцця Франка. Палітычныя змены малаверагодныя, але эканамічная мадэль асуджана на смерць. Як у Іспаніі пры Франка, беларуская эканоміка зменіцца раней, чым Лукашэнка, стварыўшы базу для хуткага развіцця пасля яго сыходу.

**«The Guardian» (Вялікабрытанія)**

Нягледзячы на справаздачы ўрадаў пра поспехі ў падрыхтоўцы дакументаў па фармаванні АЭП (Адзінай эканамічнай прасторы), мясцовыя назіральнікі лічаць, што з новага года ніякіх змен не будзе. Мяркуючы па дзеяннях афіцыйнага Мінска, там таксама не вельмі вераць у хуткае стварэнне АЭП. У пятніцу прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прымаў у сябе прэзідэнта Дзяржаўнай нафтавай кампаніі Азербайджану. Пры гэтым беларускі лідэр заявіў пра гатоўнасць разглядаць «любыя варыянты супрацоўніцтва па вуглевадароднай сыравіне». Працягваючы думку Лукашэнкі, можна выказаць здагадку, што ад АЭП ён у любы момант можа адмовіцца.

**«Независимая газета» (Расія)**

Тое, як расце роля іншых дзяржаў у рэгіёне (Ірана і Турцыі, але, у першую чаргу, Кітаю), надае мясцовым лідэрам шмат прасторы для манеўру. Асабліва таму, што, як сказаў падчас свайго візіту ў Пекін у традыцыйна бестурботнай манеры Лукашэнка, «інвестыцыі Кітаю не звязаны ніякімі палітычнымі ўмовамі».

**«Project Syndicate» (ЗША)**

Цяперашняе пагаршэнне адносін паміж Крамлём і афіцыйным Мінскам ужо не здольна неяк істотна паўплываць на лёс беларускай мовы — час фармавання нацыі і стварэння новай, беларускай постсавецкай ідэнтычнасці прапушчаны. Акрамя таго, сам Лукашэнка дрэнна размаўляе на мове Купалы, Коласа і Багдановіча. Хаця аптымісты ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі думаюць інакш: маўляў, перажылі паланізацыю, перажылі русіфікацыю, перажывём і дэбілізацыю апошніх дзесяцігоддзяў.

**УНІАН (Украіна)**

Шматгадовая ізаляцыя Мінску не прынесла ніякіх вынікаў, і Захад вырашыў звярнуцца да іншай палітыкі, выкарыстоўваючы «Усходняе партнёрства» як сродак «уцягвання» ўсходняга суседа Польшчы ў еўрапейскія працэсы інтэграцыі. Стымулам для больш адкрытай падтрымкі «апошняга дыктатара Еўропы» стала таксама адсутнасць аб'яднанай апазіцыі. Зблiжэння Лукашэнкі з Бруселем асцерагаецца Расія. За гэты час Лукашэнка з «цацкі» Крамляператварыўся ў галоўнага абаронцу незалежнасці Беларусі. Лукашэнка папросту спрабуе ўтрымаць уладу любым коштам.

**«Wirtualna Polska» (Польшча)**

Рашэнне беларускага лідэра праігнараваць візіт кіраўніка МЗС РФ — відавочна дэманстратыўны жэст, паколькі дагэтуль прэзідэнт Беларусі заўсёды сустракаўся нават з расійскімі губернатарамі. Не дапамагло і тое, што Сяргей Лаўроў яшчэ да прыезду ў Мінск абвясціў, што, у адрозненне ад сваіх заходніх калегаў, з лідэрамі беларускай апазіцыі сустракацца не будзе. Эксперты мяркуюць, што падобная лінія паводзін Мінску ў дачыненні да Масквы звязана з нядаўнімі візітамі ў Беларусь кіраўнікоў МЗС Германіі і Польшчы, а таксама прэзідэнта Літвы. Еўрапейскія міністры паабяцалі Мінску фінансавую дапамогу ў памеры 3 мільярдаў долараў у выпадку правядзення сумленных прэзідэнцкіх выбараў, а прэзідэнт Літвы заявіла, што працяг кіравання спадара Лукашэнкі з'яўляецца гарантыяй стабільнасці Беларусі, а таксама таго, што гэта краіна «не ператворыцца ў Расію». Натхнёны такімі жэстамі прэзідэнт Беларусі палічыў, здаецца, што момант для ўзмацнення жорсткасці падыходу да Расіі як ніколі спрыяльны.

**«Коммерсантъ» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГРУЗІЯ. ПАЧАЛАСЯ ЗАКЛАДКА ДРУГОЙ СТАЛІЦЫ

Міхаіл Саакашвілі ўрачыста заклаў першую цэглу ў фундамент будучага офісу грузінскага парламенту ў горадзе Кутаісі. Менавіта Кутаісі па планах Саакашвілі павінен стаць рэзідэнцыяй Кабміну і парламенту, у той час як прэзідэнт застанецца ў Тбілісі. Такім чынам, Кутаісі стане другой сталіцай Грузіі. Ідэя дэцэнтралізацыі ўлады даўно захапіла Саакашвілі, і вось нарэшце яна пачала рэалізоўвацца. Акрамя таго, перадача Кутаісі часткі функцый сталіцы, па словах прэзідэнта, дапаможа палітыкам акунуцца ў жыццё простага, а не сталічнага люду. Мясцовыя жыхары, быццам, не супраць праекту, паколькі з пераездам чыноўнікаў узрасце попыт на кадры і сервісную абслугу. А вось палітычныя апаненты Саакашвілі прагназуюць развал адміністратыўнай вертыкалі. Падчас узвядзення будынку парламента ўжо загінулі два чалавекі. Як лічаць апаненты дзеючай улады, гэта кепскі знак. Дэпутаты, якія будуць працаваць у такім праклятым месцы, нічога канструктыўнага не зробяць.

**Па матэрыялах «Грузия инфо» (Грузія)**

### УКРАІНА. ХТО БУДЗЕ СПАРЫНГ-ПАРТНЁРАМ?




Плёткі пра тое, што Партыя рэгіёнаў падтрымлівае рэсурсамі нацыяналістычную партыю «Свабода» (лідэр Алег Цягнібок), хадзілі даўно. Нават «свабодаўцы» перасталі асабліва рэагаваць на такога кшталту спекуляцыі. Аднак пры гэтым панавала думка, што Партыя рэгіёнаў, надаючы падтрымку «Свабодзе», жадае выключна паслаблення пазіцый аранжавых у Заходняй Украіне. І вось —сенсацыя. Блізкая да Партыі рэгіёнаў газета «Сегодня» сцвярджае, што існуе план ператварэння Алега Цягнібока ў галоўнага палітычнага праціўніка Януковіча. Па сутнасці, гэта новая рэдакцыя палітычнай гульні, у якую калісьці гуляў Леанід Кучма. Калі прыходзіў час выбараў, ён раскручваў камуністаў да ўзроўню галоўнай альтэрнатывы сваёй уладзе і пасля прапанаваў электарату выбар: больш-менш адэкватны Кучма або фанатычны ленінец, старшыня Кампартыі Сіманенка. Такую ж схему, калі верыць «Сегодня», хоча стварыць і Януковіч. Толькі месца Сіманенкі павінен заняць Цягнібок.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. СЕПАРАТЫСТЫ СІЛЕЗІІ ПРАЙШЛІ Ў СЕЙМІК

Сенсацыяй скончыліся выбары ў сойм ваяводства Сілезіі. Сюды ўпершыню ў гісторыі патрапілі кандыдаты ад «Руху аўтаноміі Сілезіі» (RAS) — партыі, якая выступае за федэралізацыю Польшчы. RAS атрымала каля 9 працэнтаў. Што да агульных вынікаў выбараў, то ўрадавая партыя Грамадзянская платформа (PO) здолела абараніць лідзіруючыя пазіцыі. У цэлым партыя прэм'ера Дональда Туска атрымала каля 31 працэнта галасоў. Яе кандыдаты сталі мэрамі Гданьска, Варшавы, Беластока ўжо па выніках першага тура. Узмацнілі пазіцыі Сялянская партыя і Саюз левых дэмакратаў, якія набралі адпаведна 16 і 15 працэнтаў. Досыць шмат грамадзян аддалі голас за незалежных кандыдатаў (13 працэнтаў). Галоўным лузерам, безумоўна, стала кансерватыўная партыя «Права і Справядлівасць» (PiS), якая атрымала толькі 23 працэнты. У пераліку на жывыя галасы гэта значыць, што за апошнія месяцы партыя страціла 3 мільёна выбарцаў. Нядзіўна, што адразу па выніках выбараў ажывілася група ліберальна-кансерватыўных палітыкаў, нядаўна выключаных з PiS за крытыку кіраўніцтва. Хуткім часам яны правядуць устаноўчы з'езд руху «Polska Jest Najwazniejsza» («Польшча — гэта самае важнае»).

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### ПАЎНОЧНАЯ КАРЭЯ. КІТАЙ РЫХТУЕ НАПАД?

Абвастрэнне адносін паміж Паўночнай і Паўднёвай Карэй выклікала шмат каментараў. Як ні парадаксальна, большасць аналітыкаў сцвярджаюць, што вынікам канфрантацыі можа стаць перабудова на Поўначы. Версія будуецца на тым, што Пекін, які з'яўляецца нефармальным спонсарам Пхеньяну, не зацікаўлены ў нестабільнасці каля сваіх межаў. КНР можа ўмяшацца ва ўнутраныя палітычныя працэсы ў Карэйскай Народнай Дэмакратычнай Рэспубліцы (КНДР). Кажуць, што справа можа не абмежавацца проста гнеўная размовай. Як заявіў Дзмітрый Касценка, блізкі да пасольства КНДР у Расіі, кіраўнік Грамады па вывучэнню ідэяў Чучхе, у дыпламатычных колах Паўночнай Карэі ходзяць плёткі пра тое, што Кітай рыхтуе інтэрвенцыю ў КНДР. Кітайскія салдаты будуць атакаваць не як іншаземцы, а пад лозунгам рэстаўрацыі прынцыпаў кіравання вялікага правадыра Кім Ір Сена, якія быццам ігнаруе цяперашні ўрад краіны. У любым выпадку, якой бы ні была форма знешняга ўмяшання Кітаю, яна пакладзе канец цяперашняй мадэлі дзяржаўнага і эканамічнага ладу КНДР.

**Па матэрыялах «Life Journal»**

ЦІКАВА

# ЦІ СТАНЕ КЕЙТ ДРУГОЙ ДЫЯНАЙ?

**Алег НОВІКАЎ**

**Не паспелі прынц Уільям і ягоная сяброўка Кейт Мідлтан абвясціць пра намер у наступным годзе пабрацца шлюбам, як у Вялікабрытаніі пачалася бурная палеміка, ці не паўтарыць Кейт трагічны лёс прынцэсы Дыяны. Прапаную агляд благасферы на гэтую тэму.**



Галоўных накірунку дыскусіі на англійскіх форумах два.

Дыяна Спенсар — маці Уільяма, загінула ў 1997 годзе, аднак дух яе жыве і нябачна прысутнічае ў сценах каралеўскай рэзідэнцыі — Букінгемскага палацу. Менавіта лэдзі Дзі заклала новыя стандарты інстытуту брытанскай прынцэсы. Дыяна пасля шлюбу з Чарльзам зрабіла з сябе публічную асобу першага дывізіёну. З 1981-га (год іх вяселля) да самай смерці ў 1997-м яна была жанчынай, якую найбольш часта фатаграфавалі ва ўсім свеце. Усе адзначалі яе харызму, стыль, густ, прафесіяналізм, дэмакратычны стыль. У выніку гэта ўсё і стварыла жонцы шэрага Чарльза імідж народнай прынцэсы. Хоча ці не хоча Кейт, аднак, прыняўшы сан прынцэсы, яна ставіць сябе ў сімвалічную канкурэнцыю з любімай у народзе Дыянай.

Па-другое, Дыяна перажыла асабістую і сямейную трагедыю. Нягледзячы на папулярнасць, яе не любілі пры двары. Канфлікт з мужам і каралевай стаў прычынай асабістага псіхічнага крызісу. Яна, маючы двух дзяцей, нават думала пра суіцыд. Закончылася ўсё разводам. «Ці здолее Кейт прыстасавацца да нораваў каралеўскага дому?» — гадаюць на інтэрнэт-форумах.

Перад тым, як паспрабаваць зрабіць агляд каментараў, варта агучыць цікавы тэзіс, які сустракаецца на сайтах брытанскіх рэспубліканцаў. На іх думку, Кейт стала ахвярай сістэмы хлусні і падману — прыродных рысаў брытанскай манархіі. Быццам ідэю шлюбу Кейт і Уільяма падкінулі ўрадавыя піяршчыкі. Сэнс быў у тым, каб за кошт шуміхі вакол вяселля адцягнуць увагу брытанцаў ад будучага скарачэння сацыяльных ільготаў — следства прынятага ў кастрычніку пакету драконаўскіх законаў.

Прынцу, які, быццам, не мае моцных пачуццяў да Кейт, далі інструкцыю — прапанаваць ёй руку і сэрца. Наіўная дзяўчына паверыла, што гэта і ёсць вялікае каханне, і пагадзілася. Пасля шлюбу, робіць прагноз брытанскія якабінцы, яе чакае шок і драма.

Цяпер пяройдзем да агляду каментараў.

Шмат хто лічыць, што Кейт — гэта амаль што рэінкарнацыя Дыяны, якая рэабілітуе прэстыж дынастыі. Карыстальнік Эндру піша: «З часоў смерці лэдзі Дзі каралеўская сям'я не выклікала такога інтарэсу, як зараз. Хаця ўвесь свет любіў Дыяну, Кейт Мідлтан, здаецца, вельмі добра ўспрымаюць у грамадстве».

Некаторыя кажуць, што заручыны — гэта сімвалічная кропка ў трагічнай гісторыі з Дыянай. «Навіна пра шлюб — гэта нарру end трагічнай гісторыі ў гэтай сям'і», — можна прачытаць на адным з форумаў.

Аднак ёсць і апазіцыя. Не паспелі Уільям і Кейт абвясціць пра будучы шлюб, як на бедную нявесту наляцела зграя фанатаў Дыяны. Вось адзін з тыповых каментараў прадстаўнікоў гэтага лагеру: «Будучая каралева Англіі ніколі не будзе мець такой прыгажосці і чысціні сэрца, элегантнасці, якія мела Дыяна Спенсар. Народ Англіі заўсёды будзе з настальгіяй згадваць пра яе. Яна (Дыяна), у адрозненні ад Кейт, была сапраўды народнай прынцэсай».

Часам прыхільнікі Дыяны даходзяць да радыкальных заключэнняў. Нехта Бэнкс піша: «Той факт, што ў якасці заручальнага пярсцёнка Уільям прапанаваў сваёй нявесце пярсцёнак Дыяны, вельмі нядобры знак. Каралеўская сям'я робіць кепскія шлюбы, як шлюбы прынца Эндру або прынца Чарльза. Гэта праклятая дынастыя».

Іншыя бачаць у апошніх падзеях нейкую хітрую схему, якую прыдумала прагматычная Кейт. Нагадаем, што яна пазнаёмілася з Уільямам падчас вучобы ў шатландскім універсітэце Святога Андрэя. З тых часоў яны сустракаліся амаль 8 гадоў. Некалькі разоў прэса пісала пра тое, што іхнія адносіны на мяжы разрыву, аднак пасля ўсё вярталася на свае месцы. Кейт такі доўгі час пагаджалася заставацца папросту сяброўкай Уільяма, што падштурхнула брытанскіх журналістаў прыдумаць ёй мянушку — Цярплівая Кейт. Натуральна, тут не абышлося без тэорый пра тое, што яна з самага пачатку кіравалася ўстаноўкай — любым коштам «выскачыць замуж за прынца».

«Я чытала пра яе першую сустрэчу з прынцам. Яна ўсе разлічыла: дзе і як пазнаёміцца і як яму спадабацца», — сцвярджае карыстальніца Джульета.

Іншыя прыхільнікі наадварот спачуваюць: «Дзяўчына, якая марыла пра кар'еру і свабоду, цяпер усё астатняе жыццё правядзе ў залатой клетцы, пераразаючы стужкі падчас адкрыцця розных мерапрыемстваў і абвяшчаючы сябе ганаровым старшынёй нейкіх асацыяцый. У 28 гадоў гэта жудасна. Я асабіста абіраю жыццё».

Не бракуе брытанцаў, якія баяцца, што Кейт і каралева Елізавета не знойдуць агульнай мовы. Яны заклікаюць звярнуцца да каралевы, каб такая не ўмешвалася ў сямейнае жыццё ўнука: «Пакіньце Уільяма. Дадзім яму права жыць асабістым жыццём, не адмаўляючы мінулага».

Пакуль рана рабіць нейкія заключэнні з гэтай палемікі, якая толькі набірае ход. Тым больш, кожны дзень дадаюцца новыя факты. Так, у аўторак, 23 лістапада, сталі вядомыя дадзеныя апытанняў грамадзян Аб'яднанага Каралеўства, адпаведна якім, большасць брытанцаў выступаюць за тое, каб пасаду манарха пасля смерці каралевы Елізаветы заняў не Чарльз, а Уільям. Ці пагодзіцца на гэта Чарльз? Ці пойдзе сын на бацьку, жадаючы адпомсціць за



МЕРКАВАННЕ

# ВЯРТАННЕ МАЛДОЎСКАГА ЛУКАШЭНКІ

**28 кастрычніка ў Малдове пройдуць датэрміновыя парламенцкія выбары. Якіх вынікаў трэба чакаць? На гэта і іншыя пытанні журналіста «НЧ» Алега Новікава адказвае ўкраінскі палітолаг Віктар Вернік.**



***— У якой атмасферы праходзяць выбары?***

— Закон пра выбары часовы выканаўца абавязкаў прэзідэнта Міхай Гімпу падпісаў пасля правалу рэферэндуму, ініцыятарам якога ён быў. На разгляд выбаршчыкаў было вынесена пытанне наконт неабходнасці абрання прэзідэнта праз наўпроставыя выбары (зараз гаранта абірае парламент). Праект Гімпу праваліўся з-за вельмі высокага ўзроўню абсентэізму. Нават рэзка зніжаны незадоўга да рэферэндуму парог яўкі з 60 да 33 працэнтаў не паўплываў на сітуацыю. З іншага боку, рэферэндум прадэманстраваў відавочныя фрустрацыю і канфлікт у асяроддзі сяброў кааліцыі — Альянсу за еўрапейскую інтэграцыю. Менавіта фармат кааліцыі, які складаецца з чатырох палітычных сіл, на працягу апошняга года, фактычна, вызначаў структуру ўлады ў Малдове. Зыходзячы з правалу рэферэндуму, некаторы сегмент кааліцыі схільны да шматвектарных манеўраў, у тым ліку і з прадстаўнікамі расійскіх інтарэсаў.

***— Як можна ахарактарызаваць кожнага з суб'ектаў Альянсу за еўрапейскую інтэграцыю?***

— Першую скрыпку тут гуляе Ліберальная партыя Малдовы (лідэр Міхай Гімпу). Мэтавая група партыі — грамадзяне Малдовы, якія з'яўляюцца прыхільнікамі хуткага аб'яднання з Румыніяй. Адгэтуль і неадэкватныя заклікі ЛПМ да закупак Малдовай расійскага газу па «еўрапейскіх коштах», і заклікі ў 25-градусны мароз тэрмінова падлучыцца да газаправоду «Набука», якога яшчэ няма ў прыродзе. Ну і, зразумела, скандальны Указ прэзідэнта Гімпу пра «савецкую акупацыю Малдовы».

Галоўны канкурэнт партыі Гімпу — Ліберальна-дэмакратычная партыя Малдовы (лідэр Уладзімір Філат, прэм'ер-міністр Малдовы). На дадзены момант ЛДПМ мае адну з лепшых у краіне рэсурсных баз. ЛДПМ, у цэлым, традыцыйна ідзе ў фарватэры прарумынскай палітыкі, аднак праводзіць гэту лінію ў форме культурных правакацый. На рахунку ЛДПМ — ініцыятыва пра забарону паказу мастацкіх фільмаў на рускай мове без цітраў на румынскай мове, зачыненне папулярнай у Малдове рускамоўнай радыёстанцыі «Серебряный дождь». Складаецца ўражанне, што на дадзеным этапе адкрытае і радыкальнае супрацьстаянне расійскаму ўплыву ў Малдове мае ролю асноўнай казырнай электаральнай карты партыі.

Яшчэ ёсць Дэмакратычная партыя Малдовы (лідэр Марыян Лупу). Лупу, у мінулым кіраўнік Кампартыі і спікер парламента Малдовы, з'яўляецца на дадзены момант адным з найбольш аўтарытэтных палітыкаў. Аднак разнашэрснасць і палітычная нявызначанасць партыі сталі прычынай таго, што ДПМ не задае ініцыятыву ў рамках кааліцыі. Пры гэтым, аднак, варта адзначыць, што практычна ўсе крылы і групы ў ДПМ не з'яўляюцца прыхільнікамі канфрантацыі з Расіяй, ім не падабаецца праект дзяржаўнай інтэграцыі Малдовы з Румыніяй.

Альянс «Наша Малдова» (АНМ) (лідэр Серафім Урэкяну, былы мэр Кішынёва) лічыцца найбольш слабым сегментам кааліцыі і адначасова найбольш лаяльным да ўсходняга вектару знешнепалітычнай арыентацыі Малдовы.

***— Якія адносіны склаліся ўнутры кааліцыі пасля яе прыходу да ўлады?***

— З самага першага дня стварэння ўраду на базе Альянсу за еўрапейскую інтэграцыю чатырох партый пачалася барацьба за паслабленне сваіх кааліцыйных саюзнікаў. Так, ЛДПМ яшчэ ў 2009 годзе зрабіла цэлы шэраг сур'ёзных кропкавых udараў па пазіцыях ДПМ — «спецаперацыі» з гучным прапагандысцкім эфектам для дыскрэдытацыі партыі Лупу. Напрыклад, спецаперацыя «Рыба» — гаворка пра абвінавачванні на адрас ДПМ у тым, што партыя кантралюе так званую «рыбную мафію». Таксама АНМ разам з ДПМ адкрыта выказала сваё катэгарычнае непрыманне ідэі ЛПМ і ЛДПМ пра адпраўку малдаўскіх салдатаў у Афганістан. У гэтай сітуацыі, відавочна, што па шэрагу ключавых пытанняў актуальным становіцца блакаванне па сваёй сутнасці цэнтрысцкіх ДПМ і АНМ. Магчымы іх блок з камуністамі.

***— Што вы думаеце наконт перспектыў камуністаў на гэтых выбарах?***

— Партыя камуністаў Рэспублікі Малдова (ПКРМ) як вядучая апазіцыйная сіла выклікае вялікую цікавасць. Нават патрапіўшы ў апазіцыю пасля шматлікіх гадоў знаходжання ва ўладзе, ПКРМ у мясцовых рэгіянальных органах улады і самакіраванні Малдовы і цяпер мае каля 25% муніцыпальных чыноўнікаў. Існуе вялікая колькасць рэгіянальных мэраў рознага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўзроўню сябраў партыі. Адначасова аб'ектыўна ПКРМ была і застаецца так ці інакш злучанай з асноўнай базай свайго традыцыйнага электарату — пенсіянерамі і рускамоўным насельніцтвам гарадоў і раённых цэнтраў Малдовы. Тым больш, ужо знаходзячыся ў апазіцыі да «румынаў», падтрымка ПКРМ маскоўскага вектару была відавочная.

Але наўрад ці гэта канчатковы геапалітычны выбар. Раней перыядычны флірт прэзідэнта Вароніна з Расіяй змяняўся перыядычнымі канфліктамі, якія, у сваю чаргу, змяняліся рэзкім пацяпленнем. Нешта падобнае на адносіны з Масквой Лукашэнкі. Таму Масква ўрэшце і не падтрымала Вароніна.

***— Якімі, па вашых прагнозах, будуць вынікі выбараў?***

— Парламенцкія выбары 28 лістапада 2010 года могуць самым рашучым чынам трансфармаваць сітуацыю ва ўладных калідорах Малдовы. Большасць партый кааліцыі ўжо паспяшалася заявіць пра тое, што на выбары яны ідуць самастойна. Гэта фактычна значыць, што фракцыя ПКРМ зноў стане самай значнай парламенцкай сілай Малдовы. А адгэтуль аб'ектыўна ўзнікае і своеасаблівая глеба для наступнага якаснага перафарматавання парламенцкай большасці і ўрадавай кааліцыі. Аднак нікому не зразумела, у які бок. Варонін ні ў ЕС, ні на шчыльны саюз з Масквой ісці не гатовы.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ГІРТ КРЫСТОЎСКІС



Новаспечаны кіраўнік МЗС Латвіі, сябра партыі «Грамадзянскі саюз», не паспеў атрымаць партфель міністра, як вакол яго персоны выбухнуў гучны палітычны скандал. Ужо на наступны дзень пасля зацвярджэння складу новага ўрада Латвіі парламенцкая апазіцыя запатрабавала адстаўкі Гірта. Нагодай сталі выказванні міністра ў перапісцы з латышскім эмігрантам, доктарам Айварам Слуцысам, вядомым сваімі нацыяналістычнымі поглядамі. Слуцыс, які пражывае ў ЗША, прызнаўся, што «не змог бы лячыць рускіх гэтак жа, як і латышоў», і прапанаваў падумаць ураду над праектам татальнай рэпатрыяцыі рускіх. Крыстоўскіс цалкам пагадзіўся з прапановай. Гэта і стала чыннікам скандалу. Акрамя таго, Гірту ўзгадалі «наезд» на рыжскага мэра Ніла Ушакова за тое, што апошні неяк вылаяўся рускім матам. Дзякуючы парламенцкай большасці, Гірт, праўда, захаваў крэсла міністра. А вось у Слуцыса праблемы. Грамадскія арганізацыі ЗША чыняць ціск на яго працадаўцу. Партыя «Грамадзянскі саюз» была змушана выключыць доктара са сваіх шэрагаў і вярнуць усе яго ахвяраванні. Хаця многія лічаць, што той жа лёс чакае і Гірта. Пасля скандалу за ім цвёрда замацавалася мянушка «міністр ксенафобіі».

### УЛАДЗІМІР ФІЛАТ



Старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Малдовы (ЛДПМ) напярэдадні выбараў асабіста разрэкламаваў новы прапагандысцкі праект — спектакль «Што рабіць з дзедам?», прызначаны для студэнцкай аўдыторыі. У аснове драмы жыццё простай малдаўскай сям'і: бацька на заробках, маці таксама на чужыне (патрапіла ў сексуальнае рабства), дзядуля — прыхільнік Кампартыі, а ўнукі — удзельнікі прарумынскіх пратэстаў 2009 года. Унукі думаюць, як не пусціць дзеда прагаласаваць на выбарах за партыю камуністаў (галоўны супернік ЛДПМ). Маладыя людзі спрабуюць спачатку пераканаць дзеда, даказваючы, што ўся эканоміка краіны трымаецца не на фігуры Вароніна (лідэр камуністаў), а на грошах гастарбайтэраў. Аднак пенсіянер трымаецца, як партызан на допыце. Тады маладымі прымаецца самае простае рашэнне — старога на інвалідны калясцы ў дзень выбараў трэба прыкуць ланцугом да плота. Надышоў дзень выбараў — дзеда, як і было, вырашана, прыкулі ланцугом да плота. Але дзед аказваўся цёртым калачом, неяк зламаў замок і пачаў шураваць на калясцы да варот. Унучка заступіла яму дарогу, пачала гаварыць, што з-за такіх, як ён, яе мама і тата мусяць працаваць за мяжой, і наогул, лепш бы ўсе старыя памерлі. Дзед неадкладна памірае. «Дзед памёр! — крычыць залітая слязамі ўнучка. — Зараз мама вернецца дахаты!» Заслона. Усе плачуць. Вось такі дзіўны агітпроп ад ліберал-дэмакратаў. Паглядзім, ці дапаможа Філату тэатральнае мастацтва выйграць выбары.

### ЖАН-ЛЮК МЕЛАНШОН



Яго можна лічыць героем тыдня ў Францыі. Жан-Люк — лідэр французскай Партыі Левых (PG), якая паўстала ў выніку расколу Партыі сацыялістаў. Раскол адбыўся два гады таму. Менавіта тады Меланшон абвясціў пра пачатак свайго праекта — Партыі Левых. Ідэю палічылі ўтопіяй хоць бы з-за таго, што ў той жа час актыўна прасоўваўся праект Новай антыкапіталістычнай партыі, створанай трацкістамі для аб'яднання ўсіх радыкальных левых. Пасля кангрэса PG, які адбыўся ў мінулыя выходныя, шмат хто ўзяў свае словы назад. PG на вачах становіцца зўважным суб'ектам французскай палітыкі. За два гады яна здолела забраць да сябе дэпутацкія групы як у нацыянальным, так і еўрапейскім парламентах. Колькасць яе сяброў вырасла з двух тысяч да васьмі. Галоўнымі джокерамі стаў сам вельмі харызматычны Жан-Люк (якому, дарэчы, падабаецца Лукашэнка), плюс незвычайная тактыка партыйнага будаўніцтва. PG гуляе на ўнутраных канфліктах у левых партыях, запрашаючы ў свае шэрагі нейкія апазіцыйныя фракцыі. Так, напрыклад, ім удалося звесці ад Зялёных групу ў 400 сяброў. Аднак галоўны куш наперадзе. Як пакрэсліў Меланшон, на партыйных сходах ён, як і раней, марыць паўтарыць тое, што зрабіў у Германіі Оскар Лафантэн — раскалоць сацыял-дэмакратаў і стварыць на базе раскольнікаў і партыі камуністаў новую левую партыю. Таму ўсе чакаюць ад Меланшона якіх-небудзь ініцыятыў на адрас камуністаў, з якімі яны і так фармуюць кааліцыю, — Фронт левых. Палітолагі сапраўды не выключаюць, што Меланшон здолее інкарпараваць камуністаў у свой праект, паколькі апошнія перажываюць крызіс кіраўніцтва, а такога харызматычнага лідэра, як Жак-Люк, у Францыі яшчэ трэба пашукаць.

МАСТАК

# БАРЫС ЗАБОРАЎ: ЖЫЦЦЁВЫ ТРАНЗІТ

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Да 10 снежня ў Нацыянальным мастацкім музеі доўжыцца выстава парыжскай славутасці — Барыса Заборава. Выдатны, распрацаваны і выдадзены ў Вероне каталог твораў майстра, пры ўсіх станоўчых якасцях, скажае аўтарскую палітру, робіць яе больш спрошчанай у колеры. Таму лепш наведаць экспазіцыю.**

## Экспазіцыя

Пралог да экспазіцыі — мадэль помніка «Кнізе і пісьменнасці», які ўсталяваны ў 2007 годзе на тэрыторыі Політэхнічнага інстытута ў Хайфе. Помнік з бронзы, вышынёй 4 метры і вагой 4 тоны. На старажытны фаліянт караскаюцца лічбы і літары розных моваў свету. Ідэя пра фундаментальную ролю пісьменнасці як сродку мыслення і носьбіта памяці ў развіцці цывілізацый відавочная.

«У нашым тэхнагенным і медыйным грамадстве, якое імкнецца да ўніфікацыі і размываннi характэрных рысаў твару, пагроза нацыянальным прыкметам кожнай з асобных культураў — праблема рэальная… Непарыўны ланцуг культуры — адзінае, што апраўдвае зямное існаванне чалавека», — дапамагае нам зразумець сябе сам Барыс Забораў.

Пазнавальны аўтарскі стыль лесіровачна-пяшчотнага, прывідна-рэалістычнага жывапісу, жывапісу тонаў, паўтонаў і нюансаў, пабудаваны па большасці на грунце «земляных» фарбаў, вабіць і гіпнатызуе. У той жа час нараджае пачуццё насцярожанасці і безабароннасці. Выразная, фізічна адчувальная канцэпцыя чалавечай самоты ў свеце (незалежна ад нацыянальных, геаграфічных, сацыяльных, гендэрна-ўзроставых пазнакаў) надае выставе партрэтаў і кампазіцыяў моцны эмацыйны зарад, цэльнасць і глыбіню.

Рассеянае асвятленне, аптымальная прастора паміж творамі дапамагаюць унікнуць у сэнс карцін. Дабротная і прыгожая, трохі іншасветная, па-філасофску задуменная выстава інтэлектуальнага мастака Барыс Заборава наўрад ці каго пакіне абыякавым.

## Мроі

Непераказальны Парыж заўжды вабіў мастакоў. Яшчэ ў міжваенныя часы, не з савецкай, а з заходняй часткі Беларусі, наведваліся туды творцы з Віленскага ўніверсітэта П. Сергіевіч і прыяцель яго, дойлід Р. Яўхімовіч, і мастак-універсал Я. Горыд, К. Чурыла. Збіраўся туды і Міхась Сеўрук. Немажлівасць трапіць у Парыж (па легендзе) прывяла да самагубства мастака Льва Дабржанскага. Туды папросту ўцяклі ўраджэнцы Беларусі, што сталі пазней прадстаўнікамі «Парыжскай школы», Х. Суцін, П. Крэмень, М. Кікоін, А. Мешчанінаў, М. Шагал.





У Парыжы прыходзіла да іх не толькі слава. Да прызнання ім трэба было пераадолець багну неўладкаванасці, бытаўшчыны. Ці захлынуцца і патануць. Нявечыліся асабістыя і прафесійныя лёсы ад сутыкнення мараў з новай, у тым ліку мастацкай рэчаіснасцю, людзей, здавалася, ужо і не такіх слабых.

На шчасце, гэта не пра Заборава — зараз мастака цалкам паспяхова і запатрабаванага, які здолеў вырвацца з «лагеру сацыялізму» яшчэ ў 1981 годзе. І скарыць Парыж.

## Жыццёвы транзіт. Мінск

Нарадзіўся Барыс у Мінску 16 кастрычніка 1935 года. Яго бацька, Абрам Барысавіч Забораў, быў знаным у БССР мастаком-сацрэалістам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Пасля ад'езду сына ў Ізраіль у 1977 годзе быў выкраслены з гісторыі беларускага мастацтва.

З маленства Барыс ахінуўся ў атмасферу бацькавай майстэрні і ўсмактаў казытліва-хвалюючыя пахі фарбаў і льнянога палатна. Пахі, якія ўсё жыццё непазбежна выклікаюць з прадоння памяці перажытае. Дзяцінства, абпаленае вайной, сталася для яго тым часам, які адбіўся «як стан турботы, чакання небяспекі і ліхаманкавай дзейнасці». Гэты прысмак дзяцінства стаў «трывалым адчуваннем жыцця» будучага мастака.

Напаўразбураны Мінск, куды вярнулася сям'я, у вечаровых прыцемках «становіўся яшчэ больш трывожным і загадковым, мроіліся дагістарычныя краявіды, абрысы развалінаў на тле вечаровага неба набывалі рысунак фантастычных жывёлінаў», вярэдзілі дзіцячую душу, абуджалі пранізлівае пачуццё самоты. Але горад ажываў: поўніўся ўцекачамі, палоннымі будаўнікамі з незразумелай мовай, салдатамі перамогі.

Пасля васьмі класаў сярэдняй школы, у 1950 годзе, Барыс быў прыняты на другі курс Мінскай мастацкай вучэльні, дзе і запаў душой на Парыж, калі выкладчыца гісторыі мастацтваў, як знак вышэйшага даверу, рызыкуючы, паказвала «невідушчыя» рэпрадукцыі карцін Ван-Гога, Пісаро, Сезана.

## Ленінград — Масква

Бесклапотны і, здавалася, бясконцы час юнацтва, час навучання ў Ленінградскай акадэміі мастацтваў супаў з пачаткам кароткай хрушчоўскай адлігі. Студэнцкае вуха Барыса Заборава чуйна лавіла рэха бурлівага жыцця за «жалезнай заслонай». У 1960-я гады адбылося якаснае самавызначэнне асобы, «акаляючы свет стаў больш пластычным, воля (асобы) стала якасцю характару, а не словам». Воля, памножаная на затоеную самоту, спрыяла фармаванню характару — разважліва-аналітычнага, з філасофскім складам.

Падчас крымскіх вакацыяў на мастака абрынулася каханне. Менавіта абрынулася. Не вагаючыся, паехаў следам за сваёй «з першага погляду» абранніцай. Ірына, будучая літаратарка, дачка рэпрэсаванага паэта Барыса Карнілава, вучылася на біёлага ў Маскве. Таму і пакінуў Барыс Мінск. Увосень таго ж года стаў студэнтам Маскоўскага мастацкага інстытута імя Сурыкава, які закончыў у 1961 годзе.

**Жывапіс Барыса Заборава, мастака шматграннага, шчыльна звязаны з пластыкай кіно, інтэлектуальна-тэатральны па сутнасці**

Расія стала для яго другой Радзімай: там вучыўся, шукаў сябе. Масква ж ужо ў 1990-я гады першай ацаніла і прызнала яго мастацкія знаходкі, яго талент. У перабудовачныя часы ён быў улучаны ў склад выставы «Рускі транзіт. Усход — Захад» спачатку як «рускі мастак-эмігрант», а пазней як проста рускі мастак. Сам жа Барыс Забораў вызначае сябе як мастака еўрапейскага — «у сэнсе не афрыканскага і не арабскага». «Габрэй па крыві, — піша ён пра сябе, — на ўсе 100 адсоткаў… Нарадзіўся і вырас у хрысціянскай культуры, беларуска-рускім краявідзе».

## Мінск

З дыпломам мастака тэатра Забораў вярнуўся ў 1961 годзе ў Мінск. Увайшоў у атмасферу беларускага мастацтва. Працай сцвердзіўшыся як адмыслоўца, ён меў нейкі прыродны талент абыходзіць ідэалагічна небяспечныя «грамадска актуальныя тэмы». Неўзабаве стаў адным з самых запатрабаваных кніжных графікаў.

Свабода Заборава спраўдзілася ў графічных роздумах над творамі Шэкспіра, Дастаеўскага, Пушкіна, Уальда, Андэрсэна-Нэксё. Ілюструючы Купалу і Коласа, праз нацыянальнае ўзлятаў да наднацыянальных вышынь. Паважліва ставіўся і да сучаснікаў, асабліва ж сімпатызаваў блізкаму сябру — Рыгору Барадуліну.

За мінскім часам ім было аздоблена (ад вокладкі да апошняй ілюстрацыі) больш як 200 кніжак. Многія з іх былі ўганараваныя на Міжнародных кірмашах у Лейпцыгу ў 1965, 1971, 1977 гадах, на розных міжнародных конкурсах кнігі.

Творчая стабільнасць і поўны, па савецкіх мерках, дабрабыт: уласны дах над галавой, майстэрня, вучыцца музыцы сын Кірыл, гадуецца дачушка, майстар можа выбіраць замову па гусце. Жыццёвы тонус яго бадзёрыцца «прыяцельскімі» даносамі асобных калегаў у спецслужбы. На дзіва — без рэакцыі. Мог бы стаць і «заслужаным», і «народным». Але, як у старой показцы: «Жыць лёгка, толькі дыхаць цяжка».

Жывапіс прыносіў задавальненне душы, але не «карміў». Карміла кніжная графіка, але ўсё далей адварочвала ад сябе. Спробы раздвоіцца былі дарэмнымі.

## Ад'езд

Шэсць разоў падаваў ён заявы з просьбай аб дазволе на творчую камандзіроўку і нязменна атрымліваў «адлуп». Тады папрасіўся на ПМЖ у Ізраіль. На двары тлела не першая ўжо «антысіянісцкая» кампанія. Перад ад'ездам мастак сустрэўся з тагачасным сакратаром Мінскага гаркама кампартыі (потым загадчыкам аддзела культуры ЦК КПБ) Іванам Антановічам. Саноўнік, узгадвае Барыс Забораў, «пераконваў, што калі я застануся, дык мне дадуць магчымасць спакойна працаваць… прапаноўваў публічна звярнуцца да габрэяў Беларусі з заклікам не з'язджаць».

У маі 1981 года на пероне Паўночнага вакзала ў Парыжы Забораў, відаць, адчуў сябе як ніколі самотным. Каб быць мастаком, аднаго тэхнічнага ўмельства замала. «Мастак пачынаецца з ідэі», — лічыць Забораў. Невыказна шчымлівае пачуццё, што таілася ў калодзежы душы, аформілася ў ідэю ў Францыі.

Францыю мастак лічыць трэцяй Радзімай.

У 45 гадоў яму ўсё трэба было пачынаць спачатку. Пра гэта і яшчэ шмат пра што ахвочыя маюць магчымасць даведацца з аўтабіяграфічнай эсэістыкі Барыса Заборава «Ланцуг выпадковасцяў, альбо Лёс».

## Вяртанне ў экспазіцыю

Калекцыя жывапісу, «Парыжскага перыяду» адмыслова адабраная для Мінска, складаецца з 38 палотнаў, але заўважыць у большасці твораў якія-небудзь спецыфічныя парыжскія прыкметы немажліва. Творы невыпадкова нагадваюць недапраяўлены фотанегатыў, альбо дагератып увогуле.

Блізка 1980 года Барыс Забораў напісаў сваю першую карціну на матэрыяле старой сямейнай фатакарткі, зробленай у адным з мястэчковых атэлье ў БССР. Гэта карціна не грэе, але падобна віру зацягвае.

Канцэпцыя Чалавека Самотнага пануе ў экспазіцыі. Яна, на мой погляд, не абумоўлена, як лічаць некаторыя беларускія аглядальнікі, тугой па Радзіме. Чалавек, па Забораву, самотны ў прынцыпе. «Калі ўглядаешся ў вочы незнаёмых табе людзей на старых фотакартках, жыццё якіх адмежавана ад нас адлеглаcцю часу, які яшчэ не спрэсаваны так моцна, каб згубіць сваю празрыстасць, і тоіцца яшчэ мажлівасць іх разгледзець, але ўжо не зусім ўяўна: яны нібыта выплываюць насустрач да нас са сваёй адзіноты альбо наадварот — раствараюцца ў ёй.

Татальная самота чалавека, «размытасць» прасторы, яе намаганні паглынуць чалавека (растварыць у сабе) чуецца літаральна ва ўсіх творах Барыса Заборава. Ад супольнай статычнай кампазіцыі «Сямейны партрэт» (1995 г.) — у першай зале, да такой жа статычнай кампазіцыі «Сям'я» (2003 г.).

Жывапіс Барыса Заборава, мастака шматграннага, шчыльна звязаны з пластыкай кіно, інтэлектуальна-тэатральны па сутнасці. Не толькі таму, што ён шмат працуе ў сцэнаграфіі, стварае касцюмы і антураж да спектакляў французскага тэатра «Камедзі Франсэз» (1992, 1994), маскоўскага «Et cetera» (2007). Не таму, што для ўспрымання «Дзяўчынкі з шарам» , «Інфанты» і іншых патрэбна глядацкая далучанасць да мастацкіх кодаў еўрапейскай культуры. Але і таму, што тэатральны мастак па адукацыі, Забораў, наўпрост, у адрозненне ад тэатру, «агаляе» сваіх герояў да выяўлення трансцэндэнтнай сутнасці. Больш, чым «У лазні».

Апрача партрэтаў з «безыменнымі персанажамі» і літаратурна «бессюжэтных» карцін прадстаўленыя ў экспазіцыі краявіды «Парыжскага перыяду». Але яны не маюць нічога агульнага з ахайна-дагледжанымі французскімі ландшафтамі. «Хата», «Пуня», «Гумно», «Хлеў», «Хлеў з двуколкай» і інш. — вобразы не штучныя, надумана сканструяваныя ці скапіяваныя (дакументальна-натурныя), гэта вобразы Радзімы, якія запалі ў душу.

«Думаю, што маё мастацтва ўсё афарбаванае жыццём на гэтай зямлі. Не наўпрост, не ў сюжэтным сэнсе… У сэнсе маёй свядомасці, майго выхавання, лінія, якая працягваецца ў маёй крыві. Усё звязана з Беларуссю. Фатальны для майго мастацтва матыў — беларуская хата, якую пішу па некалькі разоў на год, фундаментальны сюжэт, які сілкуе мяне. Я адчуваю, што калі працую над ім, быццам бы вяртаюся сюды», — казаў Барыс Забораў яшчэ ў 1997 годзе.

ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ

# КУРАПАТЫ. УРОЧЫШЧА ПАКУТ

Таццяна УЛАСЕНКА

**Кожны месяц на 29-ы дзень ва ўрочышчы Курапаты адбываюцца акцыі па ўшанаванні памяці ахвяраў, забойствы якіх у 1937–1941 гадах ажыццяўлялі карнікі НКУС. Ускладанне кветак, запальванне знічак, малітва і выступы грамадскіх дзеячаў пад бел-чырвона-белым сцягам звычайна праходзяць пад пільным наглядам супрацоўнікаў міліцыі.**

У 1988 годзе ў гэтым лясным масіве на ўскрайку Мінска ўпершыню былі знойдзены косткі і парэшткі людзей. Далейшыя раскопкі, арганізаваныя Зянонам Пазьняком, выявілі 510 магільнікаў; па самых розных ацэнках, тут можа быць закапана да 250 тысяч чалавек. У памяць па расстраляных у 1989 годзе быў усталяваны першы Крыж Пакуты. Вымушаная напачатку прызнаць Курапаты, улады ў хуткім часе спрабавалі сцерці гэтую трагічную старонку з памяці.

Так, у 2001 годзе было прынята рашэнне пашырыць кальцавую дарогу літаральна на костках тысяч расстраляных. Дзякуючы беларускаму грамадству і асобным актывістам, якія ўсталявалі намёты і неслі вахту, кідаліся пад бульдозеры, Курапаты атрымалася адстаяць. Падчас абароны ўрочышча беларускае грамадства ўскалыхнулася. Даведаўшыся пра жахлівыя старонкі савецкай гісторыі, людзі талакой пачалі ўсталёўваць крыжы ахвярам сталінізму. Сёння колькасць крыжоў у Курапатах набліжаецца да тысячы.

На жаль, і ў сталінскіх катаў знайшліся свае нашчадкі, якія час ад часу ўчыняюць у Курапатах акты вандалізму.

Грамадскі актывіст Алесь Макаў наведвае беларускі некропаль, каб ускласці кветкі і ўпэўніцца ў тым, што памяць па бязвінна забітых не будзе зноў апаганена вандаламі. Падчас патрулявання Курапатаў яму разам з сябрам упершыню ўдалося затрымаць вандалаў, што ламалі крыжы.

— У 1993 годзе ўрочышча Курапаты было занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь як месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій 1930–1940 гадоў, — кажа Алесь Макаў. — Гэта помнік міжнароднага значэння, які па законе павінен ахоўвацца і аднаўляцца дзяржаўнымі органамі. Гэта, паўтаруся, па законе. Але да гэтага часу не арганізавана элементарная ахова ці патруляванне Курапатаў. Ігнаруецца Пастанова Саўміна БССР аб мемарыялізацыі ўрочышча, на афіцыйным узроўні ўтойваецца сапраўдная інфармацыя пра трагічныя падзеі найноўшай гісторыі Беларусі. Думаю, менавіта гэтыя акалічнасці спараджаюць абыякавыя і негатыўныя адносіны пэўнай, маргінальнай, часткі грамадства да народнага мемарыялу. Крыжы выкарчоўваюць, руйнуюць, паляць. Аднойчы я стрымаў юнака гадоў васямнаццаці, што прыйшоў сюды папрактыкавацца ў страляніне па крыжах з пнеўматычнага пісталета. З'яўляліся тут і неанацысты. Напрыклад, у снежні 2005 года рукатворны абраз Маці Божай Курапацкай, што побач з Крыжам Пакуты, быў зняважаны адпаведнай сімволікай — выявай свастыкі ды лічбамі «14», «88» (14 сімвалізуе колькасць словаў у нацысцкім лозунгу, 88 — зашыфраванае прывітанне «Heil Hitler!»). Але самае страшнае з усіх магчымых формаў злачынства, якое тут перыядычна здзяйсняецца і якое мяне больш за ўсё хвалюе, гэта раскопкі магілак і апаганьванне парэштках расстраляных. Стрымаць гэты вар'яцкі працэс вельмі цяжка. Бо сучасная судовая сістэма расцэньвае вандалізм у Курапатах як выключна палітычную справу і становіцца на бок вандалаў.



А. Макаў паказвае месца, дзе былі зламаны крыжы



## Даведка

За 2008 год у Курапатах было зламана больш за 40 крыжоў. У перыяд з 2008 па 2010 гады 11 крыжоў было спалена. Лава з надпісам «Ад народу ЗША народу Беларусі дзеля памяці», усталяваная ў 1994 годзе падчас візіту ў Беларусь прэзідэнта ЗША Біла Клінтана, была пашкоджана каля 15 разоў. Першы крыж Курапатаў, Крыж Пакуты, ламалі 3 разы. 9 кастрычніка гэтага года невядомымі вандаламі было павалена яшчэ 30 крыжоў. Сакратар Управы партыі КХП–БНФ Алесь Чахольскі лічыць здзейсненае злачынства актам дзяржаўнага вандалізму, выканаиым невядомымі па загаду «зверху». Актывістамі партыі большасць крыжоў было адноўлена. Але 6 лістапада 37 крыжоў зноў былі знішчаныя.

Макаў упэўнены, што ўсе акты вандалізму ў Курапатах — гэта палітычны заказ:

— Няцяжка здагадацца, хто за ўсім гэтым стаіць. Для нашчадкаў і катаў з НКУС адкрыццё праўды па злачынствах сваіх папярэднікаў небяспечна. Таму міліцыя, пракуратура ды іншыя «праваахоўныя» органы ставяцца пасіўна да злачынстваў у Курапатах.

Пацвярджэннем слоў грамадскага актывіста можа стаць вядомая гісторыя 2008 года, калі ён разам з напарнікам пры патруляванні ўрочышча напярэдадні Дзядоў затрымаў двух вандалаў. Некалькі крыжоў вандалы ўжо паспелі зламаць.

— Мы выклікалі міліцыю. Спачатку юнакі, відаць, прынялі нас за міліцэйскі патруль. Але калі высветлілася, што мы грамадскія актывісты і да праваахоўных органаў не маем ніякага дачынення, адзін з вандалаў выклікаў па тэлефоне свайго бацьку, паспрабаваўшы пры гэтым нас запалохаць, маўляў, «сейчас придёт мой отец, покажет свою «большую корочку» (пасведчанне асобы) и освободит нас, а вам тут мало не покажется». Дарэчы, дзе ў гэты момант знаходзіцца сын і чым займаецца, бацька, хутчэй за ўсё, ведаў — гэта было зразумела з тэлефоннай размовы: «Папа, я здесь, возле перехода».

Як потым высветлілася, непаўналетняга вандала завуць Вадзім Дзмітрыевіч Шышко, а яго бацька працуе вайсковым перакладчыкам. Імя другога злачынцы — Павал Андрэевіч Астрэйка, ураджэнец РФ, таксама непаўналетні.

— Ад пачатку і да канца суд абараняў вандалаў, — кажа Макаў. — На працэсе адвакат аднаго з хлапцоў апелявала да суддзі, што гэта выключна палітычная справа. Такія аргументы сёння з'яўляюцца дзейснымі для апраўдання любых злачынстваў супраць беларускай нацы. Судовы працэс быў хутка завершаны з-за недахопу доказаў.

У гэтай справе прадстаўнікам пракуратуры не сорамна было распісацца ў асабістым бяссіллі. Але беларуская грамадскасць патрабавала ўзнавіць крымінальную справу, правесці расследаванне больш дасканала. Нічога з гэтага не атрымалася. Пракуратура Мінскага раёну прад'явіла абвінавачанне В. Шышко і П. Астрэйку ў злосным хуліганстве і тут жа абвясціла пра іх амністыю, пад якую яны падпадалі з-за свайго непаўналецця.

Дарэчы, падчас следства над юнакамі, невядомымі злачынцамі былі раскапаны ў Курапатах яшчэ дзве магілы. Ці то дзеля здзеку, ці то жартаў косткі, чарапы і вопратку зlодзеі выкінулі на жвір. Вядома, вандалаў не знайшлі. А перазахаванне парэшткаў, нягледзячы на афіцыйны дазвол Міністэрства культуры, было часова прыпынена маёрамі з Бараўлянскага аддзелу міліцыі, якія інсцэніравалі мерапрыемствы па дадатковай праверцы касцей.

Самая абсурдная сітуацыя, якая паказала адваротны бок прапагандуемага ў краіне парадку, здарылася 8 жніўня 2010 года з замежнымі турыстамі, якія ў гэты дзень вырашылі наведаць беларускі помнік ахвярам сталінскіх рэпрэсій. Шокам для турыстаў з Еўропы на гэты раз стаў не маштаб трагедыі, учынены камуністамі ў 1930–40-я гады, а цынічнасць здзейсненага злачынства ў Курапатах зараз, сярод бела дня, пры сведках! На месцы Дзяржаўнага гісторыка-культурнага помніка невядомы хлопец спакойна распальваў агонь. А непадалёк разгаралася яшчэ адна купка з сухастоем і бярвеннем.

Якраз у гэтыя дні была страшэнная спёка, існавала пагроза ўзнікнення лясных пажараў. Прадстаўнікі цывілізаванага свету адразу кінуліся тушыць вогнішча і пабачылі, што ў адным з іх палыхае крыж, укінуты паверх сухастою. Сведкай гэтага здарэння стала Аліна Дуброўская, якая нярэдка бывае ў Курапатах, даглядае пасаджаныя тут кветкі. Пакуль яна выклікала міліцыю, «качагар» паспеў збегчы.



Міліцыянт «даследуе» металашукальнікам косткі забітых і адначасова здымае ўсіх прысутных на камеру. З архіву Таццяны Колышавай

▸ ВЫСТАВА

# «АРТ-КРОК»: АД КЛАСІКІ ДА НАВАЦЫЙ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**У Нацыянальнай бібліятэцы адкрылася штогадовая выстава «Арт-крок». Практычна ўсе карціны, а іх каля 160, гледачы пабачаць упершыню.**

Экспазіцыю ладзяць сумесна бібліятэка і Міжнародная гільдыя жывапісцаў. «Выстава заўсёды выяўляе тое новае, што робіцца за год беларускімі мастакамі», — зазначыў куратар праекта, старшыня гільдыі Фёдар Ястраб. І ўяўляе, на яго думку, пэўны зрэз таго, што адбываецца ў жывапіснай майстэрні Беларусі.

У выставе, якая пачалася 23 лістапада, удзельнічаюць каля 70 мастакоў. Па жанры карціны самыя разнастайныя — ад класічнага краявіду да абсалютна наватарскіх прац. Традыцыйны жывапіс прадстаўлены, напрыклад, вядомымі мастакамі Георгіем Паплаўскім, Анатолем Барановскім, Васілём Сумаравым. А маладыя аўтары дэманструюць пераважна эксперыментальны пошук.

«Гэта фармальныя кампазіцыі, — адзначыў карціны апошніх Фёдар Ястраб. — Пошук колеру, пошук выяўленчых элементаў, якія б уздзейнічалі незалежна ад таго, што там напісана. Важна выявіць саму пластычную мову карціны, каб яна гаманіла з намі так, як скрыпка. І гэта вельмі добра. Таму што мы хочам паказаць усю жывапісную палітру Беларусі. І мне падаецца, што гэта нам удаецца. А ў гэтым годзе асабліва».

Творы мастакоў экспануюцца адразу ў трох галерэях бібліятэкі — «Лабірынт», «Атрыум» і «Ракурс». «Практычна ўсе яны паказваюцца ўпершыню. Можа быць, адзінкі, якія дзесьці яшчэ выстаўляліся. Звычайна для гэтай выставы мы робім новыя творы», — паведаміў мастак.

«Арт-крок», паводле яго словаў, стаў брэндавай выставай Міжнароднай гільдыі жывапісцаў. І з'яўляецца своеасаблівым аглядам працы мастакоў за гадавы перыяд. «Тут мы можам выявіць увесь спектр беларускага мастацтва, яго зрухі і навацыі. І адсочваць пэўныя тэндэнцыі ў жывапісным мастацтве», — падкрэсліў Фёдар Ястраб.

Выстава будзе праходзіць да 15 студзеня 2011 года.







▸ ВІЗІТ

# НЕКАРАНАВАНЫЯ КАРАЛІ ВЯРТАЮЦЦА Ў БЕЛАРУСЬ

Аляксей ХАДЫКА

**З 19 па 21 лістапада ў Беларусі знаходзіліся князі Свяшчэннай Рымскай Імперыі браты Мацей і Канстанцін Мікалай Радзівілы. Візіт можна было б аднесці да раздзелу свецкай хронікі, калі б падчас яго не адбываліся даволі значныя падзеі.**



Фота Надзеі Дзяйкун і Аляксея Хадыкі

У першы дзень князі прысутнічалі ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на прэзентацыі вялікай кнігі — другога перавыдання «Icones Familiae Ducalis Radivilianae...» са 165 гравіраванымі Гіршам Ляйбовічам выявамі прадстаўнікоў сям'і ад 1346 года да сярэдзіны XVIII стагоддзя. Першае выданне выйшла ў 1748 годзе ў Нясвіжы. Фаліянт, прадстаўлены публіцы ў бібліятэцы, падрыхтавала Беларуская Энцыклапедыя і індывідуальна мастацтвазнаўца Вольга Бажэнава. Урачыстая падзея завяршылася сяброўскім фуршэтам.

На наступны дзень князі накіраваліся ў сваю сталіцу, цэнтр ардынацыі Нясвіж, каб агледзець у чарговы раз вынікі рэстаўрацыі замка і правесці консультацыі па працэсе аднаўлення яго інтэр'ераў з намеснікам дырэктара музея-запаведніка Галінай Кандрацьевай.

Князі ўзялі ўдзел у ідэнтыфікацыі гістарычных фамільных фотаздымкаў. Таксама прадстаўнікам музея была зроблена прапанова: наведаць Радзівілаў у Польшчы, каб па магчымасці адабраць некаторыя экспанаты з сямейных збораў дзеля перадачы на часовы дэпазіт у замкавую экспазіцыю.

Гэты працэс мог бы быць і значна больш плённым, калі б урад Беларусі вярнуў Радзівілам у прыватную ўласнасць хоць бы частку былой магнацкай рэзідэнцыі. Аднак гэта пытанне пакуль толькі разглядаецца. У цэлым гаспадары-госці засталіся задаволеныя ўбачаным: значна больш строгія ацэнкі рэстаўрацыі дае 93-гадовая княгіня Альжбета, але яе прыезд запланаваны на цёплы час, вясной 2011 года.

Зразумела, што Радзівілы маюць для Беларусі вялікае значэнне як сімвал гісторыі краіны, яе багатай інтэлектуальнай і культурнай спадчыны. Таму ўспрымаць сям'ю трэба найперш у плане рэпрэзентатыўна-знакавым, а не палітычным. Пра гэта князі не аднойчы казалі ў сваіх выступленнях. Аднак у нядзелю яны пагадзіліся сустрэцца з адным з кандыдатаў на пасаду прэзідэнта Беларусі Андрэем Саннікавым.

Сустрэча адбылася ў гатэлі «Еўропа». Князёў можна зразумець: хто валодае інфармацыяй, той валодае сітуацыяй. Гутарка ішла зноў-такі пра аднаўленне Нясвіжа і перспектывы выкарыстання замка-музея, а таксама пра інвестыцыі, якія сям'я гатовая зрабіць у эканоміку нашай краіны. Князь Мацей, нефармальны лідэр новага пакалення сям'і, займаецца развіццём інфраструктуры чыгуначных шляхоў зносін на землях былой Рэчы Паспалітай. Яго можна назваць паслядоўнікам Чэслава Мілаша з ідэяй апошняга пра культурнае адзінства народаў Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны. Пашана да культуры пераходзіць у цалкам эканамічную сферу. Так, будаўніцтва чыгуначных шляхоў з Польшчы на Вільню ўжо абмеркаванае.

А цяпер уявіце, што падобны шлях, еўрапейская калейка, пацягнецца да Мінска ад Брэста. Ці не праўда, з пазбаўленнем неабходнасці мяняць колы пад цягнікамі зносіны сталіцы Беларусі з Еўропай зробяцца больш камфортнымі? І выгадна, і прыемна.

На гэтым рэпартаж можна было б скончыць, але дадзім невялікую даведку пра аднаго з братоў, Мацея.

Мацей Радзівіл (нарадзіўся ў 1961 годзе ў Варшаве), філосаф і фінансіст, прадстаўнік княжацкага роду Радзівілаў гербу «Трубы», малодшай клецкай лініі, адгалінавання князёў у Шыдлаўцы і Паланечцы. У адзінаццатым калене — нашчадак будаўніка Нясвіжскага замку віленскага ваяводы і вялікага літоўскага маршалка Мікалая Крыштафа Радзівіла званага «Сіроткам». Жонка — Ганна Радзівіл з нямецкай лініі сям'і, мае пяцёра дзяцей.

Адукацыю атрымаў ва ўніверсітэтах Варшавы і ЗША. З'яўляецца выканаўчым дырэктарам Trakcja Polska S.A. (Варшава), фірмы, што займаецца мадэрнізацыяй Польскай чыгункі. За шмат гадоў здолеў набыць на аўкцыёнах па ўсім свеце шэраг рэчаў, якія ў розны час належалі Радзівілам. Падараваў Нясвіжу гравюры з асабістай калекцыі, а ў кастрычніку 2009 года перадаў сем лічбавых копіяў карцін на палатне. Сёння Мацей Радзівіл — фактычны галава роду, які аб'ядноўвае ўсю сям'ю. Сваякам імкнецца нагадаць: кожны Радзівіл мусіць пабываць у Нясвіжы. Сваіх дзяцей выхоўвае ў духу французскай прымаўкі: «Noblesse oblige» (шляхецтва абавязвае).

▸ РЭЦЭНЗІЯ

# ЧАС ВОЛАН ДЭ МОРТА

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Сёмая карціна пра Гары Потэра «Гары Потэр і Дарункі смерці, частка I» — ахайная экранізацыя фантазійнай кнігі. Стужка цікавая для аматараў кнігі, хаця і крыху пластыкавая.**

Для экранізацыі апошняй часткі эпапеі пра Гары Потэра «Warner Brothers» запрасіла Дэвіда Етса. Етс не хапае зорак з неба — і на папярэдніх серыях зарэкамендаваў сябе як адказны рамеснік.

Атмасфера карціны змрочная, як і мае быць паводле кнігі. Міністэрства магіі — дзякуючы Етсу і Роўлінг — паказана таталітарна-фашыстоўскай установай. Помнік «Магія ўсёмагутная», ахоўнікі ў шэрых мундзірах, прапаганда чысціні крыві — і ідэалагічныя апрацоўкі чараўнікоў.

Прырода сцялася ад страху і холаду: выпалена-сінія пейзажы, шэры туман, самота дзяцей-змагароў, якія ўжо пасталелі. Затое казку пра Дарункі смерці Етс зрабіў палымяна-чырвонай і лялечнай.



Гледачы, якія не чыталі кнігу, будуць у разгубленасці. Але стужка разлічаная на тых, хто вырастаў і сталеў разам з Потэрам. Першая карціна амаль дзесяцігадовай даўніны была пачаткам, цяпер набліжаецца завяршэнне.

Носяцца па небу злыя чараўнікі, змяя прыкідваецца бабулькай, паветраны матацыкл імчыцца па аўтастрадзе, гінуць эльфы і совы. І хаця трохгадзінны фільм не прымусіць занадта нудзіцца заўзятараў Потэра, у сэрцы карціны — стоены змрок.

Запрашаем у тэрарыстычны час Волан дэ Морта! Нядоўга яму засталося — толькі апошняя серыя.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1201

Падпісана да друку 26.11.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.